E E E

Акадэмічны дэпартамент гісторыі

Праграма бакалаўра гісторыі «Беларусістыка»
Спецыялізацыя «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалогія»

**АНДРЭЙ АСАДЧЫ**
Студэнт IV курса

# АРХІЎНА-СЛЕДЧАЯ СПРАВА К. ДУЖ-ДУШЭЎСКАГА (1940 – 1952 ГГ.) У АСОБЫМ АРХІВЕ ЛІТВЫ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

БАКАЛАЎРСКАЯ ПРАЦА

pawet.net

Кіраўнік працы: доктар гістарычных навук,
прафесар E Аляксандр Фёдаравіч Смалянчук

Вільня, 2010

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................................................................................5

1. ФЕНОМЕН ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦЫ ..........................................................................7
1.1. Гістарычная крыніца: тэарэтычны аспект.........................................................................7
1.2. Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага: структура, матэрыялы ...........................11
1.2.1. Матэрыялы следства 1940 г................................................................................................12
1.2.2. Матэрыялы следства 1946 – 1947 гг. ..................................................................................12
1.2.3. Матэрыялы следства 1952 г................................................................................................15

2. БІЯГРАФІЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЕЯЧА ...........................................................................20
2.1. Дзяцінства. Сям'я ..............................................................................................................20
2.2. У Пецярбурзе .......................................................................................................................23
2.3. Барацьба за незалежнасць...................................................................................................27
2.4. Ковенскі перыяд ..................................................................................................................35
2.5. Апошнія гады жыцця .........................................................................................................39

3. БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У ЛІТВЕ (1921 – 1939 ГГ.) ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ АРХІЎНА-СЛЕДЧАЙ СПРАВЫ...........................................................45
3.1. Урад БНР Вацлава Ластоўскага .........................................................................................45
3.2. Беларускія арганізацыі ў Літве 1923 – 1939 гг. ..................................................................50
3.2.1. Беларускі Цэнтр у Літве і Літоўска-Беларускае Таварыства ..........................................50
3.2.2. Беларускае Культурна-Прасветнае Таварыства і Беларускае Нацыянальнае Аб'яднанне........................................................................................................................................57

ЗАКЛЮЧЭННЕ ..................................................................................................................62

СПІС КРЫНІЦ І ЛІТАРАТУРЫ .........................................................................................63

ДАДАТКІ
Дадатак 1. Аўтабіяграфія К. Дуж-Душэўскага ....................................................................73
Дадатак 2. Грамадская і палітычная дзейнасць К. Дуж-Душэўскага .................................75
Дадатак 3. Абвінаваўчае заключэнне (па следчай справе №19097). 12.04.1952 г. ..............80
Дадатак 4. Фота К. Дуж-Душэўскага і К. Езавітава. г. Рыга. 25.12.1919 г. ..........................85
Дадатак 5. Беларускія адрасы ў Коўна ...................................................................................86

The investigative case of K. Dush-Dusheuski (1940 - 1952) in the Special Lithuanian Archive as a historical source (summary) .........................................................................................87

**Асадчы, Андрэй**

Ас 90 Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага (1940 – 1952 гг.) у Асобым архіве Літвы як гістарычная крыніца: бакалаўрская праца / Андрэй Асадчы; навуковы кіраўнік доктар гістарычных навук, прафесар Е Аляксандр Смалянчук; універсітэт. Акадэмічны дэпартамент гісторыі. – Вільня, 2010. – 87 с. Бібліяґрафія: с. 63 – 72 (117 наз.).

УДК: 947.45(=161.3)„1940/52“

***Ключавыя словы:*** *Архіўна-следчая справа, гістарычная крыніца, К. Дуж-Душэўскі, беларускі нацыянальны рух, урад БНР Вацлава Ластоўскага, Беларускі Цэнтр у Літве, Беларускае Культурна-Прасветнае Таварыства, Літоўска-Беларускае Таварыства, Беларускае нацыянальнае аб'яднанне.*

*Аб'ект бакалаўрскай працы* – гісторыя беларускага нацыянальнага руху. *Мэта працы* – ацэнка матэрыялаў архіўна-следчай справы К. Дуж-Душэўскага як крыніцы па гісторыі беларускага нацыянальнага руху першай паловы ХХ ст. Асноўныя *задачы працы:* ахарактарызаваць феномен гістарычнай крыніцы, паказаўшы спецыфіку архіўна-следчых спраў; выявіць мажлівасці архіўна-следчай справы як крыніцы для вывучэння жыцця і дзейнасці К. Дуж-Душэўскага, а таксама па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваенны час.

З дапамогай *метадаў* аналізу, параўнання, крытычнага метаду, а таксама метадалагічнага падыходу Марка Блока была зроблена *выснова,* што архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі беларускага нацыянальнага руху першай паловы ХХ ст. Агляд і аналіз біяграфічнай інфармацыі Клаўдзія Дуж-Душэўскага дазволіў паказаць, што матэрыялы архіўна-следчай справы ўтрымоўваюць шмат інфармацыі пра яго жыццё і дзейнасць. Матэрыялы справы дазваляюць пазнаёміцца з новымі, невядомымі дагэтуль фактамі яго біяграфіі. Трэба адзначыць інфармацыю пра сустрэчы Дуж-Душэўскага ў складзе дэлегацый з міністрам нямецкага ўрада М. Эрсбергам, главой місіі ЗША ў Польшчы Маргентаў, Ю. Пілсудскім і Літвінавым. Новымі з'яўляюцца факты спрыяння Дуж-Душэўскім пераводу атрада Булак-Булаховіча на службу БНР і іншае. Не менш каштоўную інфармацыю ўтрымоўваюць паказанні К. Дуж-Душэўскага наконт дзейнасці Рады БНР і беларускіх арганізацый у Літве ў міжваенны перыяд. Усведамляючы ўсю спецыфіку архіўна-следчай справы К.

Дуж-Душэўскага як гістарычнай крыніцы, трэба прызнаць яе ўнікальнасць і каштоўнасць для вывучэння гісторыі беларускага нацыянальнага руху першай паловы XX ст.

Бакалаўрская праца *можа быць выкарыстана* пры вывучэнні гісторыі Беларусі, а таксама ў навуковых даследаваннях беларускага нацыянальнага руху. Яна можа быць *карысна* ўсім, каго цікавіць гісторыя Беларусі XX ст.

# УВОДЗІНЫ

Даследаванне беларускага нацыянальнага руху немагчыма без вывучэння жыцця і дзейнасці яго непасрэдных удзельнікаў, якія якраз і з'яўляюцца носьбітамі найбольш каштоўнай інфармацыі. Між тым значная колькасць беларускіх адраджэнцаў пачатку ХХ была рэпрасавана ў БССР у 30 - 40-я гг. Архіўна-следчыя справы, якія знаходзяцца ў архівах НКУС-НКДБ-МДБ БССР утрымоўваць шмат важнай інфармацыі пра дагэтуль невядомыя старонкі гісторыі беларускага нацыянальнага руху. Але па прычыне абмежаванага доступа да гэтых матэрыялаў, архіўна-следчыя справы толькі зрэдку фігуруюць у беларускай гістарыяграфіі. Адпаведна ўзрастае значэнне вывучэння архіўных матэрыялаў суседніх краін, асабліва гэта датычыцца Вільні, архівы якой з'яўляюцца сапраўднай скарбніцай для беларускіх гісторыкаў.

Сярод матэрыялаў віленскіх архіваў вельмі цікавымі для даследчыкаў з'яўляюцца матэрыялы Асобага архіву Літвы (былога архіву НКУС-НКДБ-ДБ ЛССР). У дадзеным архіве знаходзяцца архіўна-следчыя справы, заведзеныя НКУС-НКДБ-МДБ на жыхароў ЛССР і часткі тэрыторыі Заходняй Беларусі, сярод якіх ёсць і дзеячы беларускага нацыянальнага руху. Так, на дадзены момант беларускімі гісторыкамі А. Вашкевічам і А. Сідарэвічам даследуюцца архіўна-следчыя справы Адама Станкевіча і Антона Луцкевіча. Я паспрабую засяродзіць сваю ўвагу на вывучэнні і апісанні матэрыялаў архіўна-следчай справы Клаўдзія Сцяпанавіча Дуж-Душэўскага. Трэба адзначыць, што дагэтуль гэты выбітны дзеяч беларускага Адраджэння не атрымаў належнай увагі гісторыкаў. У беларускай гістарыяграфіі няма ніводнага грунтоўнага даследавання, прысвечанага Дуж-Душэўскаму. Вывучэнне ахіўна-следчай справы Клаўдзія Сцяпанавіча дазволіць хоць часткова зліквідаваць гэты прабел.

Такім чынам, *аб'ектам* майго даследавання з'яўляецца гісторыя беларускага нацыянальнага руху, *прадметам* вывучэння – архіўна-следчая справа К. С. Дуж-Душэўскага як гістарычная крыніца.

*Матэй* даследавання з'яўляецца ацэнка матэрыялаў архіўна-следчай справы як крыніцы па гісторыі беларускага нацыянальнага руху першай паловы ХХ ст. Для дасягнення пастаўленай мэты я планую вырашэнне наступных задач:

- ахарактарызаваць феномен гістарычнай крыніцы, звярнуўшы асаблівую ўвагу на спецыфіку архіўна-следчых спраў;
- выявіць мажлівасці архіўна-следчай справы як крыніцы па вывучэнню жыцця і дзейнасці К. Дуж-Душэўскага;

- выявіць мажлівасці архіўна-следчай справы як крыніцы па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваенны перыяд.

Такім чынам, адпаведна з пастаўленымі вышэй задачамі структура працы выглядае наступным чынам: Уводзіны, першая глава – *“Феномен гістарычнай крыніцы”*, другая – *“Біяграфія беларускага дзеяча”*, трэцяя –*“Беларускі нацыянальны рух у Літве (1921 – 1939 гг.) паводле матэрыялаў архіўна-следчай справы”*, Заключэнне, Спіс крыніц і літаратуры, Дадаткі.

Для рэалізацыі пастаўленых задач у працы я выкарыстоўваю *апісальны метад*, *метад аналізу*, *параўнаўчы метад*, *крытычны метад*, а таксама метадалагічны падыход да працы з гістарычнымі крыніцамі, прапанаваны Маркам Блокам.

*Гіпотэзай* майго даследавання з’яўляецца сцвярджэнне, што матэрыялы архіўна-следчай справы К. Дуж-Душэўскага з’яўляюцца важнай крыніцай для даследавання жыцця і дзейнасці самаго дзеяча, а таксама ўтрымоўваюць цікавыя і дагэтуль невядомыя звесткі па гісторыі беларускага нацыянальнага руху міжваеннага перыяду.

# 1. ФЕНОМЕН ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦЫ

## 1.1. Гістарычная крыніца: тэарэтычны аспект

Што б не даследаваў гісторык, ён заўсёды працуе з гістарычнымі крыніцамі. Гістарычныя крыніцы даюць нам магчымасць атрымаць інфармацыю пра людзей, грамадства, розныя гістарычныя падзеі. Так, у навуковай літаратуры мы можам азнаёміцца з наступным тлумачэннем: "гістарычныя крыніца" – гэта ўсё, што непасрэдна адлюстроўвае гістарычны працэс і дае магчымасць вывучыць мінулае чалавечага грамадства, г. зн. усё, што створана раней чалавечым грамадствам і дайшло да нашых дзён у выглядзе прадметаў матэрыяльнай культуры, помнікаў пісьменнасці, ідэалогіі, нораваў, звычаяў, мовы і іншае[1]. Як бачна з дадзенай фармуліроўкі, гістарычнай крыніцай мы можам лічыць любы аб'ект, які нясе ў сябе інфармацыю пра чалавечую дзейнасць.

Вялікая колькасць гістарычных крыніц выклікала неабходнасць іх сістэматызацыі і класіфікацыі. Гаворачы пра сістэматызацыю гістарычных крыніц, навукоўцы маюць на ўвазе выпрацоўку ў выніку дзейнасці даследчыкаў прынцыпаў сістэматызацыі крыніц на аснове пэўных знешніх крытэраў. Так, на дадзены момант навукоўцы вылучаюць наступныя прынцыпы сістэматызацыі: храналагічны, праблемны, рэгіянальны, персанальны і этнічны[2]. Кожны з дадзеных прынцыпаў дае магчымасць даследчыкам працаваць з крыніцамі згодна з пастаўленымі мэтамі і задачамі.

Што датычыцца класіфікацыі гістарычных крыніц, то тут размова ідзе пра раскрыццё ўнутранай сувязі паміж катэгорыямі гістарычных крыніц: тыпамі, родамі і відамі. Тыпалагічная класіфікацыя крыніц мае на мэце ўлік іх функцый, а таксама характар знакавых сістэм, якія і ўтрымоўваюць пэўную інфармацыю. Дадзеная класіфікацыя не толькі сістэматэзуе гістарычныя крыніцы, але і садзейнічае іх больш глыбокаму аналізу. Складанасць і шматлікасць гістарычных крыніц стварае цяжкасць іх класіфікацыі. Так, першай класіфікацыяй крыніц было дзяленне іх на рэшткі – рэлікты гістарычнай рэчаіснасці, і падданні – адлюстраванне гэтай рэчаіснасці ў свядомасці творцы крыніцы. Зараз найбольш распаўсюджанай з'яўляецца класіфікацыя крыніц па тыпам і відам. Тып аб'ядноўвае крыніцы па спосабу кадавання інфармацыі і яе захоўванні.

---

[1] КОВАЛЬЧЕНКО, И. Д. и др. *Источниковедение истории СССР*: Учебник. Под ред. И. Д. Ковальченко. 2-е изд. М: Высшая школа, 1981. С. 8.

[2] ХОДЗІН, С. М. *Крыніцы па гісторыі Беларусі. Гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне.* Вучэбны дапаможнік. Мн.: БДУ, 1999. 193 с.

Уласныя класіфікацыі крыніц прапануюць такія даследчыкі, як А. Пранштэйн, Л. Пушкароў, І. Кавальчанка, С. Шміта, С. Ходзін. На дадзены момант больш распаўсюджанай сярод даследчыкаў з’яўляецца класіфікацыя, якая вылучае сем тыпаў крыніц: пісьмовыя, рэчыўныя, этнаграфічныя, фальклорныя (вусныя), лінгвістычныя, фотадакументы і фотакінадакументы. Сярод пісьмовых крыніц вылучаюць летапісы, заканадаўчыя акты, справаводчую дакументацыю, прыватныя акты, статычныя крыніцы, перыядычны друк, дакументы асабістага паходжання (мемуары, перапіска і г. д.) літаратурныя помнікі, публіцыстыку, палітычныя сачыненніі і навуковыя працы[3].

Больш агульны характар мае дзяленне крыніц на масавыя і ўнікальныя, першакрыніцы і другасныя. Свой класіфікацыю крыніц прапанаваў і М. Блок[4]. Так, паводле яго меркавання, гістарычныя крыніцы можна падзяліць на наўмысныя і ненаўмысныя. Наўмысныя – тыя крыніцы, якія ствараліся з разлікам на тое, што іх будуць вывучаць нашчадкі, ненаўмысныя – якія не прадназначаны для нашчадкаў. Кожныя з гэтых крыніц, як адзначаў М. Блок, маюць свае перавагі і недахопы. Па меры развіцця грамадства комплекс тыпаў і відаў крыніц пашыраецца, паступова з'яўляюцца новыя тыпы крыніц і знікаюць старыя (летапісы).

Вылучэнне вялікіх комплексаў крыніц дазваляе ўбачыць паўторнасць іх уласцівасцяў і вылучыць іх відавую агульнасць, што дае падставу выпрацоўкі агульных метадаў іх даследавання[5]. Так, нягледзячы на шматлікасць і разнастайнасць крыніц усе яны маюць агульныя ўласцівасці формы і зместу, што стварае магчымасць адзінага навуковага падыходу і распрацоўкі крыніцазнаўчых метадаў аналіза. Са станаўленнем навукі крыніцазнаўства сфармавалася і метадалогія працы з гістарычнымі крыніцамі. Так, мэтай метада крыніцазнаўства з’яўляецца: па-першае, устанаўленне інфармацыйных магчымасцяў крыніцы для атрымання фактычных звестак (паўната, даставернасць і навізна дадзеных); па-другое, аргументаваная ацэнка значэння крыніцы[6]. Дадзены метад ўключае ў сябе як крытыку паходжання дакумента, так і ўнутраную крытыку дакумента – аналіз і трактоўка тэкста. Так, важным пры аналізе гістарычнай крыніцы з’яўляецца

---

[3] СИДОРЕНКО, О. В. *Источниковедение отечественной истории*: Учебное пособие. Владивосток: ТИДОТ ДВГУ, 2005. С. 3 - 4.

[4] БЛОК, М. *Апология истории или ремесло историка*. М.: Наука, 1986.

[5] СИДОРЕНКО, О. В. Спасылка 4. С. 3 - 4.

[6] ДАНИЛЕВСКИЙ, И. Н. и др. *Источниковедение : Теория. История. Метод. Источники Российской истории*: Учебное пособие для студентов вузов. М.: РГГУ, 2004. С. 122.

вызначэнне гістарычных ўмоў узнікнення крыніцы, устаноўка аўтарства і акалічнасцяў стварэння, інтэрпрытацыя крыніцы і аналіз яе зместу[7].

Свой метадалагічны падыход для працы з гістарычнымі крыніцамі прапанаваў і М. Блок[8]. Блок прапанаваў рабіць праверку крыніц пры дапамозе іншых дакументаў, якія могуць дазволіць пацвердзіць альбо абвергнуць тую ці іншую інфармацыю. Блок лічыў, што нават пры недаставернасці крыніцы гісторык не павінен адмаўляцца ад яе, а павінен матываваць падман, бо ён таксама свайго рода сведчанне. Таксама для даследавання інфармацыі крыніц Блок прапаноўваў звярнуцца да псіхалогіі сведчання. Па яго меркаванню, улічваючы псіхалагічныя перадумовы аўтара крыніцы мы можам устанавіць даставерна інфармацыя ці не. Без разумення псіхалогіі сведчання гісторык можа паследаваць за крыніцай, не ўлічваючы абставінаў, а г. зн. зрабіць памылку. Гісторык таксама не можа інтэрпрытаваць крыніцу, не ўключаючы яе ў храналагічны шэраг. Ад падабенства альбо адрознення з іншымі крыніцамі можна зрабіць вывад аб яе даставернасці.

Як бачна з апісання класіфікацыі гістарычных крыніц у асобны від ці нават тып архіўна-следчыя справы не вылучаюцца. Магчыма, гэта звязана са спецыфікай і малай прысутнасцю дадзенай крыніцы ў гістарыяграфіі краін постасавецкай прасторы. Так, у беларускай гістарыяграфіі следчыя справы амаль не ўключаны ў шырокі навуковы абарот. Таму ацэнкі беларускіх гісторыкаў дадзеная крыніца пакуль не атрымала. Не так шмат даследаванняў па матэрыялам следчых спраў і ў Расіі. Сярод расійскіх даследчыкаў, хто займаецца вывучэннем архіўна-следчых спраў трэба адзначыць А. Літвіна, С. Быкаву, Н. Кладову, В. Карамана, і інш.

Усе даследчыкі аднагалосна адзначаюць спецыфічнасць і своеасаблівасць архіўна-следчай справы як крыніцы для даследавання. Ускладняе вывучэнне следчых спраў і абмежаванасць доступа да дадзеных крыніц. Так, паводле слоў С. Быкавай, па прычыне абмежаванага доступу да матэрыялаў НКВД-МДБ-КДБ па сённяшні дзень не існуе карэктных методык па вывучэнню архіўна-следчых спраў. Доўгі час архіўна-следчыя справы заставаліся афіцыйна не прызнанымі ў якасці крыніц і толькі ў апошнія гады былі прызнаны ў Расіі як адзін з важнейшых відаў гістарычных крыніц[9].

---

[7] ДАНИЛЕВСКИЙ, И. Н. и др. *Источниковедение : Теория. История. Метод. Источники Российской истории*: Учебное пособие для студентов вузов. М.: РГГУ, 2004. С. 127 – 140.

[8] БЛОК, М. *Апология истории или ремесло историка*. М.: Наука, 1986.

[9] БЫКОВА, С. "Наказанная память": свидетельства о прошлом в следственных материалах НКВД. У: *Неприкосновенный запас*. [інтэрактыўны]. 2009. №2 (64). [прагледжана 18 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://magazines.russ.ru/nz/2009/2/by4.html>.

Што датычыцца асаблівасці дадзенага віду крыніц, то даследчыкі адзначаюць падабенства архіўна-следчых спраў. Амаль усе яны аднолькавыя па сваім паходжанні і прызначэнні і адрозніваюцца ў асноўным толькі па аб'ёму і зместу інфармацыі. Гэтыя адрозненні абумоўлены характарам следства ў кожным канкрэтным выпадку. Так, у некаторых выпадках справы налічваюць ад двух да шасцідзесяці тамоў, у кожным з якіх утрымліваюцца разнастайныя матэрыялы. Але часам справа ўяўляе сабой адзін том, які ўключае мінімальны набор дакументаў, неабходных для фармальнага абвінавачвання (6 - 7 аркушаў)[10].

Асаблівую каштоўнасць у матэрыялах следчых спраў маюць “рэчавыя доказы", канфіскаваныя супрацоўнікамі НКУС-МДБ-КДБ падчас перартрусаў і арыштаў. Як адзначае С. Быкава, разнастайнасць дакументаў і прадметаў, якія утрымоўваюцца ў справах часам здзіўляе. Так, у матэрыялах следчых спраў могуць утрымоўвацца шматлікія дакументы, даведкі, фатаграфіі і інш. Важная інфармацыя змяшчаецца ў анкетах арыштаваных, дзе пры запаўненні сярод іншых пунктаў абавязкова ўносіліся дадзеныя аб сяброўстве ў партыях, прыналежнасці да апазіцыі, выніках кампаній па праверцы палітычнай добранадзейнасці ў розныя гады, рэпрэсаваных сваяках і г. д. Таксама вельмі важнымі матэрыяламі ў архіўна-следчых справах з’яўляюцца даведкі і характарыстыкі на арыштаваных з месца працы, копіі розных дакументаў, у тым ліку выпіскі з сходаў розных арганізацый. Дадатковыя вельмі важныя звесткі даследчык можа атрымаць пры знаёмстве з матэрыяламі судовых пасяджэнняў. Дадзеныя матэрыялы даюць магчымасць ўявіць не толькі фармальны бак працэдуры, але і логіку паказанняў, аргументацыі сведкаў, настрой і маральна-псіхалагічны стан абвінавачаных.

Асноўнай праблемай для даследчыкаў, якія працуюць з архіўна-следчымі справамі, з’яўляецца магчымасць атрымання дакладных фактаў з заяваў і паказанняў арыштаваных і сведкаў падчас допытаў і вочных ставак. Як адзначае С. Быкава, пратаколы допытаў даюць магчымасць пераканацца ў супярэчлівасці і надуманнасці абвінавачванняў. Пра тое, з якой лёгкасцю следчыя фабрыкавалі справы, сведчыць і стандартны набор абвінавачванняў, якія з дакладнасцю паўтараюцца ў кожным пратаколе. Па гэтай прычыне даследчыца раіць прытрымлівацца прынцыповай пазіцыі: не выкарыстоўваць звестак, якія

---

[10] БЫКОВА, С. “Наказанная память”: свидетельства о прошлом в следственных материалах НКВД. У: *Неприкосновенный запас*. [інтэрактыўны]. 2009. №2 (64). [прагледжана 18 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://magazines.russ.ru/nz/2009/2/by4.html>.

немагчыма верыфікаваць іншымі дакументамі. На шматлікія фальсіфікацыі дадзеных, якія ўтрымоўваюцца ў следчых справах, звяртаюць увагу А. Літвін[11] і Н. Кладова[12].

Што датычыцца ацэнкі працы з архіўна-следчымі справамі, то тут трэба прывесці словы В. Карамана[13]. Асаблівую складанасць, на думку аўтара, уяўляеюць дакладнасць і паўната крыніц. Працуючы з любым дакументам, як з крыніцай інфармацыі, заўсёды трэба памятаць пра існаванне двух інфармацыйных патокаў: першы – інфармацыя самаго тэкста, другі – інфармацыя, якая ляжыць па-за тэкстам, але можа быць атрымана толькі з дадзенага дакумента. Паводле меркавання даследчыка, фальсіфікацыя следчых спраў не дазваляе, выкарыстоўваць інфармацыю тэкста, як самастойную крыніцу, якая раскрывае рэальную дзейнасць апытваемага. Але параўнанне сведчанняў, аналіз паралельных сведчанняў у іншых справах, дазваляе выявіць даставерную інфармацыю. Праўда, часам немагчыма знайсці іншыя дакумены, якія пацвярджаюць ці абвяргаюць інфармацыю следства. У гэтым выпадку прыходзіцца аперыраваць наяўнымі дадзенымі, хоць яны могуць і не адпавядаць рэчаіснасці. Менавіта такія, небяспечныя з пункту гледжання крыніцазнаўства моманты даюць шырокі прастор для розных інтэрпрэтацый. Але, нягледзячы на ўсю складанасць дадзенай крыніцы, яна застаецца вельмі важнай для даследчыка.

### 1.2. Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага: структура, матэрыялы

Архіўна-следчая справа Клаўдзія Дуж-Душэўскага знаходзіцца ў Асобым архіве Літвы: Ф. К-1, Воп. 58, адз. з. 25116/3 і складаецца з матэрыялаў некалькіх спраў, заведзеных на К. Душэўскага ў розныя часы. Сярод іх трэба адзначыць наступныя: следчую справу №242, заведзеную Ковенскім аддзелам НКДБ ЛССР 12 жніўня 1940 г.; асабістую справу зняволенага №10223, заведзеную на Дуж-Душэўскага падчас яго ўтрымання ва ўнутраннай турме Ковенскага аддзела МДБ ЛССР 30 лістапада 1946 г.; следчую справу №1956 г., заведзеную Ковенскім аддзелам МДБ ЛССР 30 лістапада 1946 г. і следчыя справы №1956/8712 і №19097 з дадаткамі ад 12 снежня 1946 г. і ад 18 лютага

---

[11] ЛИТВИН А. Л. Следственные дела как исторический источник. У: *Эхо веков*. Казань, 1995. № 1. С. 170 - 176.

[12] КЛАДОВА, Н. В. Следственные дела репрессированых: соотношение информации и смысла в историческом источнике. У: *Актуальные вопросы истории Сибири*. [інтэрактыўны]. [прагледжана 11 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://new.hist.asu.ru/biblio/borod3/74-79.html>.

[13] КАРАМАН, В. Н. Исторические источники по истории политических репрессий в СССР (на примере Дальнего Востока). У: *Ойкумена. Регионоведческие исследования*. 2006. №1. С. 105.

1952 г. адпаведна, якія былі заведзеныя на К. Дуж-Душэўскага Міністэрствам дзяржаўнай бяспекі.

### 1.2.1. Матэрыялы следства 1940 г.

Следчая справа №242 была заведзена на К. Дуж-Душэўскага 12 жніўня 1940 г. Дадзеная справа складаецца з адзінаццаці аркушоў матэрыялаў следства, сярод якіх: два пратаколы аб прадленні тэрміна ўтрымання, пастанова аб прадленні тэрміну вядзення следства і ўтрымання пад вартай, пастанова аб меры прысячэння ў двух экзэмплярах, пастанова аб арышце у трох экзэмплярах, асабістая картка з адбіткамі пальцаў і фота арыштаванага. Асноўная інфармацыя, якую мы можам атрымаць з пералічаных матэрыялаў, гэта пералік асноўных фактаў грамадска-палітычнай дзейнасці Душ-Душэўскага, у якой ён абвінавачваецца.

Большасць матэрыялаў справы №242 у 1946 г. былі ўключаны ў следчую справу №1956/8712 і знаходзяцца ў яе дадатку. Сярод іх мы можам азнаёміцца з шэрагам пастаноў: пастановай на арышт, пастановай аб меры прысячэння, пастановай на прыцягненне матэрыялаў да следства, пастановай аб прад’яўленні абвінавачання і іншымі дакументамі. Акрамя пастаноў тут знаходзяцца ордэр на арышт, пратаколы дагляду, пратаколы аб канфіскацыі маёмасці і пратакол аб спыненні следства. Таксама ў дадатку знаходзіцца акт аб знішчэнні канфіскаваных матэрыялаў (сярод якіх трынаццаць лістоў, пяць аркушоў з нататніка, нататнік, пропуск у радыёстанцыю) і даведка аб судзімасці. У якасці крыніцы інфармацыі найбольшую цікавасць сярод матэрыялаў, якія ўтрымліваюцца ў дадзенай справе, выклікаюць пратаколы допытаў. Так, сярод матэрыялаў справы мы можам азнаёміцца з адзінаццацю пратаколамі допытаў самаго К. Дуж-Душэўскага і пратаколамі допытаў сведкаў, сярод якіх Пайлаўскас, Амбразаціс і Якавюк.

### 1.2.2. Матэрыялы следства 1946 – 1947 гг.

Матэрыялы следства 1946 – 1947 гг. складаюцца з чатырох частак: асабістай справы зняволенага №10223, заведзенай на Дуж-Душэўскага падчас утрымання ва ўнутранай турме Ковенскага аддзела МДБ; следчай справы №1956, заведзенай Ковенскім аддзелам МДБ; следчай справы №1956/8712, заведзенай у Міністэрстве дзяржаўнай бяспекі ЛССР і дадаткам да самой справы №1956/8712.

Асабістая справа зняволенага №10223 ад 30 лістапада 1946 г. утрымоўвае семдзесят адзін аркуш з матэрыяламі, сярод якіх: ордэр на арышт, пастанова аб абранні

меры прысячэння, пратакол асабістага дагляду, анкета арыштаванага, даведка аб пазбаўленні волі, медычная даведка, камерная картка, камерны талон, пратакол асабістага допыту, сем запросаў аб патрабаванні допытаў, пяць запросаў на прадленне тэрміну ўтрымання і іншае. З пералічаных дакументаў найбольш цікавай крыніцай інфармацыі з’яўляецца анкета арыштаванага, з якой мы можам даведацца пра склад сям’і К. Дуж-Душэўскага і яго славесны партрэт. Астатнія матэрыялы істотнай інфармацыі пра К. Дуж-Душэўскага не нясуць.

Следчая справа №1956 ад 30 лістапада 1946 г. складаецца з дваццаці сямі архіўных мытэрыялаў. Сярод якіх, як і ў папярэдняй справе, мы можам азнаёміцца з шэрагам пастаноў: пастановай аб затрыманні на арышт, пастановай аб абранні меры прысячэння, пастанова аб прыняцці справы да свайго справаводству, пастанова аб прад’яўленні абвінавачання, пастановай аб пераводзе справы ў МДБ ЛССР, пастановай аб спыненні ўгалоўнага пераследу і вызваленні арыштаванага і інш. Сярод дакументаў таксама ў дадзенай справе ўтрымоўваецца выпіска ордэру на арышт, пратакол асабістага дагляду, перапіска па следчай справе, кантрольная картка на арыштаванага з адзнакай аб накіраванні справы і сдачы ў архіў, даведка па справе на здачу для захавання ў архіў і іншае.

Як бачна з пераліку вышэй апісаных дакументаў, яны часткова дублюць матэрыялы асабістай справы №10223. Новую інфармацыю і найбольшую цікавасць з сябе прадстаўляюць пастановы аб прад’яўленні абвінавачання і спыненні ўгалоўнага пераследу і вызваленні арыштаванага з-пад варты. У гэтых дакументах мы можам азнаёміцца з самім абвінавачаннем і з апісаннем асноўных фактаў грамадска-палітычнай дзейнасць К. Дуж-Душэўскага.

Следчая справа №1956/8712 была заведзена на К. Дуж-Душэўскага Міністэрствам дзяржаўнай бяспекі 12 снежня 1946 г. Дадзеная справа складаецца з трыццаці сямі аркушоў з матэрыяламі следства. Сярод матэрыялаў справы даведка пра арышт, шэраг пастаноў: аб прыняцці следчай справы да справаводства, аб прадленні тэрміну вядзення следства і ўтрымання арыштаванага пад вартай, аб прыцягненні следчых матэрыялаў, пастанова аб спыненні ўгалоўнага пераследу і вызваленні з-пад варты і шэраг іншых дакументаў, сярод якіх большую частку складае следчая перапіска. Сярод апісаных дакументаў каштоўнай з’яўляецца пастанова аб прыцягненні следчых матэрыялаў, дзе мы можам азнаёміцца з рэчыўнымі доказамі следства. Астатнія дакуманты ніякай новай інфармацыі не нясуць.

Найбольшую каштоўнасць прадстаўляе з сябе дадатак да следчай справы №1956/8712. У ім утрымоўваюцца як матэрыялы справы №1956/8712, так і матэрыялы да следчай справы №242 ад 12 жніўня 1940 г., якія былі апісаны намі вышэй. Сярод матэрыялаў да следчай справы №1956/8712 мы можам ўбачыць шэраг дакументаў, якія дублююць дакументы самой справы (пастановы, следчая перапіска і іншае). Дадзеныя дакументы могуць быць карыснымі для даследавання самаго працэссу справаводства. Якой-небудзь інфармацыі пра К. Дуж-Душэўскага яны не нясуць. Асноўнымі і найбольш цікавымі крыніцамі інфармацыі ў дадатку з'яўляюцца пратаколы допытаў. Так, дадатак дадзенай справы ўтрымоўвае шаснаццаць пратаколаў допытаў самаго Клаўдзія Дуж-Душэўскага і пратаколы допытаў сведкаў па справе Краўчанкі і Сіроткі.

Акрамя пералічаных дакументаў дадатак следчай справы №1956/8712 утрымоўвае два пакеты з матэрыяламі, якія праходзяць у следстве як рэчаўныя доказы. У першым пакеце знаходзіцца два лісты жонкі Дуж-Душэўскай Алены Старшыне Прызідыума Вярхоўнага Савета ЛССР Ю. Палецкісу з просьбай аб дапамозе ў вызваленні мужа. Першы ліст датаваны 20 сакавіка 1947 г., другі – 2 красавіка 1947 г. На апошнім пазначана рэзалюцыя Старшыні Прэзідыума ВС аб накіраванні дадзенага ліста генерал-маёру МДБ ЛССР Яфімаву Д. А. з мэтай прыцягнення ў следчую справу. Таксама ў дадзеным пакеце мы можам азнаёміцца з заявай на літоўскай мове дэпутата Зігмаса Жэмайціса Старшыне Прэзідыума Вярхоўнага Савета ЛССР з просьбай аб вызваленні К. Дуж-Душэўскага, датаванай 20 сакавіка 1947 г., а таксама копіяй дадзенай заявы з перакладам на рускую.

Як і першы пакет, другі ўтрымоўвае шэраг матэрыялаў, прыцягнутых следствам у якасці доказаў. Сярод гэтых матэрыялаў асобна трэба вылучыць кнігу К. Езавітава "Беларусы ў Літве", выдадзеную ў Рызе ў 1932 г. Беларускім Выдавецтвам у Латвіі. Кніга распавядае пра стан беларускай меншасці ў Літве і з'яўляецца важнай крыніцай для даследавання беларускага нацыянальнага руху ў Літве ў межваенны перыяд.

У дадзеным пакеце ўтрымоўваюцца два адкрытых лісты, напісаных самім К. Дуж-Душэўскім. Першы ліст "Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…" ад 1 мая 1933 г. напісаны на беларускай мове і ўтрымоўвае шматлікія звесткі пра беларускі рух у Літве. У пакеце таксама ўтрымоўваецца копія дадзенага ліста з перакладам на расейскую мову. Другі ліст Дуж-Душэўскага, датаваны 2 красавіка 1933 г., накіраваны грамадскім дзеячам з копіяй міністру замежных спраў Літвы. Дадзены ліст з'яўляецца адказам на данос на Дуж-Душэўскага ў літоўскі Кабінет міністраў Якавюка, Плескачэўскай, Матач, Радзюка і Дзедзевіча. Дадзеныя лісты з'яўляюцца каштоўнай крыніцай інфармацыі пра стан беларускіх справаў у Літве ў 20-я – пачатак 30-х гг., акрамя шматлікіх фактаў у іх

паказваюцца ўнутраныя стасункі паміж беларускімі дзеячамі ў адзначаны гістарычны перыяд.

Таксама ў пакеце знаходзіцца копія пратакола №29 сходу Цэнтральнага праўлення Таварыцтва Беларускіх настаўнікаў у Латвіі пры ўдзеле прадстаўнікоў беларускіх арганізацый ад 7 чэрвеня 1933 г. У дадзеным пратаколе падаюцца звесткі пра беларускі рух у Літве і даецца ацэнка дзейнасці беларускіх грамадскіх дзеячоў. Тут жа мы можам азнаёміцца з вытрымкай з газеты “Незалежная Літва” №49 з артыкулам каноніка Іосіфа Тумаса-Вайжганта “Беларусы аб’ядноўваюцца з палякамі?”. У дадзеным артыкуле аўтар у негатыўнай форме выказваецца пра дзейнасць К. Дуж-Душэўскага, А. Луцкевіча і Алексюка.

Сярод матэрыялаў, якія знаходзяцца ў пакеце, мы можам азнаёміцца з данясеннем ад 15 лістапада 1934 г. сябру Цэнтральнага выканаўчага камітэта беларускіх сялян-партызан “Зялёнага дуба” атаману Дзергачу аб атрыманні беларускімі дзеячамі грошай ад польскай дэфензівы “за інфармацыю аб беларускіх нацыянальных справах і для рэпрэзентацыі беларускага народа перад урадамі іншых дзяржаў”. У дадзеным данясенні фігуруюць прозвішчы Аляксюка, Дуж-Душэўскага, Паўлюкевіча, Зенкевіча, Дубікоўскага і Цярэшчанка. У пакеце прадстаўлены як сам арыгінал на літоўскай мове, так і копіі ў перакладзе на беларускую і расейскую.

Акрамя пералічаных матэрыялаў у пакеце знаходзіцца ліст М. Вяршыніна на беларускай мове, напісаны ў Празе 6 красавіка 1934 г. У лісце падаюцца некаторыя факты з жыцця беларускіх дзеячоў, фігуруюць прозвішчы Дзямідава, Езавітава, Дуж-Душэўскага і Луцкевіча. У гэтым жа пакеце ўтрымліваецца і іншыя дакументы, сярод іх шэраг даведак, выдадзеных Сіротке Ігнасу аб тым, што ён лічыцца электраманцёрам завода “Інкарас”, Матачу Антону і Віктару аб прапіске і іншае. Дадзеныя даведкі ніякай істотнай інфармацыі пра К. Дуж-Душэўскага і беларускі нацыянальны рух у Літве не нясуць.

### 1.2.3. Матэрыялы следства 1952 г.

У адрозненні ад 1946 – 1947 гг. матэрыялы следства 1952 г. прадстаўлены толькі следчай справай №19097, заведзенай на К. Дуж-Душэўскага Міністэрствам дзяржаўнай бяспекі ЛССР 18 лютага 1952 г., з дадаткам да дадзенай справы. Нягледзячы на гэта, менавіта дадзеныя матэрыялы ўтрымоўваюць найбольшую колькасць дакументаў, а значыць, даюць большую інфармацыі пра К. Дуж-Душэўскага і беларускі нацыянальны рух у Літве. Гэта звязана з тым, што да следства былі прыцягнуты як матэрыялы, якія меліся да гэтуль, так і вялікая колькасць новых.

Як і ў папярэдніх справах дадзеная справа ўтрымоўвае ў асноўным следчую перапіску і шэраг пастаноў і пратаколаў, сярод якіх: пастанова аб прыняцці справы да справаводства, пратакол аб прад’яўленні абвінавачання, пратакол дагляду, пратакол аб выдзяленні матэрыялаў справы з архіву, пастанова аб аб’яднанні справы, пастанова аб удакладненні ўстановачных дадзеных, пастанова аб далучэнні рэчыўных доказаў, абвінавацельнае заключэнне і іншае. Дадзеныя дакументы акрамя інфармацыі пра абвінавачанне ніякай інфармацыі пра К. Душ-Душэўскага не нясуць.

Уся асноўная інфармацыя па справе знаходзіцца ў дадатку, які ўтрымоўвае чатырыста дваццаць шэсць аркушоў з матэрыяламі следства. У пачатку дадатка мы можам азнаёміцца з пастановай аб адмене рашэння “аб прыпыненні ўгалоўнага пераследу і вызваленні арыштаванага з-пад варты”, пастановай аб прыняцці справы да справаводства, пастановай на арышт, пастановай аб абранні меры ўтрымання, ордэрам на арышт і дагляд, анкетай арыштаванага, пакетам з фатакарткай абвінавачванага, дакталаскапічнай карткай, даведкай Глыбоцкага гарвыканкама аб паходжанні абвінавачванага, пратаколам асабістага дагляду, квітанцыяй на рэчыўныя доказы, опісам маёмасці, пастановай аб прад’яўленні абвінавачання і іншымі дакументамі.

Найбольшую каштоўнасць для даследчыкаў прадстаўляюць з сябе пратаколы допытаў. Так, дадатак следчай справы №19097 утрымоўвае дваццаць восем пратаколаў допытаў К. Душ-Душэўскага, пратаколы допытаў сведкаў, у якасці якіх выступаюць Пяткавічус, Каралёў, Іоніс, Гасціла, Кармілавічус, Бедорфайтэ, Клепацкас, Кармілявічус, Перас, Туня і Брунас. Акрамя гэтага ў дадатку змяшчаюцца архіўныя выпіскі з пратаколаў допытаў Езавітава, Станкевіча, Зайца, Каравайчыка, Радзевіча, Ластоўскага, Мядзелкі, Гаўрыліка, Муха-Мухоўскага, Кахановіча і Цвікевіча. Нягледзячы на тое, што інфармацыя, атрыманая на допытах можа не заўсёды адпавядаць рэчаіснасці, вялікая колькасць дапытаных сведкаў і архіўных выпісак з пратаколаў допытаў беларускіх дзеячоў даюць магчымасць параўнання тых ці іншых фактаў, атрыманых следствам.

У дадатку мы можам азнаёміцца з архіўнай копіяй аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага на двух аркушах і архіўнай копіяй апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці аўтара на пяці аркушах. Дата напісання аўтабіяграфіі не пазначана, але зыходзячы з яе зместу можна выказаць здагадку, што яна была напісана ў першай палове 30-х гг. Апісанне грамадскай і палітычнай дзейнасці Душэўскага датуецца ад 31 жніўня 1934 г. Абодва тэксты ўтрымоўваюць шмат інфармацыі пра жыццё аўтара. Улічваючы беднасць інфармацыі пра К. Душ-Душэўскага ў беларускай навуковай і публіцыстычнай

літаратуры дадзеныя матэрыялы з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для даследавання яго жыцця і дзейнасці.

Таксама ў дадатку да справы мы можам пабачаць значную колькасць архіўных матэрыялаў. Так, сярод дакументаў якія ўтрымоўваюцца ў дадатку, мы можам азнаёміцца з вытрымкай з пратаколаў "Усеагульнага з'езда беларусаў Вільні" ад 25 траўня 1919 г. на адным аркушы. Дадзены дакумент змяшчае інфармацыю пра выступы К. Дуж-Душэскага на з'ездзе з крытыкай палітыкі бальшавікоў. Тут жа ў дадатку мы можам азнаёміцца з абзорам архіўных матэрыялаў аб дзейнасьці "Усеагульнага з'езда беларусаў Вільні" на двух аркушах. У абзоры падаюцца рэзалюцыі з'езду і поўны спіс абраных на з'ездзе сябраў Беларускага нацыянальнага камітэта.

У дадатку ўтрымоўваюцца тры архіўныя копіі пратаколаў паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта датаваныя ад 3 чэрвеня 1919 г., 24 ліпеня 1919 г. і 1 жніўня 1919 г. Першы пратакол падае інфармацыю пра выбары Прэзідыума Беларускага нацыянальнага камітэта і абранне К. Дуж-Душэўскага старшынёй. У другім пратаколе мы можам даведацца пра пызіцыю камітэта пра ўдзел у выбарах у гарадское самакіраванне. У дадзеным пратаколе К. Дуж-Душэўскі заяўляе, што з'яўляецца сябрам "Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў". Трэці пратакол дае інфармацыю аб дакладзе К. Дуж-Душэскага аб аўдыенцыі ў Маргентаў і наведванні Ю. Пілсудскага.

У дадатку справы захоўваецца архіўная копія ліста БНК "Главе місіі ЗША", датаванага ад 1 жніўня 1919 г. на трох аркушах. У дадзеным звароце БНК звяртаецца да главы місіі ЗША ў Польшчы за палітычным прызнаннем і эканамічнай дапамозе беларускаму народу. Тут жа ўтрымоўваецца і зварот "БНК да глаўнакамандуючага польскай арміі" на адным аркушы. У звароце БНК вітае вызваленне земляў Заходняй Беларусі польскімі войскамі ад бальшавікоў і выказваецца за ўдзел беларускіх жаўнераў "пад сваім нацыянальным сцягам" на баку польскай арміі ў далейшым вызваленні беларускіх земляў.

Таксама ў дадатку мы можам азнаёміцца з копіяй выпіскі з дваццаць шостай главы кнігі Язэпа Найдюка "Беларусь учора і сёння", выдадзенай у Менску пад-час нямецкай акупацыі. У выпіске даволі падрабязна распавядаецца пра справы ў беларускім нацыянальным руху пачынаючы ад I Усебеларускага з'езда да канца 1919 г. Тут жа ўтрымоўваецца і архіўная выпіска са спісу сябраў "Беларускага навуковага таварыства" у перыяд нямецкай акупацыі Беларусі, датаваная 1 сакавіка 1944 г. У дадзенай выпіске сцвярджаецца, што К. Душ-Душэўскі з'яўляецца сябрам таварыства і ўваходзіць у склад тэхнічнай секцыі.

Асаблівую каштоўнасць мае невялічкі канверт, у якім знаходзіцца фатаграфія і пяць візітовак. Фатаграфія зроблена 25 снежня 1919 г. у г. Рызе, на ёй мы можам пабачыць К. Езавітава ў вайсковай форме і К. Дуж-Душэўскага. Што датычыцца візітовак, то яны належаць К. Дуж-Душэскаму. У іх Душэўскі прадстаўлены як старшыня “Цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны”, віцэ-старшыня “Беларускай Вайсковай Арганізацыі”, старшыня “Беларускага выдавецтва “Веда” (былая “Крыніца”)”, часовы ўпраўляючы “Віленскага аддзеду Саюза каператываў Беларусі” і сакратар “Саюза каператываў Віленскай вобласці”. Дадзеныя візітоўкі з’яўляюцца важнай крыніцай, якая сведчыць пра актыўны ўдзел К. Дуж-Душэўскага ў беларускіх справах.

У дадатку да справы мы можам азнаёміцца з архіўнай выпіскай з перакладам на расейскую мову даклада К. Дуж-Душэўскага аб “Руска-польскім перамір’і і Беларусі” на дзесяці аркушах. У дадзеным дакладзе аўтар ад імя Рады БНР выказвае афіцыйную пазіцыю Рады аб заключаным перамір’і і асуджае акт падзелу тэрыторыі Беларусі Польшчай і Расеяй. Тут жа знаходзіцца і архіўная копія рэзалюцыі, прынятай на “Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі” ад 20 кастрычніка 1920 г. У самым канцы тэкста рэзалюцыі К. Дуж-Душэўскі пазначаецца як старшыня канферэнцыі. Акрамя гэтага мы можам азнаёміцца і з гістарычнай даведкай аб дзейнасці Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні, у якім на васьмі аркушах даволі падрабязна распавядаецца пра дзейнасць БНК у перыяд з 1919 г. па 1938 г.

Таксама ў дадатку мы можам азнаёміцца і з іншымі матэрыяламі. Так, у дадатку да справы знаходзіцца даведка Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук ЛССР ад 4 красавіка 1952 г., якая сведчыць аб палітычнай накіраванасці часопіса “Крывіч”. Тут жа мы можам пабачыць і архіўную даведку Цэнтральнага Дзяржаўнага Гістарычнага архіва ў Ленінградзе №00178 ад 14 лютага 1952 г. аб тым, што К. Дуж-Душэўскага лічыцца ў спісе студэнтаў Пецярбургскага горнага інстытута ў асенніх семестрах 1913 і 1914 гг. Асобна сярод матэрыялаў дадатку можна адзначыць і спіс спраектаваных К. Дуж-Душэўскім будынкаў у Літве.

У самым канцы дадатка знаходзіцца пратакол аб сканчэнні следства, медыцынская даведка пра стан здароўя абвінавачваемага, абвінавачванне, касацыйная скарга К. Дуж-Душэўскага, пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Суда ЛССР аб змене прыгавора, пратаколы паседжанняў Судовай калегіі, пратакол судовага паседжання і прыгавор. Сярод пералічаных дакументаў найбольш каштоўнымі крыніцамі інфармацыі з’яўляюцца абвінавачванне, пратакол судовага паседжання і сам прыгавор. Дадзеныя дакументы

найбольш поўна распавядаюць пра матэрыялы следства і абагульнена апісваюць асноўныя моманты грамадска-палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага.

Акрамя апісаных вышэй матэрыялаў дадатка следчай справы №19097 да яе адносяцца і дзве папкі, у якіх знаходзяцца часопісы, канфіскаваныя ў К. Дуж-Душэўскага. У адной з папак знаходзяцца нумары часопісаў на нямецкай мове, сярод іх восем нумароў часопіса “Signal” і тры нумары часопіса “Woche”. У другой тэчцы знаходзяцца нумары часопіса “Для вас”, выдадзеныя расійскай эміграцыяй ў Рызе. Ніякай інфармацыі, якая датычыцца К. Дуж-Душэўскага ці беларускага нацыянальнага руху, дадзеныя крыніцы не нясуць.

Як бачна з апісання архіўна-следчай справы К. Дуж-Душэўскага, дадзеная крыніца ўтрымоўвае вялікую колькасць матэрыялаў для вывучэння. Сярод іх найбольшую цікавасць для гісторыкаў прадстаўляюць матэрыялы дадаткаў да следчых справаў №1956/8712 і №19097, якія ўтрымоўваюць найбольшую колькасць дакументаў. Менавіта дадзеныя дадаткі з’яўляюцца найбольш каштоўнымі крыніцамі інфармацыі. Так, найбольшую цікавасць з наяўных матэрыялаў прадстаўляюць дакументы абвінавачанння, пратаколы допытаў К. Дуж-Душэўскага і сведкаў, а таксама рэчы, якія ўтрымоўваюць шмат інфармацыі пра беларускі нацыянальны рух і жыццё К. Дуж-Душэўскага.

# 2. БІЯГРАФІЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЕЯЧА

Прац, прысвечаных жыццю і дзейнасці К. Дуж-Душэўскага, у беларускай гістарыяграфіі і публіцыстыцы вельмі мала. Сярод аўтараў трэба адзначыць Л. Луцкевіча, В. Ждановіча, С. Рудовіча і С. Харэўскага. Найбольш поўным біаграфічным аглядам жыцця К. Дуж-Душэўскага з'яўляецца атрыкул С. Рудовіча "Палітык, асветнік, дойлід"[14]. Артыкул напісаны на аснове аўтабіяграфіі Душэўскага з прыцягненнем іншых матэрыялаў, аўтарам не пазначаных. Нягледзячы на вялікі фактаграфічны матэрыял, дадзены артыкул застаўся, фактычна, па-за ўвагай шырокага чытача і даследчыкаў. Прынамсі ў літаратуры амаль адсустнічаюць спасылкі на яго. Таксама варта адзначыць артыкул С. Рудовіча ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі[15]. Пра ролю Дуж-Душэўскага ў станаўленні беларускага нацыянальнага сцяга паводле ўспамінаў сына Душэўскага Сцяпана напісаў у сваім артыкуле С. Харэўскі[16].

Большасць інфармацыі, якую прыводзяць адзначаныя вышэй аўтары, паўтараецца. Зачастую факты прыводзяцца без спасылак, што надае публіцыстычны характар публікацыям і ўскладняе ацэнку інфармацыі і яе выкарыстанне. Тым не менш, са зместу артыкулаў мы можам выказаць здагадку, што асноўнымі крыніцамі, якія выкарыстоўваліся пры напісанні тэкстаў, з'яўляліся аўтабіяграфічныя нарысы Душэўскага, успаміны пра яго блізкіх і сваякоў. Матэрыялы архіўна-следчай справы К. Душэўскага дагэтуль нікім з названых аўтараў не выкарыстоўваліся. Між тым, безумоўна, дадзеная крыніца дазволіць удакладніць шэраг фактаў і напісаць больш грунтоўную біяграфію Клаўдыя Дуж-Душэўскага.

## 2.1. Дзяцінства. Сям'я

Паводле наяўных звестак Клаўдзій Сцяпанавіч Душэўскі нарадзіўся ў 1891 г. у м. Глыбокае. Дакладная дата нараджэння Душэўскага невядома. У літаратуры фігуруюць две даты: 26 красавіка і 27 сакавіка[17]. Першая дата звязана з сямейным паданнем Душэўскіх. Як адзначае ў сваім артыкуле С. Рудовіч, калі бацькі Душэўскага хацелі даць імя сыну, то

---

[14] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. У: *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна*. Пад рэд. Сачанка Б. І. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1995. С. 126 – 130.

[15] РУДОВІЧ, С. Душэўскі. У: *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*. Т.3. Мн., Беларуская Энцыклапедыя, 1996.

[16] ХАРЭЎСКІ, С. Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Сьцяг. У: *Наша Ніва*. 1998. № 6. С. 15.

[17] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 126.

сутыкнуліся з праблемай: у касцельных календарах на яго дзень нараджэння значыліся толькі жаночыя імёны. І толькі дзякуючы старому малітоўніку атрымалася адшукаць мужчынскае імя – Клаўдзій. Дзень Св. Клаўдзія прыпадае на 26 красавіка, таму гэты дзень родныя заўсёды святкавалі як дзень нараджэння К. Душэўскага. Другую дату – 27 сакавіка, ужо ў сталым узросце пазначаў сам Душэўскі. На вялікі жаль, пытанне дакладнай даты нараджэння Клаўдзія Сцяпанавіча матэрыялы следчай справы не вырашаюць. Ва ўсіх дакументах, якія сустракаюцца, мы можам пабачыць толькі пазначэння года нараджэння.

Як адзначаюць даследчыкі, К. Душэўскі нарадзіўся ў сям'і прадстаўнікоў беларускай шляхты. Але сам Клаўдзій Сцяпанавіч на адным з допытаў сведчыў, што нарадзіўся ў сям'і селяніна[18]. Дадзеная інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці і супярэчыць іншым паказанням Душэўскага. Так, паводле аўтабіяграфічных звестак прыведзеных у матэрыялах архіўна-следчай справы бацька і дзядзька (С. Рудовіч піша пра бацьку і дзеда[19]) Душэўскага былі прафесійнымі будаўнікамі[20]. Гэта пацвярджаюць і пазнейшыя сведчанні К. Душэўскага: ”Бацька з сям'і працоўных, па прафесіі сталяр-адзіночка… Адначасова меў некалькі гектараў зямлі і займаўся хлебаробствам”[21].

Што тычыцца паходжання маці К. Душэўскага, то на допытах Клаўдзій Сцяпанавіч адзначаў, што маці яго “з сям'і дваран Высоцкіх, якія пражывалі ў былой Віленскай губерні”[22]. Паводле аўтабіяграфічных звестак, продкі Душэўскага па матчынай лініі праявілі сябе як змагары за незалежнасць Айчыны падчас антырасійскіх паўстанняў 1830-31 гг. і 1863 г. Дзед маці меў прозвішча Урублеўскі, паходзіў са шляхты Полацкага ўезда, загінуў падчас паўстання ў 1831 г. Такі ж лёс спаткаў і бацьку маці – Высоцкага, які таксама загінуў падчас паўстання ў 1863 г. Сама маці К. Душэўскага першыя гады свайго жыцця правяла ў Антокальскай турме ў Вільні[23].

---

[18] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 21 – 28.

[19] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 126.

[20] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

[21] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 40 – 53.

[22] Тамсама. Арк. 40 – 53.

[23] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

Вядома, што ў сям'і бацькі Душэўскага было пяць дочак і адзін сын. Як сведчыў на допытах сам Душэўскі, ён быў малодшы пасля сясцёр Ядзвігі, Ганны, Марыі, Валерыі і Браніславы[24]. З'яўляючыся адзіным сынам, ён з дзяцінства пачаў дапамагаць бацьку па працы. З юных год Клаўдзій Сцяпанавіч прысутнічаў на будоўлях, дапамагаў майстрам[25]. Амаль да васьмі год К. Душэўскі жыў разам з бацькам ў мястэчку Глыбокае. Восенню 1899 г. з мэтай паступлення на вучобу разам з маці ён пакінуў Глыбокае і пераехаў у Вільню[26]. Бацька застаўся жыць на старым месцы (памёр у 1916 г.)[27].

Такім чынам, матэрыялы справы даюць магчымасць удакладніць звесткі пра паходжанне і склад сям'і К. Душэўскага. Сярод прыведзеных сведчанняў, новай інфармацыя з'яўляюцца імёны сясцёр Клаўдзія Сцяпанавіча. У літаратуры дадзеныя імёны дагэтуль нідзе не фігуравалі.

Што рабіў К. Душэўскі першыя два гады свайго прыбыцця ў Вільні невядома. Пра гэта нічога не кажуць і матэрыялы архіўна-следчай справы. Паводле паказанняў Душэўскага толькі ў 1902 г. ён паступіў у падрыхтоўчую школу, дзе навучаўся да восені 1903 г.[28]. Восенню таго ж года ён паступіў у Віленскае рэальнае вучылішча. Перыяд навучання Душэўскага ў рэальным вучылішчы ў 1903 – 1910 гг. у літаратуры не асвятляецца. Сам Душэўскі ў сваёй аўтабіяграфіі адзначаў наступнае: "Мае бацькі лічылі сябе беларусамі польскай культуры. Таму ўжо з дзяцінства, з'яўляючыся вучнем малодшых класаў, я быў уцягнуты ў розныя польскія канспіратыўныя гурткі, дзе пазнаёміўся з Недвалькоўскім, Арцішэўскім, Касцялкоўскім і іншымі сучаснымі (на 1934 г. – прым. аўт.) польскімі палітыкамі і грамадскімі дзеячамі"[29].

Лёсавызначальным у жыцці К. Душэўскага стаў 1910 г. Пра гэты перыяд даволі падрабязна напісаў у артыкуле "Палітык, асветнік, дойлід" С. Рудовіч[30]. Як адзначае аўтар, прыкладна ў 1910 г. у рукі Душэўскаму трапіў зборнік Францішка Багушэвіча

---

[24] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 40 – 53.

[25] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

[26] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 21 – 28.

[27] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.01.1947. Арк. 40 – 53.

[28] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. Арк. 21 – 28.

[29] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

[30] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 127.

“Смык беларускі” і газета “Наша Ніва”. У тым жа годзе Душэўскі пазнаёміўся з Вацлавам Ластоўскім, братамі Антонам і Іванам Луцкевічамі і іншымі беларускімі дзеячамі. Вырашальнай для Душэўскага стала сустрэча з В. Ластоўскім у рэдакцыі “Нашай Нівы”. Спасылаючыся на ўспаміны К. Дуж-Душэўскага Рудовіч сцвярджае: “Паводле яго (Дуж-Душэўскага – прым. аўт.) уласных успамінаў, выказаў у час гаворкі думку, што беларусы маюць бедную гісторыю. ”Раптам, - прыгадваў Клаўдзій Сцяпанавіч, – скуль узяўся, чалавек лысы, няголены, з круглым чалом, і ідучы яшчэ, паднятым голасам стаў гаварыць: “Як, мы ня маем гісторыі? Скажыце, калі ласка, хто мае багацейшую гісторыю, чым мы, беларусы?” Зразу ён мне насыпаў так шмат, што перавярнуў усю маю гістарычную веду… Гэта быў Ластоўскі”[31]. Як адзначае С. Рудовіч, менавіта ўплыў нашаніўцаў вызначыў жыццёвы выбар К. Душэўскага.

Матэрыялы архіўна-следчай справы даюць магчымасць пазнаёміцца з іншай версіяй знаёмства Душэўскага з дзеячамі беларускага нацыянальнага руху. Так, паводле паказанняў Душэўскага, з Антонам Луцкевічам і Вацлавам Ластоўскім ён пазнаёміўся ў 1910 г. у кніжнай краме, уладальнікамі якой яны былі. К. Душэўскі часта заходзіў да іх у краму, каб набыць ці проста пачытаць кнігі[32]. Як адзначаў у сваёй аўтабіяграфіі Клаўдзій Сцяпанавіч, менавіта гэта знаёмства дапамагло яму зразумець, што ён не паляк. Амаль адразу ён далучыўся да беларускага руху ў Вільні, актыўным удзельнікам якога з’яўляўся апошнія два гады навучання ў рэальным вучылішчы. Прыкладна на гэты час прыпала яго знаёмства і з дзеячамі літоўскага нацыянальнальнага руху. Акрамя асабістага знаёмства з Жмуйдзінавічам, Янулайцісам, Кайрісам і іншымі, у гэты перыяд ён ужо добра ведаў аб Антонасе Смятоне, ксяндзе Тумасе, Басанавічусе, Біржышке, Жамайцісе і іншых дзеячах літоўскага нацыянальнага руху[33].

### 2.2. У Пецярбурзе

Пецярбургскі перыяд жыцця К. Душэўскага ў літаратуры асветлены даволі падрабязна. Вядома, што ў 1912 г. ён скончыў Віленскае рэальнае вучыльшча і паступіў ў

[31] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 127.

[32] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 40 – 53.

[33] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

Пецярбургскі горны інстытут[34]. Падчас навучання ў інстытуце Душэўскі спрабаваў як мага больш прымяняць на практыцы атрыманыя веды. Лёс закідваў К. Душэўскага нават у Сібір, дзе ён самастойна працаваў на гідратэхнічных працах, спачатку як майстар, пазней як гідратэхнік. У якасці практыканта ён працаваў на заводах і фабрыках, у шахтах. Пасля Сібіры Душэўскі трапіў у Жыгулёў на Волгу, дзе працаваў на цэментным заводзе пры правядзенні геалагічных працаў[35]. Акрамя навучання амаль увесь свой вольны час К. Душэўскі прысвячаў беларускаму руху. Ён актыўна займаўся культурніцкімі справамі: удзельнічаў у працы Беларускага навукова-літаратурнага гуртка пры Пецярбургскім універсітэце, дзе распрацоўваў тэму вывучэння і аховы гістарычных помнікаў; прымаў удзел ў выданні часопіса беларускай студэнцкай моладзі “Раніца”, у якім публікаваў і свае матэрыялы[36].

Матэрыялы архіўна-следчай справы дазваляюць удакладніць прыведзеную інфармацыю. Так, паводле паказанняў Душэўскага, рэдактарамі часопіса “Раніца” быў ён сам і Браніслаў Тарашкевіч. За ўвесь час атрымалася выдаць толькі адзін нумар, што было звязана з адсутнасцю сродкаў[37]. Матэрыялы архіўна-следчай справы даюць магчымасць пазнаёміцца і з дадатковымі, дагэтуль невядомымі звесткамі пра дзейнасць Клаўдзія Сцяпанавіча. Так, паводле аўтабіяграфічных звестак Душэўскага, ён быў старшынёй Беларускага студэнцкага саюза Пецярбурга, удзельнічаў у арганізацыі беларускага хора. У 1913 г. К. Душэўскі прымаў удзел у тайнай літоўска-польска-украінскай канферэнцыі, на якой разам з Б. Тарашкевічам прадстаўляў беларусаў. Прыблізна ў гэты час Душэўскі рэдагаваў і выдаваў беларускія газеты “Дзенніца” і “Светач”. У перыяд з 1916 па 1918 г. К. Душэўскі з’яўляўся супрацоўнікам Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны ў Пецярбургу[38]. Як адзначаў Душэўскі, беларуская інтэлігенцыя была вельмі малалікая, таму працаваць даводзілася вельмі шмат і па ўсім накірункам[39].

---

[34] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 21 – 28.

[35] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

[36] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 127.

[37] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 24.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 116 – 119.

[38] ХАРЭЎСКІ, С. Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Сьцяг. С. 15.

[39] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

Актыўная грамадская дзейнасць К. Душэўскага спрыяла пашырэнню новых знаёмстваў. Так, у перыяд навучання ў Пецярбургу Душэўскі пазнаёміўся з Янкам Купалам, з якім, як адзначае С. Рудовіч, у яго склаліся прыязныя адносіны. У пастаноўцы студэнцкага гуртка п'есы Я. Купалы "Паўлінка", Душэўскі выканаў ролю Сцяпана Крыніцкага[40]. Матэрыялы архіўна-следчай справы даюць магчымасць даведацца і пра іншыя знаёмствы К. Душэўскага з дзеячамі беларускага нацыянальнага руху ў перыяд яго навучання ў Пецярбургу. Так, у 1912 – 1913 гг. наведваючы беларускіх студэнтаў, якія навучаліся ў Тэхналагічным інстытуце, Душэўскі пазнаёміўся з Вацлавам Іваноўскім[41]. Прыкладна ў гэты ж перыяд ён пазнаёміўся і з Лявонам Зайцам, які навучаўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта[42].

У літаратуры пашыраная гіпотэза, што менавіта з дзейнасцю Душэўскага ў Пецярбургу звязана гісторыя беларускага нацыянальнага сцяга. Так, С. Рудовіч прыводзіць вытрымкі з аўтабіяграфіі Душэўскага, у якой Клаўдзій Сцяпанавіч сведчыць, што аўтарства эскіза бел-чырвона-белага сцяга належыць яму[43]. Даволі падрабязна канцэпцыю з'яўлення бел-чырвона-белага сцяга, спасылаючыся на словы сына К. Душэўскага Сцяпана, у сваім артыкуле апісвае С. Харэўскі[44]. Паводле наяўнай інфармацыі, эскіз сцяга быў створаны прыблізна ў пачатку 1917 г. Дадатковых звестак пра гэтую падзею матэрыялы следства не ўтрымоўваюць, адзінай крыніцай, якая пацвярджае вышэй апісаную інфармацыю, з'яўляецца згаданая С. Рудовічам аўтабіяграфія К. Душэўскага, напісаная ім у 1934 г.[45]. Такім чынам, матэрыялы справы даюць мачымасць пацвердзіць гіпотэзу, што аўтарства бел-чырвона-белага сцяга належыць Душэўскаму.

Насычаным на падзеі ў жыцці К. Дуж-Душэўскага стаў 1917 г. Клаўдзій Сцяпанавіч працягваў актыўна займацца грамадска-палітычнымі справамі. 25 сакавіка 1917 г. ён у якасці прадстаўніка ад пецярбургскіх студэнтаў-беларусаў прымаў ўдзел у

---

[40] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. У: *Памяць*: *гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна*. Пад рэд. Сачанка Б. І. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1995. С. 127.

[41] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 14.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 117 – 125.

[42] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 89 – 96.

[43] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 127 - 128.

[44] ХАРЭЎСКІ, С. Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Сьцяг. С. 15.

[45] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску[46]. Разам з Душэўскім пецярбургскіх студэнтаў-беларусаў прадстаўляў і Павел Каравайчык[47]. З аднаўленнем у сакавіку дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады ў Петраградзе Душэўскі ўступіў у шэрагі партыі, дзе ўжо ў чэрвені быў абраны ў ЦК, а пазней і ў прэзідыум ЦК БСГ. Паводле звестак, якія падаюцца ў артыкуле С. Рудовіча, у верасні 1917 г. К. Душэўскі разам з З. Жылуновічам, Я. Варонкам, У. Фальскім і іншымі беларускімі дзеячамі прадстаўляў беларускія арганізацыі на Усерасійскай дэмакратычнай нарадзе[48].

Матэрыялы архіўна-следчай справы ніякай інфармацыі пра ўдзел К. Душэўскага ў БСГ не ўтрымоўваюць. Дадатковай інфармацыі пра дадзены перыяд жыцця Клаўдзія Сцяпанавіча ў матэрыялах справы вельмі мала. Адзіным дакументам, у якім адзначаецца актыўная грамадская дзейнасць К. Душэўскага, з'яўляецца яго аўтабіяграфія. З яе мы можам даведацца пра новыя факты жыцця Клаўдзія Сцяпанавіча. Так, у 1917 г. ён прымаў удзел у шматлікіх канферэнцыях, у пасяджэннях Савета рабочых дэпутатаў Пецярбурга, у Маскоўскай дзяржаўнай нарадзе, камісіі па выпрацоўке правілаў аб выбарах ва Устаноўчы сход і іншае[49].

Актыўная грамадска-палітычная дзейнасць не перашкаджала К. Душэўскаму займацца дзейнасцю прафесійнай. Вядома, што вясной 1917 г. Клаўдзій Сцяпанавіч пачаў працаваць у Міністэрстве харчавання[50]. У аўтабіяграфіі мы можам пацвердзіць дадзеную інфармацыю і даведацца што ў міністэрстве Душэўскі займаў пасаду загадчыка аднаго з аддзелаў[51]. У міністэрстве К. Душэўскі працаваў да бальшавіцкага пераварота, у выніку якога яно было зліквідавана. Дзе быў і чым займаўся К. Душэўскі ў апошнія месяцы 1917 г. невядома. Наяўная літаратура ніякіх звестак пра гэты час не дае. Не даюць адказу на гэтае пытанне і матэрыялы архіўна-следчай справы. Вядома толькі, што ў першыя месяцы 1918 г. Клаўдзій Сцяпанавіч уладкаваўся на працу ў Беларускі нацыянальны камісарыят,

---

[46] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 128.

[47] Копія пратакола допыта Каравайчыка П. 10.11.1930 г. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 267 – 273.

[48] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 128.

[49] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

[50] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 127 - 128.

[51] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

дзе ён працаваў некалькі месяцаў на пасадзе загадчыка бежанскага аддзела[52]. Пра гэты факт ніякай інфармацыі матэрыялы архіўна-следчай справы не ўтрымоўваюць.

### 2.3. Барацьба за незалежнасць

З 1918 г. пачаўся новы этап жыцця К. Душэўскага, звязаны з яго актыўным удзелам у барацьбе за станаўленне беларускай дзяржаўнасці. У сваім артыкуле С. Рудовіч адзначыў, што К. Душэўскі "становіцца шчырым саўдзельнікам першых палітычных акцый маладой рэспублікі"[53]. Але канкрэтных фактаў удзелу Клаўдзія Сцяпанавіча ў станаўленні Беларускай Народнай Рэспублікі ў літаратуры амаль не прыводзіцца. Часткова зліквідаваць дадзены прабел у біяграфіі К. Душэўскага дапамагаюць матэрыялы следчай справы.

У сваёй аўтабіяграфіі Клаўдзій Сцяпанавіч сцвярджае, што непасрэдна прымаў удзел у станаўленні БНР[54]. Так, у жніўні 1918 г. ён разам з Вацлавам Ластоўскім у складзе дэлегацыі з двухдзённым візітам наведаў Берлін, дзе меў размову з міністрам нямецкага ўрада Маціасам Эрсбергам[55]. Пра канкрэтныя мэты візіта і змест размовы на допытах К. Душэўскі не распавядаў, адзначыўшы толькі, што М. Эрсберг выслухаў дэлегацыю, але ніякіх абацанняў не даў. Пасля вяртання з Берліна Клаўдзій Сцяпанавіч удзельнічаў у нарадзе па пытанню літоўска-беларускіх адносін. На дадзенай нарадзе яго кандыдатура была прапанавана на пост міністра беларускіх спраў у Літве. Але, як адзначаў К. Душэўскі, жадаючы скончыць інстытут, ад пасады ён адмовіўся і прапанаваў выставіць кандыдатуру Язэпа Варонкі, аб чым пазней шкадаваў[56]. Інфармацыя пра візіт Душэўскага ў Берлін і ўдзел у нарадзе з'яўляецца новым фактам яго біяграфіі. Дагэтуль ніхто з даследчыкаў ніякай інфармацыі пра гэтыя падзеі не пісаў, што падкрэслівае каштоўнасць атрыманай інфармацыі.

Паводле звестак у літаратуры, пасля расколу ўлетку 1918 г. Беларускай сацыялістычнай грамады Душэўскі далучыўся да ўтворанай Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, дзе разам з Вацлавам Ластоўскім прытрымліваўся

---

[52] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 128.

[53] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 129.

[54] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

[55] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 76 – 85.

[56] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. Арк. 199 – 203.

памяркоўнага крыла[57]. Пра ўдзел Клаўдзія Сцяпанавіча ў БПС-Р распавядаў і Адам Станкевіч[58]. Сам Душэўскі на допытах факт удзелу ў партыі эсэраў адмаўляў[59]. Але "рэчавыя доказы" у матэрыялах следчай справы сведчаць пра іншае. Так, сярод матэрыялаў архіўна-следчай справы ўтрымоўваецца пратакол паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта ад 24 чэрвеня 1919 г., дзе К. Душэўскі пазначаны як сябра БПС-Р[60]. Такім чынам, матэрыялы справы даюць магчымасць дакументальна пацвердзіць сяброўства Клаўдзія Сцяпанавіча ў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

Пра жыццё і дзейнасць К. Душэўскага ў другой палове 1918 г. амаль нічога невядома. Гэты перыяд жыцця Клаўдзія Сцяпанавіча ніхто з даследчыкаў не асвятляе. Матэрыялы архіўна-следчай справы ўтрымоўваюць толькі невялічкую інфармацыю, згодна з якой улетку К. Душэўскі быў прызваны на службу ў камісію па эвакуацыі Петраграда ў якасці старшага спецыяліста, дзе ён прапрацаваў да восені 1918 г.[61]. Можна выказаць здагадку, што ў гэты час Клаўдзій Сцяпанавіч актыўна займаўся і грамадска-палітычнымі справамі, але жадаючы змоўчыць пра гэта, на допытах ён нічога не распавядаў. Дадзены перыяд жыцця Душэўскага патрабуе дадатковага вывучэння.

Вельмі насычаным на падзеі ў жыцці К. Душэўскага з'яўляўся 1919 г. Вядома, што пасля здачы апошніх залікаў і сканчэння Горнага інстытута К. Душэўскі вярнуўся ў Беларусь, дзе ў Мінску ўладкаваўся на працу па атрыманай спецыяльнасці[62]. Матэрыялы следчай справы даюць магчымасць удакладніць прыведзеную інфармацыю. Так, паводле сведчанняў самага К. Душэўскага, дыплома і нават пасведчання аб сканчэнні інстытута ён не атрымаў[63]. Наколькі праўдзіва дадзеная інфармацыя невядома. Тым не менш яна пацвярджаецца даведкай з Цэнтральнага Дзяржаўнага Гістарычнага архіва ў Ленінградзе №00178 ад 14 лютага 1952 г.[64]. У дадзенай даведцы адзначаецца, што К. Душэўскі лічыўся

---

[57] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 129.

[58] Копія пратакола допыта Станкевіча А. 29.09.49. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 245 – 246.

[59] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 28.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 54 – 64.

[60] Копія пратакола паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта. 24.07.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 208 – 209.

[61] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

[62] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 129.

[63] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. Арк. 197 – 198.

[64] Даведка Цэнтральнага Дзяржаўнага Гістарычнага архіва ў Ленінградзе №00178. 14.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 339.

ў спісе студэнтаў Пецярбургскага горнага інстытута ў асенніх семестрах 1913 і 1914 гг. Такім чынам, паўстае пытанне, колькі год у Пецярбургскім горным інстытуце навучаўся Клаўдзій Сцяпанавіч і ці атрымаў ён дыплом? На жаль, іншых звестак, якія маглі б даць адказ, у матэрыялах архіўна-следчай справы не ўтрымоўваецца. Такім чынам, нам прадстаўляюцца новыя факты з біяграфіі К. Душэўскага, якія патрабуюць дадатковага вывучэння. Што датычыцца новага месца працы, то паводле матэрыялаў архіўна-следчай справы, пасля вяртанні ў Беларусь у студзені (па іншай версіі – у сакавіку[65]) 1919 г. Клаўдзій Сцяпанавіч паступіў на працу ў Камісарыят земляробства г. Мінска, дзе атрымаў пасаду губернскага геолага[66]. Працаваў у Камісарыяце К. Душэўскі да красавіка 1919 г.[67].

У красавіку 1919 г. Клаўдзій Сцяпанавіч патрапіў у Вільню. Як адзначаецца ў літаратуры, у гэты перыяд К. Душэўскі праявіў сябе як адзін з лідараў беларускага нацыянальнага руху ў Вільні. У чэрвені 1919 г. ён быў абраны старшынёй Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны, з’яўляўся сябрам Беларускага нацыянальнага камітэта[68], узначальваў Віленскі аддзел Саюза спажывецкіх тавараў Беларускага краю і камітэт Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, удзельнічаў у стварэнні Беларускай вайсковай камісіі[69]. Восенню 1919 г. Душэўскі з’яўляўся дыпламатычным прадстаўніком Беларускай Народнай Рэспублікі ў Прыбалтыцы, у снежні таго ж году быў абраны дзяржаўным сакратаром БНР ва ўрад Вацлава Ластоўскага. Акрамя грамадска-палітычнай дзейнасці у гэты час К. Душэўскі актыўна займаўся і культурна-асветніцкімі справамі. Ён выкладаў ў Віленскай беларускай гімназіі і на беларускіх настаўніцкіх курсах, займаўся выдавецкай дзейнасцю[70].

Матэрыялы архіўна-следчай справы ўтрымоўваюць шмат звестак пра дадзены перыяд жыцця Клаўдзія Сцяпанавіча і дазваляюць асвятліць яго больш падрабязна. Так, паводле матэрыялаў следчай справы, у канцы красавіка 1919 г. К. Душэўскі Камісарыятам земляробства г. Мінска быў камандзіраваны ў Вільню з мэтай набыцця неабходнага для

[65] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 40 – 53.

[66] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

[67] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 189 – 190.

[68] Дуж-Душэўскі Клаўдзій Сцяпанавіч. У: *Беларуская энцыклапедыя*: У 18 т. Т. 6. Рэд.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. Мн., 1998. С. 269.

[69] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 129.

[70] Тамсама. С. 129.

лабараторыі абсталявання[71]. Гэтая паездка Клаўдзія Сцяпанавіча супала з пачаткам ваенных дзеянняў паміж Польшчай і Расіяй. Праз некалькі дзён пасля прыезда ў Вільню горад быў заняты польскімі войскамі. У сувязі з гэтым вярнуцца ў Мінск Душэўскі не змог і таму застаўся жыць ў Вільні.

Амаль адразу Клаўдзій Сцяпанавіч ўладкаваўся на працу ў Саюз кааператываў, дзе працаваў на пасадзе сакратара[72]. Па інфармацыі з матэрыялаў справы можна выказаць здагадку, што гэта праца з'яўлялася асноўным заняткам К. Душэўскага падчас яго знаходжання ў Вільні. Але на колькі гэта інфармацыя адпавядае рэчаіснасці, улічваючы малалікасць звестак, сказаць цяжка. Вядома толькі, што ў Саюзе кааператываў Душэўскі працаваў да ліпеня 1920 г. Матэрыялы следчай справы сведчаць, што акрамя пасады сакратара ў Саюзе кааператываў К. Душэўскі займаў пасаду часовага загадчыка Віленскага аддзелу дадзенага Саюза[73].

Паводле паказанняў К. Душэўскага, 25 мая 1919 г. ён удзельнічаў у з'езде беларусаў Віленшчыны, які адбыўся ў памяшканні былой Віленскай беларускай гімназіі[74]. Сярод удзельнікаў з'езда былі ў асноўным прадстаўнікі БПС-Р, БСДП і беларускіх вайсковых фармаванняў. Сам з'езд праходзіў пад лозунгам поўнай незалежнасці Беларусі. На з'ездзе было прынята шэраг рэзалюцый, у адной з якіх адзначалася неабходнасць фармавання беларускай арміі, асноўнай задачай якой павінна была быць барацьба за незалежнасць. З крытыкай бальшавікоў выступіў і сам К. Душэўскі[75]. Вынікам з'езда было стварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта, старшынёй якога быў абраны Душэўскі[76]. Трэба адзначыць, што пра дадзены факт біяграфіі Клаўдзія Сцяпанавіча дагэтуль яшчэ ніхто не пісаў. Паводле паказанняў Душэўскага, у перыяд свайго старшынства ён склаў шэраг дэкларацый і дамогся сустрэч з рознымі палітычнымі дзеячамі, сярод якіх былі

[71] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 21 – 28.

[72] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 28.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 54 – 64.

[73] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 11.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 83 – 92.

[74] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 29.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 51 – 58.

[75] Выпіска з даклада К. Дуж-Душэўскага аб "Руска-польскім перамір'і і Беларусі". У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 316 – 325.

[76] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 29.02.1952. Арк. 51 – 58.

глава місіі ЗША Маргентаў і Ю. Пілсудскі[77]. Гэты факт біяграфіі Душэўскага таксама нідзе ў літаратуры не азначаецца.

Інфармацыя пра паездку да Пілсудскага ў паказаннях Душэўскага супярэчлівая. Паводле адной з версій, на з'ездзе беларусаў Віленшчыны для перамоў з Пілсудскім наконт польскай палітыкі на беларускіх землях быў абраны камітэт з трох чалавек. Дадзены камітэт узначаліў Душэўскі[78]. Прозвішчы іншых сябраў камітэта Душэўскі не называе. Згодна з іншай версіяй, з'езд упаўнаважыў весці перамовы з Пілсудскім двух чалавек – Душэўскага і Яна Станкевіча[79]. Паводле паказанняў Душэўскага, падчас сустрэчы з Пілсудскім, якая цягнулася прыкладна 20 – 25 хвілін, ім былі агучаны патрабаванні спыніць пераслед беларускай меншасці[80], а таксама перададзены дакумент са спісам арыштаваных, частка з якіх пасля сустрэчы хутка была вызвалена[81]. Паводле іншай інфармацыі, на сустрэчы абмяркоўвалася магчымасць далучэння беларускіх земляў у склад Польшчы[82]. Праверыць дакладнасць абодвух версій іншыя матэрыялы справы не дазваляюць. Адзінае, што трэба адзначыць, сам Клаўдзій Сцяпанавіч не з'яўляўся прыхільнікам прапольскай арыентацыі[83]. Гэты факт сведчыць не на карысць апошняй версіі.

Пра сустрэчу з главой місіі ЗША ў Польшчы інфармацыі таксама вельмі мала. Дакументам, які пацвярджае факт самой сустрэчы, з'яўляецца пратакол паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта[84]. На сустрэчы з Маргентаў, якая адбылася ў жніўні 1919 г., паводле паказанняў Душэўскага, ім была перададзена праграма БНК. Акрамя

---

[77] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 43 – 50.

[78] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 189 – 190.

[79] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.05.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 203 – 208.

[80] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 40 – 53.

[81] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 29 – 39.

[82] Пратакол допыта Якавюка С. 26.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 223 – 225.

[83] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

[84] Копія пратакола паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта. 01.08.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 210.

гэтага на сустрэчы абмяркоўвалася пытанне прамой перадачы ЗША беларускім арганізацыям дабрачынных сродкаў, якія дагэтуль шлі праз польскія арганізацыі[85]. Іншых сведчанняў пра сустрэчу Душэўскага з Маргентаў матэрыялы справы не ўтрымоўваюць.

Паводле матэрыялаў архіўна-следчай справы, 8 чэрвеня 1919 г. на з’ездзе дэлегатаў Віленскага і Гарадзенскага краёў К. Душэўскі быў абраны старшынёй утворанай Цэнтральнай беларускай рады[86]. На гэтай пасадзе ён прабыў да канца лета[87]. Як адзначаў на допытах Душэўскі, галоўнай прычынай сыходу было прапольская арыентацыя арганізацыі. Акрамя гэтага ўдзел ў ЦБРВіГ перашкаджыў Клаўдзію Сцяпанавічу ў яго працы ў Саюзе кааперацыі[88]. Дадзеная інфармацыя пацвярджае звесткі, якія падаюцца пра Душэўскага ў літаратуры.

Інфармацыі пра ўдзел К. Душэўскага ў 1919 г. у Беларускім таварыстве дапамогі пацярпелым ад вайны ў матэрыялах архіўна-следчай справы не ўтрымоўваецца. Амаль адсутнічае інфармацыя і пра ўдзел Клаўдзія Сцяпанавіча ў стварэнні Беларускай вайсковай камісіі. Аднак, у матэрыялах справы мы можам азнаёміцца з візітнай карткай Душэўскага, у якой Клаўдзій Сцяпанавіч прадстаўляецца як віцэ-старшыня Беларускай вайсковай арганізацыі. На допытах Душэўскі гэту інфармацыю аспрэчваў, адзначаючы, што дадзеная арганізацыя існавала, але ён сам у ёй не ўдзельнічаў[89]. Мала інфармацыі ў матэрыялах справы і пра выкладанне Клаўдзія Сцяпанавіча ў Віленскай беларускай гімназіі і на беларускіх настаўніцкіх курсах. Пра гэта мы можам даведаца толькі з яго аўтабіяграфіі, у якой таксама прыводзяцца факты выдавецкай дзейнасці Душэўскага. На допытах, Клаўдзій Сцяпанавіч адзначаў, што з мэтай выдання беларускіх падручнікаў для школ хацеў арганізаваць выдавецтва, але па прычыне адсутнасці фінансавых сродкаў ідэю рэалізаваць не ўдалося[90]. Аднак візітная картка Душэўскага, у якой ён прадстаўляецца старшынёй выдавецкага таварыства “Веда”, сведчыць пра іншае. Такім чынам, матэрыялы

[85] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 43 – 50.

[86] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

[87] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 153 – 156.

[88] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 29 – 39.

[89] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 10.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 78 – 82.

[90] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 11.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 83 – 92.

справы дазваляюць нам пазнаёміцца з візітоўкамі Клаўдзія Сцяпанавіча, адна з якіх пацвярджае ўдзел Душэўскага ў фармаванні Беларускай вайсковай камісіі з ўдакладненнем пасады, другая – сведчыць пра арганізацыю і старшынства Клаўдзія Сцяпанавіча ў выдавецкім таварыстве "Веда". Дадзеныя звесткі таксама нікім з гісторыкаў не асвятляліся.

Увосень 1919 г., паводле паказанняў Душэўскага, падчас свайго знаходжання ў Варшаве па справам Саюза каператываў ён меў сустрэчу з Антонам Луцкевічам, па выніках якой быў прызначаны прадстаўніком беларускага ўрада ў краінах Балтыі. Гэтую пасаду Душэўскі займаў прыблізна два месяца[91]. Па даручэнню Луцкевіча Душэўскі быў накіраваны на канфэрэнцыю балтыйскіх краін у Тарту з мэтай дамагчыся ад апошніх прызнаньня "дэ-юрэ" за Урадам БНР тэрыторыі Заходняй Беларусі[92]. Паводле паказанняў Душэўскага, на саму канферэнцыю ён не паспеў, але сустрэцца з прадстаўнікамі краін-удзельніц здолеў. На колькі праўдзіва дадзеная інфармацыя сказаць цяжка. Ніякіх іншых звестак пра ўдзел Клаўдзія Сцяпанавіча ў самой канферэнцы ў матэрыялах справы няма. З боку прадстаўнікоў Фінляндыі і Эстоніі Душэўскі атрымаў прызнанне "дэ-факта" Беларускай Народнай Рэспубліцы[93]. Пра гэты факт біяграфіі Клаўдзія Сцяпанавіча ніхто дагэтуль не пісаў. Трэба адзначыць каштоўнасць дадзенай інфармацыі. Згодна з ёй, непасрэдную ролю ў прызнанні БНР Фінляндыяй і Эстоніяй адыграў менавіта Душэўскі.

Яшчэ адным фактам біяграфіі Душэўскага, які ў беларускай гістарыяграфіі нікім не асвятляўся, з'яўляецца афармленне ім перавода атрада Булак-Булаховіча на службу Беларускай Народнай Рэспублікі. Паводле паказанняў Душэўскага, у Тарту адбылася сустрэча паміж ім, Езавітавым і Булак-Булаховічам. У выніку перамоў ад імя ураду БНР ён аформіў перавод Булак-Булаховіча на службу БНР[94]. Гэтую інфармацыю цалкам пацвярджаў у сваіх паказаннях і К. Езавітаў[95]. "Па гэтаму пытанню была заключана адмысловая дамова аб тым, што затрачаныя сумы эстонскім урадам на ўтрыманне атрада

[91] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 15.

[92] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 65 – 75.

[93] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 29 – 39.

[94] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 07.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 149 – 152.

[95] Копія пратакола допыта Езавітава К. 19.02.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 233 – 240.

Булак-Булаховіча будуць лічыцца пазыкай Беларусі і падлягаюць вяртанню ў будучым. Дамову гэту падпісалі ад імя эстонскага ўрада міністр замежных спраў Пін і генерал Лайдонэр, а ад імя урада БНР – я (К. Езавітаў – прым. аўт.), як шэф вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Прыбалтыке і надзвычайны пасол Клаўдзій Дуж-Душэўскі”. Акрамя самога факту падпісання дамовы паміж урадамі Эстоніі і БНР аб пераводзе атрада Була-Булаховіча і непасрэдным удзеле ў гэтым Душэўскага, дадзеныя сведчанні даюць магчымасць пацвердіць прызнанне Эстоніяй БНР “дэ-юрэ”. Як бачна, матэрыялы архіўна-следчай справы ўводзяць у навуковы абарот новыя, невядомыя дагэтуль факты.

Прыблізна ў той жа час, паводле матэрыялаў следства, па даручэнню Луцкевіча Душэўскі сустрэўся і з прадстаўніком Савецкай улады Літвінавым[96]. Паводле слоў Душэўскага, ад імя ўрада Луцкевіча ён перадаў Літвінаву, “што беларускае грамадскае меркаваньне не на баку палякаў” і запытаў пра магчымыя формы супрацоўніцтва з Савецім урадам, на што Літвінаў адназначнага адказу не даў. Ніякай іншай інфармацыі пра сустрэчу з Літвінавым матэрыялы следства не ўтрымоўваюць. Дадзены факт біяграфіі Душэўскага ў літаратуры таксама нікім яшчэ не асвятляўся.

На допытах Душэўскі адзначаў, што падчас свайго прыбывання ў Тарту на з’ездзе беларускіх партый у Мінску ён быў завочна абраны дзяржаўным сакратаром урада БНР, які ўзначаліў Вацлаў Ластоўскі[97]. Пра абранне на гэтую пасаду Душэўскі даведаўся ад Ластоўскага толькі ў 1920 г.[98]. Як сведчыў Клаўдзій Сцяпанавіч, на пасадзе дзяржаўнага сакратара ён юрыдычна лічыўся з 1919 г. па вясну 1921 г. У адзначаны перыяд практычны ўдзел ва ўрадзе ён прымаў толькі на працягу двух-трох месяцаў у 1921 г. Гэта, як адзначаў Душэўскі, было звязана з тым, што ўрад Ластоўскага знаходзіўся ў Рызе і толькі ў 1921 г. пераехаў у Коўна. Як вядома, дадзеныя паказанні Клаўдзія Сцяпанавіча не адпавядаюць рэчаіснасці. У верасні 1920 г. Душэўскі прыняў удзел у канферэнцыі ў Празе, дзе абмяркоўвалася пытанне польскай акупацыі Віленскага краю[99]. 20 кастрычніка 1920 г.

---

[96] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 29 – 39.

[97] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.05.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 203 – 208.

[98] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 76 – 85.

[99] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 97 – 99.

Душэўскі удзельнічаў у Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі[100] у Рызе, якая праводзілася пад кіраўніцтвам Рады БНР. Гэтыя сведчанні дазваляюць казаць пра ўдзел Душэўскга ў працы Рады БНР ужо ў 1920 г.

У ліпені 1920 г. Вільню захапілі савецкія войскі. У гэты час Душэўскі вярнуўся у Мінск на былое месца працы, дзе хадайнічаў пра перавод у Вільню, на што атрымаў згоду. Па прыездзе ў ліпені 1920 г. з Мінска ў Вільню К. Душэўскага стаў сябрам Рэвалюцыйнага камітэта, які быў створаны для аднаўлення ў Вільні савецкай улады. У Рэвалюцыйным камітэце Душэўскі працаваў загадчыкам Галоўнага ўпраўлення паліва[101]. Гэту пасаду ён займаў прыкладна два з паловай месяца да заняцця ў верасні Вільні палякамі. Дадзеная інфармацыя таксама з’яўляецца новай. Пра працу Клаўдзія Сцяпанавіча ў Рэвалюцыйным камітэце ніхто з даследчыкаў не ўзгадвае.

У красавіку 1920 г., як ужо адзначалася вышэй, К. Душэўскі прыняў удзел у Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі ў Рызе, дзе выступіў з жорсткай крытыкай савецка-польскіх перамоў[102]. Пасля вяртання з канферэнцыі ў 1921 г. за актыўную беларускую дзейнасць ён быў арыштаваны ўладамі і заключаны ў Лукішскую турму, дзе ўтрымліваўся каля трох тыдняў. Пасля вызвалення 7 лютага з турмы Душэўскі, паводле асабістых паказанняў, вырашыў, каб пазбегнуць далейшых рэпрэсіяў, пакінуць Вільню і з’ехаў у Літву ў Коўна, куды даехаць яму дапамог знаёмы габрэйскі купец Ютан[103]. Пра іншую версіі выезда Клаўдзія Сцяпанавіча ў Коўна на допытах распавядаў Адам Станкевіч. Паводле яго слоў, Душэўскі быў высланы разам з 33 іншымі беларусамі і літоўцамі ў Літву як “непажаданы элемент”[104]. Такім чынам, матэрыялы справы дазваляюць пазнаёміцца з двумя версіямі выезда Клаўдзія Сцяпанавіча ў Літву.

### 2.4. Ковенскі перыяд

---

[100] Копія рэзалюцыі Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі. 20.10.1920. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 326 – 327.

[101] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 28.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 54 – 64.

[102] Выпіска з даклада К. Дуж-Душэўскага аб “Руска-польскім перамір’і і Беларусі”. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 316 – 325.

[103] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 21 – 28.

[104] Копія пратакола допыта Станкевіча А. 29.09.49. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 245 – 246.

У 1921 г. пачаўся новы этап жыцця К. Душэўскага, звязаны з пераездам Клаўдзія Сцяпанавіча на сталае жыццё ў Коўна. У літаратуры інфармацыі пра першыя гады жыцця Душэўскага ў Літве вельмі мала. Часам інфармацыя, якая падаецца выглядае супярэчлівай. Так, па адной з версіяў да 1923 г. дзейнасць Душэўскага была звязана з працай у Радзе БНР[105]. С. Рудовіч піша, што першыя гады да 1924 г. Душэўскі працаваў у Міністэрстве беларускіх спраў[106]. Акрамя гэтага вядома, што ў 1922 г. Душэўскі рэдагаваў штомесячнік “Беларускі сцяг”, з 1923 па 1927 г. разам з В. Ластоўскім выдаваў часопіс “Крывіч”, у 1933 г. часопіс “Беларускі асяродак”. З 1923 па 1939 г. Душэўскі з’яўляўся адным з кіраўніком Беларускага Цэнтра ў Літве і Літоўска-Беларускага Таварыства, працаваў у Міністэрстве замежных спраў і Міністэрстве сувязі Літвы. У 1927 г. Клаўдзій Сцяпанавіч скончыў Літоўскі універсітэт і атрымаў дыплом па спецыяльнасці інжынер-будаўнік. Па праектах Душэўскага было пабудавана шмат розных будынкаў па ўсёй Літве.

Матэрыялы архіўна-следчай справы дазваляюць асвятліць ковенскі перыяд жыцця Клаўдзія Сцяпанавіча больш падрабязна. Паводле матэрыялаў следчай справы, па прыбыцці ў Літву Душэўскі прыняў літоўскае грамадзянства. На допытах у 1941 г. ён адзначаў, што менавіта пры атрыманні літоўскага пашпарта яго прозвішча стала гучаць як Дуж-Душэўскі[107]. Гэта інфармацыя супярэчыць паказанням Душэўскага, якія ён даваў пазней. Так, на допытах у 1952 г. Клаўдзій Сцяпанавіч адзначаў, што двайное прозвішча ў яго было ад бацькі і пры атрыманні пашпарта ў 1912 г. ён ужо значыўся як Дуж-Душэўскі[108]. Але на карысць першай версіі сведчыць шэраг дакументаў, у якіх да 1921 г. прозвішча Клаўдзія Сцяпанавіч значыцца як Душэўскі. Дадзенае пытанне патрабуе дадатковага вывучэння.

Пра першыя два гады прыбывання Душэўскага ў Коўна, матэрыялы следства амаль нічога не распавядаюць. Можна выказаць здагадку, што гэта звязана з жаданнем Душэўскага змоўчыць пра свой удзел у Радзе БНР. Магчыма, спробуючы дыстанцыявацца ад Рады і прыменшыць сваю ролю ў яе дзейнасці, Клаўдзій Сцяпанавіч пра гэты час амаль нічога не распавядаў. Свой ўдзел у працы ўрада Ластоўскага ён абмяжоўваў толькі

---

105 ВАБІШЭВІЧ, А. Аляксандр Цвікевіч (1883 - 1937). У: *Białoruskie Zeszyty Historyczne*. [інтэрактыўны]. 2000. №14. [прагледжана 27 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/bzh/14/spis14.htm>.

106 РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 129.

107 Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 21 – 28.

108 Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 120 – 121.

першымі месяцамі 1921 г.[109]. Гэта, як вядома з літаратуры, не адпавядае рэчаіснасці. Пра далейшы перыяд жыцця Клаўдзія Сцяпанавіча інфармацыі ў матэрыялах справы больш. У 1922 г. К. Душэўскі выдаваў і рэдагаваў часопіс "Беларускі сцяг", у 1923 г. паступіў на службу ў Міністэрства замежных спраў Літвы, дзе працаваў у беларускім аддзеле[110]. У міністэрстве, як адзначаецца ў аўтабіяграфіі Душэўскага, ён займаў "звышштацкую пасаду 13 катэгорыі"[111].

Амаль адначасова з паступленнем на працу ў МЗС Клаўдзій Сцяпанавіч увайшоў у склад Беларускага Цэнтра ў Літве, дзе кіраваў выдавецкай справай Цэнтра. Паводле сведчанняў Душэўскага, Беларускім Цэнтрам было выпушчана шэраг кніг, надрукавана вялікая колькасць артыкулаў аб Беларусі і беларускай культуры[112]. Ацэньваючы сваю працу, Душэўскі адзначаў, што асабіста ён напісаў і выдаў на беларускай мове шмат кніг па гісторыі, матэматыцы і прыродазнаўстве, кіраваў часовымі беларускімі курсамі, чытаў лекцыі па радыё[113]. Акрамя гэтага, працуючы ў Беларускім Цэнтры, разам з В. Ластоўскім К. Душэўскі ў 1923 – 1927 гг. выдаваў часопіс "Крывіч". Пасля ад'езду ў 1927 г. у БССР В. Ластоўскага праца Цэнтра прыпынілася. Паводле слоў К. Душэўскага, да свайго сыходу з працы ў БЦ і МЗС Літвы ў 1929 г. ён яшчэ займаўся падрыхтоўкай рукапісаў, але выдаць іх яму так і не прыйшлося[114]. Як бачна з прыведзеных звестак, матэрыялы справы дазваляюць нам пацвердзіць факт працы Клаўдзія Сцяпанавіча ў МЗС Літвы і БЦ, а таксама даюць магчымасць пазнаёміцца з ацэнкай ім асабістай працы. На жаль, спісу ці назваў асобных кніг, выдадзеных Душэўскім ў гэты перыяд на беларускай мове, матэрыялы архіўна-следчай справы не ўтрымоўваюць. Дадзеная інфармацыя б была вельмі каштоўнай для вывучэння выдавецкай дзейнасці Клаўдзія Сцяпанавіча ў Літве.

Не пакідаючы працы Душэўскі працягнуў і сваё навучанне. У 1924 г. ён паступіў у Літоўскі універсітэт, дзе вучыўся на тэхнічным факультэце. У 1927 г. Клаўдзій Сцяпанавіч

---

[109] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

[110] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

[111] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

[112] Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага "Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…". 01.05.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-11 – 15.

[113] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. Арк. 199 – 203.

[114] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. Арк. 209 – 213.

скончыў навучанне ва універсітэце і атрымаў дыплом інжынера-будаўніка[115]. Пасля зыходу ў 1929 г. з Міністэрства замежных спраў Душэўскі пайшоў працаваць па атрыманай спецыяльнасці. У 1930 г. Клаўдзій Сцяпанавіч быў запрошаны ў акцыянернае таварыства "Майстас" на пасаду тэхнічнага дырэктара і будаўніка халадзільнікаў. Як адзначаў у аўтабіяграфіі Душэўскі, падчас працы на дадзенай пасадзе, ён пабудаваў беконную фабрыку ў Панявежысе і Коўна, масляны халадзільнік у Клайпедзе, спраектаваў і пабудаваў у Коўна фабрыку па апрацоўке кішак, а таксама свінарнік на 1000 галоў свіней, разам з фірмай "Франц Крул" спраектаваў новую беконную фабрыку ў Таўраге і Шаўляе і іншае (гл. дадатак 1). Паводле слоў Клаўдзія Сцяпанавіча, у вынікуператамлення на працы ён моцна захварэў, таму быў вымушаны звольніцца і ў тым жа 1930 г. перайшоў на працу ў Міністэрства сувязі. Прыведзеная інфармацыя дазваляе асвяціць прафесійную дзейнасць Душэўскага больш падрабязна.

У аўтабіяграфіі Душэўскі адзначае, што, паступіўшы ў Міністэрства сувязі, ён атрымаў пасаду рэферэнта па будаўніцтву паштовага кіравання. Паводле іншай інфармацыі, Клаўдзій Сцяпанавіч атрымаў пасаду начальніка будаўніча-гаспадарчага аддзела[116]. Якую пасаду дакладна займаў Душэўскі невядома. З-за адсутнасці іншых матэрыялаў, якія маглі б асвятліць дадзеные пытанне, яно застаецца адкрытым. За перыяд працы ў міністэрстве Душэўскі спраектаваў шмат будынкаў у розных гарадах Літвы. Сярод яго праектаў трэба адзначыць шэраг жылых дамоў у Коўна, кінатэатр "Метрапалітэн" у Коўна, будынак пошты ў Расеняй, будынак пошты аўтаномнай тэлеграфнай станцыі ў Шанчай і іншае (гл. дататак 2). У Міністэрстве Сувязі Душэўскі прапрацаваў да свайго арышту ў 1940 г. Прыведзеныя звесткі даюць інфармацыю пра займаемыя Душэўскім пасады. Пра некаторыя пабудовы, спраектаваныя К. Душэўскім ужо раней пісаў С. Рудовіч[117].

Працуючы ў Міністэрстве сувязі Літвы, Клаўдзій Сцяпанавіч не пакінуў і грамадскай дзейнасці. У 1932 г. Душэўскі з'яўляўся адным з ініцыятараў стварэння Літоўска-Беларускага Таварыства[118]. У 1933 г. ён аднавіў Беларускі Цэнтр, кіраўніком

---

[115] Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

[116] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 189 – 190.

[117] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 130.

[118] Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага "Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…". 01.05.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-11 – 15.

якога з’яўляўся да 1939 г.[119]. Пра сваю дзейнасць у Беларускім Цэнтры у гэты час Клаўдзій Сцяпанавіч на допытах распавядаў вельмі мала. У гэты ж перыяд Душэўскі прымаў удзел у дзейнасці Саюза інжынераў Літвы, быў адным з ініцыатараў і рэдактараў часопіса “Тэхніка і гаспадарка”, удзельнічаў у працы дзяржаўнага радыёкамітэта, выдаў шэраг кніг на літоўскай мове (гл. дадатак 2). Дадзеная інфармацыя нідзе ў літаратуры не адзначаецца, таму з’яўляецца новай у апісанні біяграфіі К. Душэўскага. Як бачна, інфармацыі пра грамадскую дзейнасць Клаўдзія Сцяпанавіча ў 30-х гг. вельмі мала. Магчыма, гэта звязана з паступовым адыходам Душэўска ад актыўнай грамадскай працы і засяроджаннем на прафесійнай дзейнасці. На карысць гэтага тлумачэння можа сведчыць значная колькасць спраектаваных Душэўскім у гэты час пабудоў.

### 2.5. Апошнія гады жыцця

Пра апошнія гады жыцця К. Душэўскага найбольш поўную інфармацыю з наяўнай літаратуры дае артыкул С. Рудовіча “Палітык, асветнік, дойлід”[120]. Так, спасылаючыся на словы сына Душэўскага – Сцяпана, Рудовіч піша наступнае. З прыходам савецкай улады ў жніўні 1940 г. Душэўскі быў арыштаваны і зняволены ў Ковенскую турму. Вызваліцца з турмы ён змог толькі з прыходам немцаў у 1941 г. Пасля вызвалення Клаўдзій Сцяпанавіч уладкаваўся на працу на завод гумавых вырабаў “Інкарас”, дзе заняў пасаду інжынера. У 1943 г. Душэўскі разам з жонкай быў арыштаваны немцамі за ўкрыццё жанчыны габрэйскай нацыянальнасці і яе сына і адпраўлены ў канцэнтрацыйны лагер у Правянішкесе. Дзякуючы дапамозе сяброў з лагера ён быў вызвалены. З 1944 па 1946 г. Душэўскі працаваў дацэнтам Ковенскага універсітэта. У снежні 1946 г. па абвінавачанню ў контрэвалюцыйнай дзейнасці ён быў арыштаваны. Але следству не ўдалося даказаць віну Душэўскага і ў 1947 г. яго вызвалілі. У перыяд паміж арыштамі К. Душэўскі працаваў у інстытуце “Літбудпраект”. У 1952 г. Клаўдзій Сцяпанавіч зноў быў арыштаваны, але на гэты раз быў асуджаны на 25 год пазбаўлення волі. Пасля смерці Сталіна тэрмін быў скарочаны да 10 год, але па стану здароўя Душэўскі быў вызвалены раней – у 1955 г. Памёр Клаўдзій Сцяпанавіч 25 лютага 1959 г. у Коўна, дзе і пахаваны на Петрашунскіх могілках.

[119] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 191.

[120] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 130.

Матэрыялы архіўна-следчай справы шмат у чым пацвярджаюць дадзеную інфармацыю і даюць нам новыя звесткі пра дадзены этап жыцця К. Душэўскага. З прыходам савецкай улады 9 чэрвеня 1940 г. Клаўдзій Сцяпанавіч быў арыштаваны. Прычынай арышту было абвінавачванне ў контррэвалюцыйнай дзейнасці па арт. 58 п. 13 УК РСФСР[121]. У Ковенскай турме Душэўскі ўтрымліваўся да 22 чэрвеня 1941 г.[122]. Паводле паказанняў Клаўдзія Сцяпанавіча, у выніку адыхода савецкай арміі турма засталася без аховы, што дазволіла зняволеным выбіць дзверы і выйсці на волю. Пасля выхаду з турмы Душэўскі амаль паўтара месяца знаходзіўся дома па прычыне слабасці здароўя. Праз некаторы час ён ўладкаваўся на працу на фабрыку “Інкарас”[123]. Звесткі пра працу Душэўскага на фабрыцы супярэчлівыя. Так, паводле паказанняў самаго Душэўскага, на фабрыцы ён працаваў на пасадзе галоўнага інжынера, але часам замяшчаў на пасадзе дырэктара.[124] Паводле інфармацыі, якая прыводіцца сведкамі, пасля звальнення немцамі з пасады дырэктара фабрыцы Ігнаса Гасцілы, дырэктарам быў прызначаны Душэўскі. Пра гэта сведчылі як бугалтар фабрыкі Владас Пяткавючас[125], так і сам былы дырэктар Ігнас Гасціла[126]. На жаль, ніякіх іншых сведчанняў ці дакументаў, якія маглі б пацвердзіць дадзеныя паказанні ў матэрыялах справы няма. Пра гэты факт біяграфіі Душэўскага даследчыкі не распавядаюць.

З матэрыялаў справы мы можам даведацца, што падчас вайны ў Клаўдзія Сцяпанавіча былі кантакты з дзеячамі беларускага нацыянальнага руху. У канцы 1941 г. падчас наведання Вільні Душэўскі меў сустрэчу з прафесарам Вацлавам Іваноўскім, які прапанаваў яму пасаду намесніка бургамістра Мінска[127]. З прапановай працы ў Мінску увосень 1942 г. да Клаўдзія Сцяпанавіча звяртаўся і Ермачэнка. На сустрэчы, якая адбылася на кватэры Душэўскага ў Коўна, Ермачэнка ад імя В. Іваноўскага таксама

---

[121] Пастанова аб абранні меры прысячэння. 30.09.40. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 9 – 10.

[122] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 30.11.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 13 – 14.

[123] Тамсама. Арк. 13 – 14.

[124] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 24.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 116 – 119.

[125] Пратакол допыта Пяткавічуса В. 27.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 157 – 159.

[126] Пратакол допыта Гасцілы І. 21.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 172 – 174.

[127] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 14.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 117 – 125.

прапанаваў Душэўскаму стаць намеснікам бургамістра Мінска[128]. Як адзначаў на допытах Клаўдзій Сцяпанавіч, ад пасады ён адмовіўся, спаслаўшыся на стан здароўся. Матэрыялы справы даюць магчымасць пазнаёміцца з архіўнай выпіскай са спісу сябраў Беларускага навукова таварыста[129], дзе Душэўскі пазначаны як сябра тэхнічнай секцыі таварыства. Сам Душэўскі на допытах сваё сяброўства ў дадзенай арганізацыі адмаўляў, спасылаючыся на тое, што ў дадзены спіс яго памылкова мог унесці В. Іваноўскі[130]. Прыведзеныя звесткі нідзе раней у біяграфіі Клаўдзія Сцяпанавіча не адзначаліся і патрабуюць дадатковай праверкі.

Падчас нямецкай акупацыі, паводле сведчанняў Душэўскага, на працягу 16 месяцаў ён укрываў на сваёй кватэры жанчыну габрэйскай нацыянальнасці – Еву Барысаўну Гаўронскую і яе васьмігадовага сына, а таксама дзесяцігадовага хлопчыка па прозвішчу Біндэр[131]. Па даносу ў жніўні 1943 г. за гэта ён быў арыштаваны, зняволены ў турму, а пасля адпраўлены ў канцэнтрацыйны лагер у Правянішкісе [132]. У лагеры Душэўскі прабыў каля чатырох месяцаў, пасля чаго пры дапамозе знаёмых з Тарфянога трэста як спецыялісту-інжынеру яму атрымалася вызваліцца[133]. Пасля вызвалення Душэўскі ўладкаваўся на працу ў Тарфяны трэст, дзе на пасадзе інжынера-будаўніка прапрацаваў да канца снежня 1944 г.[134]. У студзені 1945 г. Клаўдзій Сцяпанавіч перайшоў на працу ў Ковенскі ўніверсітэт на будаўнічы факультэт, дзе атрымаў пасаду загадчыка кафедры “Гісторыі архітэктуры”[135]. Ва універсітэце Душэўскі працаваў да восені 1946 г.

Як бачна, матэрыялы справы даюць магчымасць даведацца дакладнае імя жанчыны і колькасць чалавек, якіх падчас нямецкай акупацыі ўкрываў Клаўдзій Сцяпанавіч. Новай з’яўляецца інфармацыя пра абставіны вызвалення Душэскага з канцэнтрацыйнага лагера і

---

[128] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 126 – 133.

[129] Выпіска са спісу сябраў Беларускага навуковага таварыства. 01.03.1944. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 222.

[130] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 11.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 83 – 92.

[131] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 28.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 142 – 147.

[132] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 30.11.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 13 – 14.

[133] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 28.04.1947. Арк. 142 – 147.

[134] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.04.1947. Арк. 126 – 133.

[135] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 30.11.1946. Арк. 13 – 14.

далейшае месца яго працы. Дадзеныя факты дазваляюць больш падрабязна асвятліць біяграфію Клаўдзія Сцяпанавіча ў дадзены перыяд.

У снежні 1946 г. К. Душэўскі быў арыштаваны і абвінавачваны па арт. 58 п. 13 УК РСФСР. Следства вялося амаль два гады. Матэрыялы следства ўтрымоўваюць дастаткова доказаў "антысавецкай дзейнасці" Душэўскага, але тым не менш, у 1947 г. ён быў прызнаны невінаватым і вызвалены[136]. Можна выказаць версію, што такое вызваленне было звязана з умяшальніцтвам дэпутатаў Вярхоўнага Савета ЛССР. Так, сярод матэрыялаў архіўна-следчай справы мы можам азнаёміцца з лістом дэпутата Зігмаса Жэмайціса да Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета ЛССР з просьбай аб саздзейнічанні ў вызваленні Душэўскага[137]. Пра дадзены зварот ніхто з даследчыкаў не пісаў. Іншай версіяй можа быць заступства за Клаўдзія Сцяпанавіча іншых людзей, у справе не пазначаных. Увогуле, трэба адзначыць, што матэрыялы архіўна-следчай справы канчатковага адказу на пытанне, хто заступіўся за К. Душэўскага ці што стала прычынай яго вызвалення, не даюць. Гэты факт біяграфіі Душэўскага патрабуе дадатковага вывучэння.

Пра жыццё Клаўдзія Сцяпанавіча ў перыяд паміж арыштамі ў матэрыялах архіўна-следчай справы інфармацыі амаль няма. Вядома, што у дадзены перыяд Душэўскі працаваў у інстытуце "Літбудпраект". У матэрыялах справы мы можам пазнаёміцца са спісам будынкаў, якія былі спраектаваны ў гэты час Душэўскім. Так, па праектам Клаўдзія Сцяпанавіча было пабудавана некалькі фабрык і заводаў, сярод якіх "Пяргале", "Нямунас" і "Альгітас" ў Коўна, "Жальгерыс" у Новай-Вільні і "Кайтра" у Лейнтварысе[138]. Пра тое, што Клаўдзій Сцяпанавіч спраектаваў кандытарскую фабрыку "Пяргале" і завод "Жальгеріс" пісаў С. Рудовіч[139]. Астатняя інфармацыя з'яўляецца новай.

У 1952 г. К. Душэўскі быў зноўку арыштаваны і абвінавачаны па арт. 58 п. 13 і 58-10 частка ІІ-я УК РСФСР[140]. С. Рудовіч памылкова адзначаў, што Душэўскі быў арыштаваны 14 траўня. Але матэрыялы следства даюць магчымасць удакладніць гэту

---

[136] Пастанова аб сканчэнні ўгалоўнага пераследу і вызваленні з-пад варты. 08.05.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 242 – 244.

[137] Заява дэпутата З. Жэмайціса Старшыне Прэзідыума Вярхоўнага Савета ЛССР. 20.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 245-3.

[138] Спіс спраектаваных К. Дуж-Душэўскім будынкаў у Літве. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 228-1.

[139] РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. С. 130.

[140] Абвінаваўчае заключэнне па следчай справе №19097. 12.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 347 – 353.

дату. Клаўдзій Сцяпанавіч быў арыштаваны 28 лютага 1952 г.[141], а 14 траўня адбыўся суд. Так, па вынікам заключнага абвінавачвання следства (гл. дадатак 3) К. Душэўскі па прыгавору Віленскага абласнога суда 14 траўня 1952 г. быў асуджаны на 25 год[142]. 7 кастрычніка 1954 г. рашэннем Прэзідыума Верхоўнага Суда ЛССР тэрмін заключэння быў зменшаны да 10 год[143]. З літаратуры вядома, што ў 1955 г. Душэўскі быў вызвалены. Але ніякіх матэрыялаў, якія б сведчылі пра датэрміновае вызваленне Клаўдзія Сцяпанавіча ў 1955 г., архіўна-следчая справа не ўтрымоўвае.

Як бачна, матэрыялы архіўна-следчай справы ўтрымоўваюць шмат інфармацыі пра жыццё і дзейнасць К. Душэўскага. Сярод звестак, якія ўтрымоўваюцца ў матэрыялах справы трэба адзначыць інфармацыю пра сям'ю, грамадска-палітычную, культурна-асветніцкую і прафесійную дзейнасць.

Нягледзячы на тое, што следчыя надавалі высвятленню грамадска-палітычнай дзейнасці К. Душэўскага найбольшую ўвагу, значная частка інфармацыі пра ўдзел Душэўскага ў грамадска-палітычным жыцці ў матэрыялах справы адсутнічае. Гэта можна патлумачыць жаданнем Клаўдзія Сцяпанавіча не асвятляць шматлікія факты сваёй дзейнасці перад следствам для таго, каб пазбегнуць суровага пакарання. Тым не менш, акрамя пацвярджэння шэрагу фактаў з біяграфіі Душэўскага мы можам даведацца пра яго старшынства ў БНК у Вільні, старшынства на Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі ў Рызе, сустрэчы ў складзе дэлегацыі з міністрам нямецкага ўрада М. Эрсбергам, главой місіі ЗША ў Польшчы Маргентаў, Ю. Пілсудскім і Літвінавым і інш. Новым, неасветленым дагэтуль у літаратуры з'яўляецца факт афармлення Душэўскім перавода атрада Булак-Булаховіча на службу БНР. Каштоўнай з'яўляецца інфармацыя пра ролю Клаўдзія Сцяпанавіча ў прызнанні Фінляндыяй і Эстоніяй "дэ-факта" Беларускай Народнай Рэспублікі. Нідзе ў беларускай гістарыяграфіі не згадваецца пра ўдзел Душэўскага і ў Беларускім навуковым таварыстве. Асобна трэба адзначыць пацвярджэнне гіпотэзы аб аўтарстве Душэўскага эскіза бел-чырвона-белага сцяга.

Інфармацыя пра культурна-асветніцкую і прафесійную дзейнасць Душэўскага ў меншай ступені цікавіла следчых, але ў матэрыялах архіўна-следчай справы мы можам знайсці звесткі і пра гэтыя сферы жыцця Клаўдзія Сцяпанавіча. Акрамя пацвярджэння

---

[141] Абвінаваўчае заключэнне па следчай справе №19097. 12.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 347 – 353.

[142] Прыгавор Віленскага абласнога суда. 14.05.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 374 – 375.

[143] Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Суда ЛССР. 07.10.1954. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 407 – 409.

шэрагу вядомых фактаў культурна-асветніцкай і прафесійнай дзейнасці Душэўскага мы можам пазнаёміцца і з новымі. Так, у матэрыялах справы мы можам больш дакладна даведацца пра месцы працы і пасады, якія займаў К. Душэўскі, пазнаёміцца са спісам будынкаў, якія ім былі спраектаваны. Што тычыцца культурна-асветніцкай дзейнасці Душэўскага, то сярод новай інфармацыяй трэба адзначыць новыя факты яго культурніцкай дзейнасць у Пецярбурзе, арганізацыю выдавецкага таварыства “Веда” у Вільні, некаторыя звесткі пра выдавецкую дзейнасць у Літве падчас працы ў БЦ і іншае.

Такім чынам, матэрыялы архіўна-следчай справы дазваляюць нам не толькі пацвердзіць шырока вядомыя звесткі з біяграфіі Душэўскага, але і пазнаёміцца з новымі, дагэтуль невядомымі фактамі яго жыцця. Асаблівую каштоўнасць прадстаўленай біяграфічнай інфармацыі надае і той факт, што значная частка была атрымана ад самаго Клаўдзія Сцяпанавіча.

# 3. БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У ЛІТВЕ (1921 – 1939 ГГ.) ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ АРХІЎНА-СЛЕДЧАЙ СПРАВЫ

Акрамя інфармацыі пра жыццё і дзейнасць К. Дуж-Душэўскага архіўна-следчая справа ўтрымоўвае шэраг крыніц, якія распавядаюць нам пра беларускі нацыянальны рух пачатку XX ст. Так, сярод звестак, якія ўтрымоўваюцца ў справе, мы можам азнаёміцца з інфармацыяй пра Раду БНР, Беларускі Цэнтр (БЦ), Беларускае Культурна-Прасветнае Таварыства (БКПТ) і іншыя беларускія арганізацыі, якія дзейнічалі ў Літве ў перыяд з 1921 па 1939 г. Улічваючы адсутнасць у беларускай гістарыяграфіі грунтоўных даследаванняў па беларускаму нацыянальнаму руху ў Літве, матэрыялы, якія ўтрымоўвае архіўна-следчая справы, могуць быць карыснымі для даследчыкаў.

## 3.1. Урад БНР Вацлава Ластоўскага

Сярод інфармацыі пра беларускі нацыянальны рух у Літве асобна трэба вылучыць сведчанні К. Душэўскага пра дзейнасць Рады БНР. Асобных даследаванняў, прысвечаных Радзе БНР падчас яе знаходжання ў Літве няма. Таму сведчанні К. Душэўскага маюць асаблівую каштоўнасць. Так, паводле паказанняў Клаўдзія Сцяпанавіча, у снежні 1919 г. у Мінску на беларускім з’ездзе палітычных партый ён завочна быў абраны ва ўрад БНР[144]. Дадзены ўрад узначаліў В. Ластоўскі, К. Душэўскі атрымаў пасаду дзяржаўнага сакратара. Пра абранне і склад урада, як адзначаў Душэўскі, ён даведаўся ад В. Ластоўскага толькі ў пачатку 1920 г. і да пераезду ўрада ў Коўна ў 1921 г. фактычнага ўдзелу ў ім не прымаў[145]. Свой фактычны ўдзел ва ўрадзе БНР Клаўдзій Сцяпанавіч абмяжоўваў некалькімі месяцамі пачатку 1921 г.[146]. Таму амаль ніякай інфармацыі пра дзейнасць урада Ластоўскага да пераезда ў Коўна на допытах ён не распавядаў.

Як бачна з паказанняў К. Душэўскага, на допытах ён спрабаваў зменшыць сваю ролю ў дзейнасці Рады БНР, абмяжоўваючы яе некалькімі месяцамі. Сведчанні В. Ластоўскага і інфармацыя якая ўтрымоўваецца ў матэрыялах справы, абвяргае дадзеныя

[144] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.05.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 203 – 208.

[145] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 76 – 85.

[146] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

паказанні. Так, пад рэзалюцыяй, якая была прынята на Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі 20 кастрычніка 1920 г. у Рызе, К. Душэўскі пазначаны як старшыня[147]. Як вядома, дадзеная канферэнцыя праводзілася пад кіраўніцтвам Рады БНР. Як бачна ўжо ў той час Клаўдзій Сцяпанавіч прымаў непасрэдны ўдзел у працы ўрада. Паказанні В. Ластоўскага, сведчаць, што К. Душэўскі ўваходзіў у склад Рады да 1923 г.[148]. Пра гэта ж сведчаць і інфармацыя ў літаратуры, згодна якой, В. Ластоўскі і К. Дуж-Душэўскі сышлі з Рады БНР разам у 1923 г.[149].

Паводле паказанняў К. Душэўскага, першы раз з сябрамі Рады ён сустрэўся ў Коўна ў 1921 г. на адным з пасяджэнняў на кватэры ў В. Ластоўскага ў доме №30 па вуліцы Вітаўта, дзе размяшчаўся сам урад[150]. Да гэтага, як адзначаў Душэўскі, з большасцю сяброў ён быў не знаёмы. Так, менавіта на пасяджэннях ён упершыню пазнаёміўся з Грыбам, Вальковічам, Захаркам, Крэчаўскім і Цвікевічам[151]. Дадзеная інфармацыя падаецца сумніўнай. Улічваючы грамадска-палітычную актыўнасць К. Душэўскага і папярэдні ўдзел у працы ўрада Клаўдзій Сцяпанавіч не мог не ведаць сябраў Рады БНР. Гэтыя няпраўдзівыя паказанні, па майму меркаванню, яшчэ раз сведчаць пра спробу К. Душэўскага зменшыць свой удзел ва ўрадзе Ластоўскага і паказаць адсутнасць шчыльных кантактаў з іншымі беларускімі дзеячамі. Каштоўнай інфармацыяй, якую мы можам даведацца з папярэдніх сведчанняў Душэўскага, з'яўляецца дакладны адрас будынку, дзе размяшчаўся ўрад БНР: вул. Вітаўта, 30.

Паводле паказанняў Душэўскага, склад урада В. Ластоўскага выглядаў наступным чынам: В. Ластоўскі – прэм'ер-міністр, П. Крэчаўскі – прэзідэнт, А. Цвікевіч – віцэ-прэм'ер і міністр замежных спраў, Ф. Грыб – міністр унутраных спраў, П. Вальковіч – міністр фінансаў, Л. Заяц – міністр дзяржаўнага кантроля і К. Душэўскі – дзяржаўны сакратар. Акрамя названых сябраў ва ўрад на розных пасадах уваходзілі і іншыя асобы,

---

[147] Копія рэзалюцыі Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі. 20.10.1920. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 326 – 327.

[148] Копія пратакола допыта Ластоўскага В. 07.10.37 г. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 294 – 302.

[149] ВАБІШЭВІЧ, А. Аляксандр Цвікевіч (1883 - 1937). У: *Białoruskie Zeszyty Historyczne*. [інтэрактыўны]. 2000. №14. [прагледжана 27 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/bzh/14/spis14.htm>.

[150] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.05.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 203 – 208.

[151] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 89 – 96.

пра іх, як адзначаў Душэўскі, ён нічога не ведаў[152]. Распавядаючы на допытах пра партыйную прыналежнасць сябраў урада, Клаўдзій Сцяпанавіч сведчыў, што П. Крычэўскі і Л. Захарка прымыкалі да партыі федэралістаў, Ф. Грыб – з’яўляўся эсэрам, Ластоўскі, Цвікевіч, Вальковіч і Заяц падзялялі праграму эсэраў, але ў партыю не ўваходзілі[153]. Сваю прыналежнасць да партыі эсэраў Клаўдзій Сцяпанавіч адмаўляў[154]. Дадзеныя паказанні К. Душэўскага пацвярджаюць існуючую інфармацыю пра Раду БНР. Адзінае, што крыху разыходзіцца з наяўнымі звесткамі, гэта апісанне партыйнай прыналежнасць сябраў урада. Так, вядома, што А. Цвікевіч уваходзіў у ключавае ядро Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў. Магчыма, гэтая неадпаведнасць была звязана з даўнасцю падзей, і Клаўдзій Сцяпанавіч проста памыліўся. Трэба памятаць, што Душэўскі сведчыў пра падзеі амаль 25 гадовай даўніны.

Як адзначаў К. Душэўскі, на першых этапах існавання ўрада яго практычная дзейнасць заключалася ў імкненні дамагчыся адтаржэння тэрыторыі Беларусі ад Польшчы і Савецкай Расіі і стварэнне незалежнай рэспублікі[155]. У гэтым пытанні саюзныя дзяржавы не падтрымалі ўрад БНР. У 1921 г. Рыжская мірная дамова не прызнала права на самавызначэнне і стварэнне незалежнай Беларускай рэспублікі. Па гэтай прычыне ўрад Ластоўскага быў вымушаны пайсці на дамову з урадам Літвы дзейнічаць разам пры абмеркаванні літоўска-беларускіх пытанняў на міжнародных канферэнцыях. Паводле слоў Душэўскага, з самага ўтварэння Літоўская Рэспубліка мела напружаныя адносіны з Польшчай па прычыне тэрытарыяльнага пытання ў дачыненні Вільні і Віленскага краю. Тэрытарыяльныя прэтэнзіі па беларускім землям да Польшчы меў і ўрад Ластоўскага. Таму кантакт беларусаў і літоўцаў быў карысны абодвум бакам. Менавіта па гэтай прычыне, літоўскі ўрад дазволіў Радзе БНР знаходзіцца на тэрыторыі Літвы.

Паводле слоў К. Душэўскага, сам ён фактычна прымаў ўдзел ва ўрадзе Ластоўскага толькі першыя два-тры месяцы 1921 г. За гэты час урад збіраўся два-тры разы[156]. Адным з галоўных пытанняў, якія ставіліся на дадзеных пасяджэннях было прызнанне БНР еўрапейскімі дзяржавамі. Галоўную ролю на ўсіх паседжаннях, як адзначаў Клаўдзій

[152] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

[153] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 76 – 85.

[154] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 59 – 63.

[155] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1947. Арк. 76 – 85.

[156] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. Арк. 209 – 213.

Сцяпанавіч, адыгрываў А. Цвікевіч. У палітычных пытаннях са складу ўрада Ластоўскага А. Цвікевіч быў падкаваны найбольш з усіх, таму на пасяджэннях урада ўсе палітычныя даклады рабіў менавіта ён. Цвікевіч адказваў за сувязь з замежнымі дзяржавамі, ён быў ярым праціўнікам палякаў і ставіў барацьбу з палякамі на першае месца[157]. Акрамя гэтага дзякуючы дзейнасці А. Цвікевіча балтыйскія краіны, Нямеччына, Францыя і Чэхіяй ставілі на пасяджэннях сваіх урадаў пытанні пра дыпламатычныя сувязі з урадам БНР[158].

Акрамя знешнепалітычных пытанняў А. Цвікевіч прымаў актыўны ўдзел і ў пошуках сродкаў для існавання ўрада БНР. Так, паводле паказанняў Душэўскага, фінансавымі пытаннямі ва ўрадзе займаліся П. Вальковіч і А. Цвікевіч. Акрамя пасады міністра фінансаў П. Вальковіч з'яўляўся яшчэ і консулам БНР у Літве. Разам А. Цвікевіч і П. Вальковіч дамагліся атрымання ад ураду Літвы пэўнай сумы грошаў. Саму суму і ўмовы атрымання на допытах Душэўскі не называў, спасылаючыся на тое, што гэта яму невядома. Разам з тым ён даволі падрабязна распавядаў пра іншую фінансавую аперацыю, якая была праведзена А. Цвікевічам і П. Вальковічам: "…Яны у Нямеччыне закупіліся на пяць міліёнаў марак адзежы і іншае, пры чым закупку зрабілі ў крэдыт, а ў далейшым у сувязі з інфляцыяй і абясцэньваннем нямецкіх марак, яны лёгка змаглі разлічыцца і на гэтым зарабілі."[159]. Больш інфармацыі пра дзейнасць ўрада Ластоўскага К. Душэўскі не распавядаў. Паводле яго слоў, прыблізна ў пачатку 1921 г. ён падаў заяўку аб выхадзе са складу Рады БНР, паколькі ўбачыў у яе дзейнасці аванцюру[160]. Як адзначаў К. Душэўскі, за выключэннем В. Ластоўскага і А. Цвікевіча большасць сябраў Рады былі недальнабачнымі і лёгкадумнымі людзьмі[161]. Сам урад для самавызначэння Беларусі па сутнанасці нічога не зрабіў.

Звяртае на сябе ўвагу наступнае: па-першае, К. Душэўскі нічога не распавядаў пра свой удзел у пасяджэннях і абмяжоўваў яго кароткім часам да сваёй адстаўкі ў 1921 г. Гэты факт можна зноўку трактаваць як жаданне Душэўскага дыстанцыявацца ад Рады БНР. Па-другое, Клаўдзій Сцяпанавіч выстаўляў на першы план у Радзе БНР А. Цвікевіча,

---

[157] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 89 – 96.

[158] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

[159] Тамсама. Арк. 209 – 213.

[160] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.05.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 203 – 208.

[161] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 76 – 85.

адзначаючы яго актыўную дзейнасць. Пры гэтым К. Душэўскі нічога не распавядаў пра ролю ва ўрадзе Ластоўскага і іншых сябраў. Магчыма, гэта было неяк звязана з нацягнутымі адносінамі паміж А. Цвікевічам і К. Дуж-Душэўскім. У працы, прысвечанай А. Цвікевічу, Аляксандр Вабішэвіч прыводзіць вытрымку з ліста Душэўскага ад 28 жніўня 1924 г., у якім характарызуючы А. Цвікевіча, Клаўдзій Сцяпанавіч адзначаў: “Што ж, ёсць правакатары-аферысты і сярод беларусаў, а главаром гэтай шайкі з’яўляецца А. Цвікевіч”[162]. Можна выказаць здагадку, што прычынай такой увагі да А. Цвікевіча, з’яўляліся нацягнутыя адносіны паміж ім і Душэўскім. Магчыма, па гэтай прычыне Клаўдзій Сцяпанавіч і сведчыў пра актыўную антысавецкую дзейнасць Цвікевіча і распавядаў пра яго фінансавыя махінацыі. Аднак у матэрыялах справы ёсць і іншыя ацэнкі дзейнасці Цвікевіча. Так, даючы ацэнку Радзе БНР, аб А. Цвікевічы ён выказваўся станоўча. У любым выпадку інфармацыя пра ролю Цвікевіча ў працы Рады БНР з’яўляецца вартай увагі даследчыкаў.

Што тычыцца спынення дзейнасці Рады БНР у Літве, то, як адзначаў К. Душэўскі, дакладнай прычыны ён не ведаў, але чуў, што гэта было звязана з расчараваннем літоўскага ўрада ў дзейнасці Рады БНР. Урад Літвы перастаў субсідыраваць Раду і патрымліваць яе дзейнасць[163]. Гэтымі паказаннямі Клаўдзій Сцяпанавіч пацвярджае наяўную інфармацыю. Як вядома ў 1923 г. адбыўся раскол. Раду БНР узначаліў А. Цвікевіч. У выніку пагаршэння сувязяў з Літоўскай Тарыбай новы ўрад быў вымушаны з’ехаць з Літвы[164]. Як бачна, Душэўскі зноўку спрабуе дыстанцыявацца ад Рады БНР, сцвярджаючы, што не ведаў сапраўдных прычын спынення дзейнасці Рады. У дадзены перыяд Клаўдзій Сцяпанавіч яшчэ з’яўляўся сябрам ураду, і, улічваючы яго добрыя стасункі з літоўцамі, не ведаць аб прычынах спынення дзейнасці Рады ў Літве ён не мог.

Такім чынам, падсумоўваючы інфармацыю пра ўрад Ластоўскага, трэба адзначыць наступнае. З матэрыялаў архіўна-следчай справы мы можам даведацца пра склад урада Ластоўскага, даведацца пра яго фінансаванне, сувязі з літоўскім урадам. Вартай увагі з’яўляюцца сведчанні Душэўскага пра ролю А. Цвікевіча ў працы Рады БНР. Каштоўнай інфармацыяй з’яўляецца дакладны адрас будынку, дзе размяшчалася Рада падчас свайго знаходжання ў Літве. Дадзеная інфармацыя ў беларускай гістарыяграфіі нідзе не

---

[162] ВАБІШЭВІЧ, А. Аляксандр Цвікевіч (1883 - 1937). У: *Białoruskie Zeszyty Historyczne*. [інтэрактыўны]. 2000. №14. [прагледжана 27 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/bzh/14/spis14.htm>.

[163] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

[164] ВАБІШЭВІЧ, А. Аляксандр Цвікевіч (1883 - 1937). Спасылка 161.

фігуравала. Малалікасць інфармацыі пра Раду БНР у першую чаргу я звязваю са спробай Клаўдзія Сцяпанавіча дыстанцыявацца ад дзейнасці Рады. Паказваючы свай няўдзел ва ўрадзе Ластоўскага, Душэўскі пазбягаў патрэбы распавядаць большую інфармацыю.

### 3.2. Беларускія арганізацыі ў Літве 1923 – 1939 гг.

Пасля выезда Рады БНР з Коўна ў 1923 г. беларуская прысутнасць у Літве была звязана з дзейнасцю беларускіх арганізацый. Поводле матэрыялаў архіўна-следчай справы мы можам даведацца пра дзейнасць Беларускага Цэнтра, Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства, Літоўска-Беларускага Таварыства і Беларускага Нацыянальнага Аб'яднання. Звестак пра гэтыя арганізацыі ў беларускай гістарыяграфіі вельмі мала. Так, амаль адзіным, найбольш поўным апісаннем, дзейнасці Беларускага Цэнтра і Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства ў Літве з'яўляецца праца А. Вашкевіча і Д. Нарэля "С. Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дэверсант"[165]. Матэрыялы справы дазваляюць праверыць і пашырыць наяўную інфармацыю.

### 3.2.1. Беларускі Цэнтр у Літве і Літоўска-Беларускае Таварыства

З выхадам з урада Ластоўскага ўся далейшая грамадская дзейнасць К. Душэўскага была звязана з працай Беларускага Цэнтра ў Літве. Беларускі Цэнтр быў створаны ў Коўна ў 1923 г. Паводле сведчанняў К. Душэўскага, гісторыя стварэння арганізацыі брала свой пачатак значна раней. Ідэя стварэння беларускага прадстаўніцтва пры ўрадзе Літвы з'явілася амаль адразу з атрыманнем Літвой незалежнасці і была звязана з жаданнем літоўскага ўрада атрымаць падтрымку мясцовага насельніцтва Віленшчыны, большасць якога складалі беларусы. Беларуская падтрымка была патрэбна літоўцам ў барацьбе за Віленскі край. Таму для вырашэння існуючай праблемы ў 1918 г. пры ўрадзе Літвы было створана Міністэрства па беларускім пытанням. Асноўнай мэтай новай арганізацыі з'яўлялася абарона інтарэсаў беларускай меншасці.[166] Паводле слоў К. Дуж-Душэўскага, першапачаткова пасада міністра была прапанавана менавіта яму. Але улічваючы навучанне ў Пецярбургу і жаданне закончыць універсітэт, ён адмовіўся і прапанаваў Язэпа

---

[165] ВАШКЕВІЧ, А., НАРЭЛЬ, Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант. У: *ARCHE*. 2005. №5 (39). С. 176 – 231.

[166] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 04.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 97 – 110.

Варонку, аб чым, як ён адзначаў ў сваёй аўтабіяграфіі, ён шкадаваў[167]. Дадзенае міністэрства Язэп Варонка ўзначаліваў недоўга, у 1921 г. з пасады міністра ён быў вызвалены. На яго месца быў прызначаны Дамінік Сямашка, які прапрацаваў на пасадзе міністра па беларускім пытанням да ліквідацыі самой арганізацыі ў канцы 1922 г.[168]. Прычынай ліквідацыі міністэрства стала праверка дзейнасці ўстановы, падчас якой было выяўлена, што ніякай працы міністэрства не праводзіла[169]. Пасля ліквідацыі міністэрства паўнамоцтвы ў вырашэнні праблем беларускай супольнасці былі перададзены Міністэрству замежных спраў Літвы[170].

Прыблізна ў красавіку 1923 г., паводле паказанняў К. Душэўскага, дырэктар Дэпартамента па справам Лігі Нацый Міністэрства замежных спраў прафесар Ігнас Іонінас звярнуўся з прапановай да В. Ластоўскага і К. Дуж-Душэўскага перайсці на працу ў МЗС Літвы ў якасці навуковых супрацоўнікаў у арганізацыю, якая адмыслова стваралася пры МЗС для аказання культурна-асветніцкай дапамогі беларусам[171]. Гэта, як адзначаў Клаўдзій Сцяпанавіч, супадала з яго інтарэсамі і інтарэсамі В. Ластоўскага, бо яны раней ужо звярталіся да літоўскага ўрада за дазволам правядзення культурна-асветніцкай працы ў Літве. Такім чынам, пасля ўзгадненя пазіцый пры Міністэрстве замежных спраў літоўскага ўрада у 1923 г. была створана арганізацыя Беларускі Цэнтр у Літве[172]. Паводле слоў К. Душэўскага, старшынёй арганізацыі быў абраны ён[173]. Паступіўшы на працу ў МЗС ад міністра замежных спраў Літвы Е. Гальванаўскаса Душэўскі атрымаў “звышштацкую пасаду 13 катэгорыі”, на якой прабыў да зыходу з міністэрства[174].

Паводле паказанняў Клаўдзія Сцяпанавіча, з 1923 да 1927 г. у Беларускі Цэнтр у Літве уваходзілі тры чалавекі: навуковыя супрацоўнікі Вацлаў Ластоўскі і Клаўдзій Дуж-

---

[167] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

[168] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 04.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 97 – 110.

[169] Пратакол допыта Іоніса І. 21.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 166 – 171.

[170] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 04.03.1947. Арк. 97 – 110.

[171] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 30.11.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 13 – 14.

[172] Пратакол допыта Іоніса І. 21.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 166 – 171.

[173] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 30.11.1946. Арк. 13 – 14.

[174] Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. Арк. 199 – 203.

Душэўскі і тэхнічны супрацоўнік Васіль Барысовіч[175]. А вось паказанні В. Ластоўскага сведчаць пра больш шырэйшы склад арганізацыі: акрамя вышэй названых сябраў у БЦ ад літоўцаў увайшлі прафесары Біржышка, Жэмайціс і Вайдэніс[176]. У літаратуры мы можам сустрэць і трэцюю версію склада БЦ: В. Ластоўскі, К. Дуж-Душэўскі, В. Барысовіч, А. Матач і І. Іонінас[177]. Чым выклікана такое разыходжанне адназначна сказаць нельга. Магчыма, склад Цэнтра з часам мяняўся, але пра гэта ніхто ў сваіх паказаннях не распавядаў. Іншай версіяй можа быць тое, што В. Ластоўскі быў больш ангажаваны ў працу Цэнтра і свае паказанні даваў значна раней. Дадзенае пытанне патрабуе дадатковага вывучэння.

Як адзначаў К. Душэўскі, асноўнай мэтай Беларускага Цэнтра было правядзенне культурна-асветніцкай працы[178]. Асноўная дзейнасць арганізацыі заключалася ў выданні падручнікаў на беларускай мове. Акрамя гэтага задачамі БЦ былі: арганізацыя беларускіх школ, народных універсітэтаў, тэатральныя пастаноўкі, арганізацыя літаратурных і вакальных вячэраў і г. д.[179]. У дадзены перыяд было выпушчана некалькі кніг, прачытана 150 дакладаў на розныя беларуска-літоўскія тэмы, надрукавана вялікая колькасць артыкулаў аб Беларусі і беларускай культуры, аказана грашовая і рэчавая дапамога на суму 3500 літаў[180]. З 1923 – 1927 г. Беларускі цэнтр выдаваў часопіс “Крывіч”. Актыўная выдавецкая праца цэнтра працягвалася да 1927 г. Пасля ад’езда В. Ластоўскага ў БССР дзейнасць БЦ па выпуску беларускіх кніг спынілася. Сам Душэўскі яшчэ заставаўся на службе ў МЗС і займаўся падрыхтоўкай рукапісаў, але выдаць іх яму так і не прыйшлося[181].

Што тычыцца крыніц фінансавання Беларускага Цэнтра у Літве, то інфармацыя ў матэрыялах справы падаецца супярэчлівая. Так, у лісце “Для арыентацыі ў беларускіх

---

175 Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

176 Паказанні Ластоўскага В. 07.10.37 г. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 294 – 302.

177 ВАШКЕВІЧ, А., НАРЭЛЬ, Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант. У: *ARCHE*. 2005. №5 (39). С. 176 – 231.

178 Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. Арк. 209 – 213.

179 Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 191.

180 Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага “Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…”. 01.05.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-11 – 15.

181 Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. Арк. 209 – 213.

справах…” К. Дуж-Душэўскі сцвярджае, што Беларускі цэнтр у Літве падчас сваёй працы ў 1923 – 1927 гг. ніякіх субсідый не прасіў. Паводле яго слоў, амаль усе выдаткі БЦ пакрываліся ахвярнасцю сяброў арганізацыі, што давала магчымасць дзейнічаць і выступаць адкрыта і незалежна. Менавіта праца за ідэю, як адзначаў Душэўскі, давала магчымасць пазбегнуць наплыва спекулянтаў, якія жадалі зарабіць на “грамадскіх справах”[182]. Дадзеныя словы Клаўдзія Сцяпанавіча не адпавядаюць рэчаіснасці, пра што сведчыць не толькі яго паказанні на допытах, але і інфармацыя, якую мы маем у літаратуры. Так, у артыкуле “Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант” А. Вашкевіч і Д. Нарэль адзначаюць, што ў 1925 г. літоўскі Сейм выдзяліў Беларускаму Цэнтру грошы на суму ў 60 тыс. літ[183].

Наконт фінансавання Беларускага Цэнтра на допытах Душэўскі сведчыў наступнае. Сродкі на выдавецкія патрэбы Беларускі Цэнтр атрымліваў ад Міністэрства замежных спраў Літвы, які фактычна курыраваў Беларускі Цэнтр. Так, паводле сведчанняў Душэўскага, за працу ў МЗС Вацлаў Ластоўскі атрымліваў 650 літ, сам Клаўдзій Сцяпанавіч атрымліваў каля 600 літ у месяц[184]. Як адзначаў на допытах Душэўскі, Беларускі Цэнтр фактычна з’яўляўся маскіроўкай для выдання падручнікаў для беларускіх школ Міністэрствам замежных спраў Літвы. Міністэрства выпускала кнігі пад маркай “Беларускі Цэнтр”. Такая маскіроўка, па словам Душэўскага, была неабходна па той прычыне, што выпускаць падручнікі ад імя МЗС Літвы было немагчыма, бо гэта магло прывясці да забароны палякамі выдання і выкарыстання беларускіх падручнікаў у Вільні. З фінансавымі прычынамі Клаўдзій Сцяпанавіч звязваў і спыненне дзейнасці БЦ. Так, паводле яго сведчанняў, Беларускі Цэнтр фактычна перастаў функцыянаваць па прычыне адсутнасці фінансавання ад літоўскага ўрада[185]. Па гэтай прычыне ў 1929 г. з Міністэрства замежных спраў К. Душэўскі перайшоў на працу ў Міністэрства сувязі Літвы.

Як бачна, К. Душэўскі даволі падрабязна распавядаў пра стварэнне і працу Беларускага Цэнтра ў Літве ў 1923 – 1929 гг. У адрозненні ад паказанняў пра дзейнасць Рады БНР, дадзеныя сведчанні выглядаюць праўдападобнымі, але тым не менш

---

[182] Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага “Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…”. 01.05.1933. Арк. 246-11 – 15.

[183] ВАШКЕВІЧ, А., НАРЭЛЬ, Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант. У: *ARCHE*. 2005. №5 (39). С. 176 – 231.

[184] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

[185] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 189 – 190.

патрабуюць праверкі. Паказанні Клаўдзія Сцяпанавіча пацвярджаюць інфармацыю, якую мы можам прачытаць пра БЦ у літаратуры. Акрамя пацвярджэння інфармацыі матэрыялы ўтрымліваюць новыя факты. Так, сярод прыведзеных Душэўскім звестак пра БЦ асобна трэба адзначыць сведчанні пра склад сябраў Цэнтра. Гэта інфармацыя дапаўняе і часткова абвяргае наяўныя ў літаратуры звесткі. Каштоўнай інафармацыяй з'яўляецца расповед Душэўскага пра гісторыю стварэння Цэнтра і яго дзейнасць. Новай інфармацыяй з'яўляецца і паказанні пра заробкі В. Ластоўскага і К. Душэўскага, якія яны атрымлівалі падчас сваёй працы ў МЗС.

Другое жыццё Беларускі Цэнтр у Літве атрымаў у 1933 г. Паказанні К. Дуж-Душэўскага наконт аднаўлення дзейнасці Цэнтра даволі супярэчлівыя. Па адной з версіяў аднаўленне арганізацыі адбылося па асабістай ініцыятыве Душэўскага. Так, у 1932 – 1933 гг. ён пры дапамозе адваката Дмітроўскага напісаў статут для дзейнасці Беларускага Цэнтра[186]. Паводле іншых сведчанняў, прапанава аднавіць беларускае выдавецтва і з гэтай мэтай перарэгістраваць БЦ паступіла ў 1933 г. ад доктара Пурыцкіса – тагачаснага міністра замежных спраў Літвы[187]. Паводле гэтай версіі, для стварэння арганізацыі быў распрацаваны новы статут і прыцягнуты новыя сябры. Ужо да пачатку 1933 г., як адзначаў Клаўдзій Сцяпанавіч, уся падрыхтоўчая праца для рэгістрацыі была скончана. Канчатковага адказу на пытанне, хто з'яўляўся ініцыатарам аднаўлення БЦ, матэрыялы справы не ўтрымоўваюць.

Таксама розную інфармацыю мы можам пабачыць і пра правядзенне ўстаноўчага сходу Беларускага Цэнтра. Так, паводле сведчанняў С. Якавюка, устаноўчы сход Беларускага Цэнтра быў скліканы 19 лютага 1933 г. на кватэры Дуж-Душэўскага[188]. На гэты сход, паводле слоў Якавюка, прыйшло каля 90 чалавек. За арганізацыю цэнтра акрамя самога Дуж-Душэўскага выступілі каля 10 чалавек, усе астатнія былі супраць. Як адзначаў С. Якавюк, БЦ ствараўся з мэтай перашкодзіць працы Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства і яго аддзелам у Літве. Сам Душэўскі распавядаў, што на сход былі запрашаны сябры БЦ і ўсе, хто жадаў прыняць удзел у абмеркаваньні статута. Акрамя зацвярджэння статута на пасяджэнні павінна было абірацца і кіраўніцтва арганізацыі. Усяго на кангрэс сабралося прыкладна 50 чалавек. На сход былі запрошаны

[186] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 14.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 198.

[187] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

[188] Пратакол допыта Якавюка С. 26.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 223 – 225.

прастаўнікі розных арганізацыяў, сярод якіх быў і старшыня Беларускага Культурнага-Прасветнага Таварыства С. Якавюк і сябра таварыства А. Мата. Галасаваць, паводле слоў Душэўскага, мелі права толькі сябры БЦ[189]. Сам устаноўчы сход быў сарваны, у чым Душэўскі абвінавачваў Якавюка. Каб перашкодзіць ўстаноўчаму сходу БЦ Якавюк, Боеў і 35 сабраных імі чалавек уварваліся ў памяшканне, дзе праводзіўся сход, занялі першыя месцы, некого не дапускалі і не давалі нікому сказаць слова. У выніку чаго сход быў сарваны. У сваім лісце "Да арыентацыі ў беларускіх справах…" Душэўскі пісаў, што такія дзеянні С. Якавюка былі выкліканы пагрозай канкурэнцыі, якую мог стварыць Беларускі цэнтр у Літве[190]. Як бачна, з матэрыялаў архіўна-следчай справы мы можам пазнаёміцца з двумя версіямі апісання спробы правядзення ўстаноўчага сходу БЦ. Ніякіх іншых матэрыялаў, якія маглі б даць дадатковую інфармацыю на карысць адной з версій у справе не ўтрымоўваецца. Такім чынам Кожная з гэтых версій патрабуе дадатковай праверкі.

Нягледзячы на перашкоды з боку Якавюка і Боева, устаноўчы сход Беларускага Цэнтра атрымалася правесці, але ўжо ў іншы дзень – 23 лютага 1933 г.[191]. Паводле апісання схода Душэўскім, сход пачаўся з ушанавання палеглых за незалежнасць Літвы і беларускае адраджэнне. На сходзе была прынята прывітальная тэлеграма прэзідэнту Літвы і прывітальная адозва да ўсіх беларусаў і беларускіх дзеячоў. Пасля ўрачыстай часткі быў прыняты статут і выбрана праўленне арганізацыі. У праўленне Беларускага Цэнтра, паводле слоў Душэўскага, увайшлі: сам К. Дуж-Душэўскі, В. Барысовіч і І. Сіротка, кандыды – Ясінскі і Карняк. У рэвізійную камісію былі абраны: Т. Іваноўскі, В. Іваноўскі і М. Спірыдовіч. Скончыўся сход прамовай на беларускай мове дэкана факультэта прафесара Жэмайціса, які выступіў ад імя віленскіх літоўцаў. Пасля прыняцця статута Беларускага Цэнтра ён быў зарэгістраваны пад №2001 ў Міністэрстве ўнутранных спраў у аддзеле "Таварыства"[192]. Як бачна, матэрыялы справы дазваляюць нам даведацца пра ўстаноўчы сход арганізацыі і склад Цэнтра. Важным сведчаннем з'яўляецца інфармацыя пра ўдзел у арганізацыі Беларускага Цэнтра братоў Вацлава і Тадаса Іваноўскіх. Таксама новай інфармацыяй для гісторыкаў з'яўляецца і нумар рэгістрацыі статута БЦ.

---

[189] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 200 – 201.

[190] Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага "Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…". 01.05.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-11 – 15.

[191] Тамсама. Арк. 246-11 – 15.

[192] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 14.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 198.

Што тычыцца працы Беларускага Цэнтра ў Літве, то, паводле паказанняў Душэўскага, з 1933 г. па 1939 г. яна праводзілася пад фактычна яго асабістым кіраўніцтвам[193]. Паказанні Душэўскага пра актыўнасць Цэнтра ў гэты перыяд не супадаюць. На адным з допытаў Дуж-Душэўскі сведчыць, што акрамя выдавецкай дзейнасці, Беларускі Цэнтр працаваў у шчыльным кантакце з літоўскім урадам і атрымліваў ад апошняга сродкі для існавання арганізацыі[194]. Паводле іншых сведчанняў Душэўскага, за пэрыяд існавання арганізацыі ў 1933 – 1939 гг. выдавецкай працы Беларускаму Цэнтру ажыццявіць не ўдалося[195]. Галоўнай прычынай чаго Клаўдзій Сцяпанавіч называў адсутнасць сродкаў. Так, нягледзячы на абяцанне ўраду Літвы аб фінансавай падтрымцы, грошы Беларускаму Цэнтру дадзены не былі, таму ўся праца абмяжоўвалася штогадовым зборам сходу для перавыбараў кіраўніцтва. З практычнай дзейнасці, паводле слоў К. Душэўскага, за гэты перыяд былі праведзены толькі дзве лекцыі на тэму “Аб 125-ці паэта Дуніна-Марцінкевіча са дня яго смерці” і “Аб рэлігійнай уніі ў Беларусі” і два спектаклі. Пра адсутнасць рэальнай працы Цэнтра сведчыў і I . Сіротка[196]. Паводле слоў К. Дуж-Душэўскага, Беларускі Цэнтр у Літве праіснаваў да 1939 г., а затым “статут з усімі выцякаючымі з яго паўнамоцтвамі мной (К. Дуж-Душэўскім – аўт.) быў перададзены віленскім беларусам ў асобе ксяндза Станкевіча Адама, пасля гэтага я да гэтага не датыкаўся”[197]. Звестак пра працу Беларускага Цэнтра ў 1933 – 1939 гг. у беларускай гістарыяграфіі амаль няма, што дадае каштоўнасць атрыманай інфармацыі.

Яшчэ адна арганізацыя, пра якую мы можам даведацца з матэрыялаў архіўна-следчай справы, гэта Літоўска-Беларускае Таварыства[198]. Паводле слоў К. Дуж-Душэўскага, ініцыятарамі ЛБТ былі Тадэвуш Іваноўскі і Галена Іваноўская, якія таксама некаторы час з’яўляліся сябрамі Беларускага Цэнтра. Як адзначаў Душэўскі, ініцыятыва арганізацыі ЛБТ была ўспрынята і беларускай, і літоўскай грамадскасцю вельмі добра. На

---

[193] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 191.

[194] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 29.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 202.

[195] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

[196] Пратакол допыта Сіроткі І. 05.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 167 – 168.

[197] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. Арк. 209 – 213.

[198] Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага “Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…”. 01.05.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-11 – 15.

арганізацыйным сходзе, які адбыўся пад старшынствам К. Дуж-Душэўскага і сакратарах Пенкайцісе – ад літоўцаў і Барысовічы – ад беларусаў, акрамя сябраў БЦ, паводле сведчанняў Душэўскага, прысутнічалі прафесары Аўгустайціс, Біржышка, Вальтэр, Вайлёніс і Лапо, доктар Пурыцкі, сакратар магістрату Пенкайціс і шмат іншых. Сход Літоўска-Беларускага Таварыства быў вельмі прадстаўнічы і адбыўся ў цёплай атмасферы. Па выніках сходу была абрана камісія для распрацавання статута і правядзення ўсіх фармальнасцяў для далейшай рэгістрацыі. У камісію ўвайшлі Г. Іваноўская, доктар Пурыцкі, прафесар Аўгустайціс, інжынер Аўкштоліс, К. Дуж-Душэўскі і В. Барысовіч. Паводле матэрыялаў справы, к траўню 1933 г. статут Літоўска-Беларускага Таварыства быў апрацаваны, прыняты і пададзены на рэгістрацыю. Іншай інфармацыі пра ЛБТ Клаўдзій Сцяпанавіч на допытах не распавядаў. Архіўна-следчая справа дае магчымасць пазнаёміцца як з гісторыяй утварэння Літоўска-Беларускага Таварыства, так і з яе супрацоўнікамі.

### 3.2.2. Беларускае Культурна-Прасветнае Таварыства і Беларускае Нацыянальнае Аб’яднанне

З паказанняў К. Душэўскага, акрамя інфармацыі пра Беларускі Цэнтр і Літоўска-Беларускае Таварыства ў Літве мы можам даведацца яшчэ пра дзве арганізацыі. Гэтымі арганізацыямі з’яўляюцца Беларускае Культурна-Прасветнае Таварыства, якое ўзначальваў Сямён Якавюк, і Беларускае Нацыянальнае Аб’яднанне, старшынёй якога з’яўляўся Усевалад Боеў[199]. Абедзве арганізацыі, паводле сведчанняў Клаўдзія Сцяпанавіча, былі створаны ў 1932 г. і дзейнічалі амаль да 1940 г.[200].

Паводле інфармацыі, якае ўтрымоўваецца ў матэрыялах архіўна-следчай справы, можна вылучыць две версіі гісторыі стварэння Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства. Першая версія выкладзена ў лісце К. Душэўскага “Для арыентацыі ў беларускіх справах…”[201]. Паводле інфармацыі, якую ўтрымоўвае дадзены ліст ідэя стварэння Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства паўстала ў пачатку 1932 г.

[199] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 10.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 111 – 116.

[200] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 134 – 141.

[201] Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага “Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…”. 01.05.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-11 – 15.

сярод сябраў Беларускага Цэнтра ў Літве і іншых беларусаў, якія раней у Беларускі Цэнтр не ўваходзілі. Мэтай стварэння арганізацыі, як адзначаў Душэўскі, было прыцягненне да беларускай справы новых сіл. Арганізацыя была створана і зарэгістравана па ініцыятыве В. Барысовіча, І. Сіроткі, І. Ясінскага і іншых. Сямён Якавюк, які стаў старшынёй Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства трапіў у праўленне “нечакана ў перакор Статуту і не зусім карэктным спосабам”.

Паводле іншай версіі, якая прыводзіцца ў кнізе К. Езавітава “Беларусы ў Літве”[202], пасля шэрагу нарад у восені 1931 г. стварылася ініцыятыўная група, у якую ўвайшлі Сымон Якавюк, Караліна Плескачэўская і Васіль Барысовіч, які ўзначаліў групу. Гэтая група распрацавала статут Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства ў Літве і падала яго на зацвярджэнне. Справа разгляду і зацвярджэння статута цягнулася амаль усю зіму 1931 – 1932 гг. 28 лютага 1932 г. адбыўся першы устаноўчы сход, на якім прысутнічала 37 чалавек. На дадзеным сходзе было абрана першае праўленне: С. Якавюк – старшыня, А. Матач – намеснік старшыні, К. Плескачэўская – скарбнік, С. Дзядзевіч – сакратар, Г. Радзюк – сябра праўлення Я. Ясінскі і В, Барысовіч – кандыдаты. Пра ўдзел С. Якавюка ў ініцыятыўнай групе БКПТ на адным з допытаў узгадываў і сам Душэўскі.[203]

Як бачна, матэрыялы-архіўна следчай справы даюць магчымасць пазнаёміцца з двума версіямі стварэння Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства. Акрамя гэтага мы можам даведацца пра частку сябраў дадзенай арганізацыі. На жаль, прыведзеная інфармацыя па прычыне сваёй супярэчлівасці не дае магчымасці цалкам уявіць гісторыю ўтварэння БКПТ. Але тым не менш дадзеныя матэрыялы ўтрымоўваюць шэраг новых фактаў, якія раней даследчыкам былі невядомы. Магчыма, далейшае вывучэнне дадзенай праблемы дазволіць даць гісторыкам канчатковы адказ.

Матэрыялы архіўна-следчай справы даюць нам магчымасць пазнаёміцца і з ацэнкамі дзейнасці Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства. Так, у сваёй кнізе “Беларусы ў Літве” К. Езавітаў, распавядаючы пра стан беларускіх справаў да стварэння БКПТ, пісаў наступнае: “… адзінае, што здолелі зрабіць беларусы ў Літве, гэта выпусціць некалькі добрых кніжак. Але гэта справа была праароблена не грамадствам Літвы, а асобнымі персонамі, В. Ластоўскім і К. Душ-Душэўскім. Гэтая выдавецкая справа, пры

[202] ЕЗАВІТАЎ, К. Беларусы ў Літве. Рыга: Выданьне Беларускага Выдавецтва ў Латвіі. 1932. С. 16. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-23.

[203] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 134 – 141.

ўсёй яе вартасці, аднак з'яўлялася працай аднабаковай і ні ў якім разе не дапамагла самаарганізацыі меншасці. У апошнія чатыры-пяць год выдавецкая дзейнасць зусім спынілася.". Паводле слоў К. Езавітава, да 1932 г. актыўная беларуская грамадская праца ў Літве не вялася, а праца якая вялася раней была вельмі слабая і не выходзіла за межы канцэлярыі. Адсутнасць беларускіх арганізацый з'яўлялася адной з прычынаў далучэння беларусаў да польскіх і расейскіх арганізацый. Таму актывізацыя арганізацыйнай працы па аб'яднанню беларускай меншасці і стварэнне Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства атрымала добрую ацэнку як беларускіх дзеячоў у Літве, так і беларусамі за яе межамі.

Асноўнымі мэтамі таварыства, як пісаў у сваёй кнізе К. Езавітаў, спасылаючыся на статут арганізацыі, было: аб'яднанне беларускай меншасці ў Літве, пашырэнне беларускай культуры, выхаванне культурна-грамадскіх дзеячоў і фізічнае выхаванне беларускай моладзі. Паводле звестак, якія падаюцца ў кнізе "Беларусы ў Літве" Беларускае Культурна-Прасветнае таварыства мела часовае бюро ў доме №26 на Лайсвес алеі ў Коўна. За кароткі час свайго існавання БКПТ здолела адкрыць клуб "Беларуская хатка", які знаходзіўся ў доме №34 па вуліцы Крашэўскага. Акрамя гэтага Беларускім Культурна-Прасветным Таварыствам былі адкрыты адзелы ў мястэчках Мерачы і Бразэлі, было створана Драматычнае таварыства. У кнізе Езавітаў адзначаў і планы БКПТ на будучае, сярод якіх пазначалася скліканне шэрагу аддзелаў, канферэнцыі беларускай меншасці ў Літве, адкрыццё беларускіх школ, настаўніцкай семінарыі і іншае. Даючы ацэнку дзейнасці Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства, К. Езавітаў пісаў пра рэальныя вынікі і поспехі дзейнасці арганізацыі на 1932 г. Прыведзеная вышэй ацэнка беларускіх спраў у Літве і дзейнасці БКПТ мае асаблівую каштоўнасць. Акрамя таго, што гэтая ацэнка дадзена чалавекам звонку, дадзеныя матэрыялы ў беларускай гістарыяграфіі яшчэ нікім не выкарыстоўваліся.

Пра дзейнасць Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства на допытах распавядаў і К. Дуж-Душэўскі. Так, паводле сведчанняў Клаўдзія Сцяпанавіча, асноўнай мэтай БКПТ было правядзенне культурна-асветніцкай працы сярод беларусаў, пражываючых у Літве. Дзейнасць таварыства была афіцыйна дазволена літоўскім урадам, арганізацыя мела свой клуб, дзе праводзіла літаратурныя вечарыны, лекцыі, сходы і іншае[204]. Даючы станоўчую ацэнку дзейнасці Культурна-Прасветнага Таварыства, Клаўдзій Сцяпанавіч негатыўна выказваўся ў бок старшыні БКПТ С. Якавюка. Так, у

---

[204] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 89 – 96.

сваім звароце "Для арыентацыі ў беларускіх справах…" К. Душэўскі вельмі негатыўна ацэнваў працу С. Якавюка на пасадзе старшыні таварыства. У лісце Душэўскі сцвярджаў, што асноўнай мэтай Якавюка з'яўлялася выбіванне грошай пад беларускую справу. Называючы Якавюка кампраментатарам, Душэўскі абвінавачваў яго ў шматлікіх даносах на беларускіх грамадскіх дзеячоў. Са слоў Душэўскага, у Беларускім Культурна-Прасветным Таварыстве было некалькі ідэйных і добрых працаўнікоў, дзякуючы якім і працавала арганізацыя. Але з-за дзеянняў Якавюка шмат людзей з арганізацыі сышлі, сярод якіх Клаўдзій Сцяпанавіч называе В. Барысовіча, І. Сіротку і Ясінскага. З зыходам найбольш ідэйных сяброў таварыства, яно страціла ўсякую вагу і з ім зусім перасталі лічыцца. З дадзеных сведчанняў можна даведацца пра дзейнасць Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства, факт зыхода з арганізацыі часткі сяброў, а таксама пазнаёміцца з ацэнкай дзейнасці С. Якавюка К. Душэўскім.

Яшчэ адной арганізацыяй, пра якую мы можам даведацца з матэрыялаў архіўна-следчай справы, з'яўляецца Беларускае Нацыянальнае Аб'яднанне[205]. Паводле слоў К. Душэўскага, БАН было створана прыблізна ў той жа час, што і Беларускае Культурна-Прасветнае Таварыства і праіснавалі да 1940 г. Старшынёй названай арганізацыі быў Усевалад Боеў. Беларускае Нацыянальнае Аб'яднанне фактычна з'яўлялася філіялам Беларускага Культурна-Прасветніцкага Таварыства. Але, як адзначаў Клаўдзій Сцяпанавіч, у адрозненне ад БКПТ гэта аб'яднанне ставіла перад сабой і палітычныя мэты. Беларускае Нацыянальнае Аб'яднанне імкнулася да правядзеньня палітычнай працы сярод беларусаў, іх аб'яднанню і прадстаўніцтву беларускай нацыянальнай меншасці пры ўрадзе Літвы[206]. Паводле паказанняў Душэўскага, Боеў заўсёды прысутнічаў на афіцыйных прыёмах замежных пасольстваў, відных палітычных дзеячоў Літвы і прадстаўляў асабіста беларускую нацыянальную меншасць. Пра Беларускае Нацыянальнае Аб'яднанне звестак ў літаратуры няма, таму прыведзеная інфармацыя з'яўляецца новай і асабліва каштоўнай.

Такім чынам, трэба яшчэ раз адзначыць каштоўнасць матэрыялаў архіўна-следчай справы. Так, разам са звесткамі, якія пацвярджаюць наяўную інфармацыю пра беларускія арганізацыі ў Літве, мы можам даведацца і шэраг новых фактаў, якія, улічваючы спецыфіку дадзенай крыніцы, патрабуюць дадатковай праверкі даследчыкаў. Сярод новай

---

[205] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 134 – 141.

[206] Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 89 – 96.

інфармацыі, якую мы сустракаем у матэрыялах справы трэба адзначыць інфармацыю пра крыніцы фінансавання ўрада Ластоўскага, адносіны Рады БНР з урадам Літвы. Цікавай з'яўляецца інфармацыя пра ролю А. Цвікевіча ў працы Рады БНР. Каштоўнай інфармацыяй з'яўляецца дакладны адрас будынку, дзе размяшчаўся ўрад Ластоўскага. Сярод звестак пра беларускія арганізацыі ў Літве, трэба адзначыць інфармацыю пра існаванне і працу Беларускага Нацыянальнага Аб'яднання. З матэрыялаў справы мы можам пазнаёміцца з гісторыяй утварэння Беларускага Цэнтра, Літоўска-Беларускага і Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства, а таксама даведацца пра іх працу і склад супрацоўнікаў. Каштоўнай з'яўляецца інфармацыяй пра ўстаноўчы сход Беларускага Цэнтра і Літоўска-Беларускага Таварыства, дадзеныя пра рэгістрацыйны нумар статуту БЦ, а таксама дакладныя адрасы беларускіх арганізацый у Коўна (гл. дадатак 5). Як бачна, матэрыялы архіўна-следчай справы К. Дуж-Душэўскага ўтрымоўваюць шмат інфармацыі, вартай увагі даследчыкаў. Шэраг прыведзеных фактаў з'яўляюцца новымі ў беларускай гістарыяграфіі і ставяць шмат пытанняў для вывучэння.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Агляд матэрыялаў архіўна-следчай справы К. Дуж-Душэўскага паказаў, што дадзеная крыніца змяшчае вялікую колькасць каштоўнай інфармацыі як адносна біяграфіі самога дзеяча, так і гісторыі беларускага нацыянальнага руху міжваеннага перыяду ў Літве.

Матэрыялы справы дазваляюць нам не толькі пацвердзіць шырока вядомыя звесткі з біяграфіі Клаўдзія Сцяпанавіча, але і пазнаёміцца з новымі, дагэтуль невядомымі фактамі яго жыцця. Сярод іх трэба адзначыць інфармацыю пра сустрэчы Дуж-Душэўскага ў складзе дэлегацый з міністрам нямецкага ўрада М. Эрсбергам, главой місіі ЗША ў Польшчы Маргентаў, Ю. Пілсудскім і Літвінавым. Новымі з’яўляюцца факты афармлення Дуж-Душэўскім перавода атрада Булак-Булаховіча на службу БНР, яго старшынства на Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі ў Рызе, старшынства ў Беларускім нацыянальным камітэце ў Вільні і ўдзел у дзейнасці Беларускага навуковага таварыства. Каштоўнай з’яўляецца інфармацыяй пра месцы працы і пасады К. Дуж-Душэўскага, спіс напісаных ім кніг і спраектаваных будынкаў. Асобна трэба адзначыць пацвярджэнне гіпотэзы аб аўтарстве Душэўскага эскіза бел-чырвона-белага сцяга, а таксама інфармацыю аб ролі Клаўдзія Сцяпанавіча ў спрыянні прызнання Фінляндыяй і Эстоніяй “дэ-факта” Беларускай Народнай Рэспублікі.

Следчая справа ўтрымоўвае важную інфармацыю пра дзейнасць Рады БНР і беларускіх арганізацый у міжваеннай Літве. Сярод іх трэба адзначыць інфармацыю пра крыніцы фінансавання ўрада Ластоўскага, адносіны Рады БНР з урадам Літвы. Цікавасць уяўляе інфармацыя пра ролю А. Цвікевіча ў працы Рады БНР. Каштоўнай інфармацыяй з’яўляецца дакладны адрас будынку, дзе размяшчаўся ўрад Ластоўскага. Сярод звестак пра беларускія арганізацыі ў Літве, трэба адзначыць інфармацыю пра існаванне і працу Беларускага Нацыянальнага Аб’яднання. З матэрыялаў справы мы можам пазнаёміцца з гісторыяй утварэння Беларускага Цэнтра, Літоўска-Беларускага і Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства, а таксама даведацца пра іх працу і склад супрацоўнікаў. Каштоўнай з’яўляецца інфармацыяй пра ўстаноўчы сход Беларускага Цэнтра і Літоўска-Беларускага Таварыства, дадзеныя пра рэгістрацыйны нумар статуту БЦ, а таксама дакладныя адрасы беларускіх арганізацый у Коўна. Акрамя адзначанай вышэй інфармацыі следчая справа ўтрымоўвае і шэраг іншых звестак. Прыведзеныя ў матэрыялах справы факты з’яўляюцца новымі ў беларускай гістарыяграфіі і ўказваюць новыя накірункі даследаванняў беларускага нацыянальнага руху.

# СПІС КРЫНІЦ І ЛІТАРАТУРЫ

## Архіўныя крыніцы


1. Абвінаваўчае заключэнне па следчай справе №19097. 12.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 347 – 353.

2. Абзор архіўных матэрыялаў аб дзейнасці Усеагульнага з'езда беларусаў Вільні. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 205.

3. Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага "Для арыентацыі ў беларускіх грамадскіх справах у Літве…". 01.05.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-11 – 15.

4. Адкрыты ліст К. Дуж-Душэўскага "Усім грамадскім дзеячам". 02.04.1933. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-16 – 17.

5. Выпіска з даклада К. Дуж-Душэўскага аб "Руска-польскім перамір'і і Беларусі". У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 316 – 325.

6. Выпіска з пратакола Усеагульнага з'езда беларусаў Вільні. 25.05.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 204.

7. Выпіска са спісу сябраў Беларускага навуковага таварыства. 01.03.1944. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 222.

8. Гістарычная даведкай аб дзейнасці Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 328 – 335.

9. Даведка Цэнтральнага Дзяржаўнага Гістарычнага архіва ў Ленінградзе №00178. 14.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 339.

10. ЕЗАВІТАЎ, К. Беларусы ў Літве. Рыга: Выданьне Беларускага Выдавецтва ў Латвіі. 1932. С. 16. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. K-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 246-23.

11. Заява дэпутата З. Жэмайціса Старшыне Прэзідыума Вярхоўнага Савета ЛССР. 20.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 245-3.

12. Копія апісання грамадскай і палітычнай дзейнасці К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 199 – 203.

13. Копія аўтабіяграфіі К. Дуж-Душэўскага. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 197 – 198.

14. Копія выпіскі з 26 главы кнігі Я. Найдюка "Беларусь учора і сёння". У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 216 – 221.

15. Копія зварота "БНК да глаўнакамандуючага польскай арміі". У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 214.

16. Копія ліста БНК "Главе місіі ЗША". 01.08.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 211 – 213.

17. Копія пратакола допыта Езавітава К. 19.02.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 233 – 240.

18. Копія пратакола допыта Каравайчыка П. 10.11.1930 г. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 267 – 273.

19. Копія пратакола допыта Станкевіча А. 29.09.49. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 245 – 246.

20. Копія пратакола паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта. 03.06.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 207.

21. Копія пратакола паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта. 24.07.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 208 – 209.

22. Копія пратакола паседжання Беларускага нацыянальнага камітэта. 01.08.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 210.

23. Копія рэзалюцыі Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі. 20.10.1920. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 326 – 327.

24. Паказанні Ластоўскага В. 07.10.37 г. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 294 – 302.

25. Пастанова аб абранні меры прысячэння. 30.09.40. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 9 – 10.

26. Пастанова аб сканчэнні ўгалоўнага пераследу і вызваленні з-пад варты. 08.05.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 242 – 244.

27. Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Суда ЛССР. 07.10.1954. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 407 – 409.

28. Пратакол допыта Гасцілы І. 21.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 172 – 174.

29. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 189 – 190.

30. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 191.

31. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 10.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 194 – 195.

32. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 11.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 196 – 199.

33. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 14.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага.* Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 198.

34. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 214 – 215.

35. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 200 – 201.

36. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 29.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 202.

37. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 27.05.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 203 – 208.

38. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 09.06.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 209 – 213.

39. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 15.

40. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 30.11.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 13 – 14.

41. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 21 – 28.

42. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 29 – 39.

43. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 19.12.1946. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 17.

44. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 40 – 53.

45. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 28.01.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 54 – 64.

46. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 65 – 75.

47. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 76 – 85.

48. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 89 – 96.

49. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 04.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 97 – 110.

50. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 126 – 133.

51. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 10.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 111 – 116.

52. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 14.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 117 – 125.

53. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 18.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 134 – 141.

54. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 28.04.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 142 – 147.

55. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 31 – 33.

56. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 21.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 34 – 37.

57. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 25.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 38 – 42.

58. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 43 – 50.

59. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 29.02.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 51 – 58.

60. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 59 – 63.

61. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 03.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 66 – 70.

62. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 06.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 71 – 73.

63. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.03.52. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 74 – 77.

64. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 10.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 78 – 82.

65. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 11.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 83 – 92.

66. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 12.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 93 – 96.

67. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 13.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 97 – 99.

68. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 14.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 100 – 103.

69. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 17.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 104 – 107.

70. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 19.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 108 – 110.

71. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 20.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 111 – 115.

72. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 24.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 116 – 119.

73. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 26.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 120 – 121.

74. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 121 – 126.

75. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 01.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 127 – 131.

76. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 02.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 132 – 138.

77. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 03.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 139 – 142.

78. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 03.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 143 – 145.

79. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 05.04.1952. У: Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага. Lietuvos ypatingasis archyvas. ф. К-1, воп. 58, адз. з. 25116/3, арк. 146 – 148.

80. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 07.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 149 – 152.

81. Пратакол допыта Дуж-Душэўскага К. 08.04.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 153 – 156.

82. Пратакол допыта Іоніса І. 21.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 166 – 171.

83. Пратакол допыта Пяткавічуса В. 27.03.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 157 – 159.

84. Пратакол допыта Сіроткі І. 05.03.1947. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 167 – 168.

85. Пратакол допыта Якавюка С. 26.03.1941. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 223 – 225.

86. Прыгавор Віленскага абласнога суда. 14.05.1952. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 374 – 375.

87. Спіс спраектаваных К. Дуж-Душэўскім будынкаў у Літве. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 228-1.

88. Фатаграфія К. Дуж-Душэўскага і К. Езавітава. 25.12.1919. У: *Архіўна-следчая справа К. Дуж-Душэўскага*. Lietuvos ypatingasis archyvas, ф. К-1, воп. 58, ад. з. 25116/3, арк. 223-6.

**Літаратура**

89. БЛОК, М. *Апология истории или ремесло историка*. М.: Наука, 1986. 254 с.

90. БЫКОВА, С. “Наказанная память”: свидетельства о прошлом в следственных материалах НКВД. У: *Неприкосновенный запас*. [інтэрактыўны]. 2009. №2 (64). [прагледжана 18 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://magazines.russ.ru/nz/2009/2/by4.html>.

91. ВАБІШЭВІЧ, А. Аляксандр Цвікевіч (1883 - 1937). У: *Białoruskie Zeszyty Historyczne*. [інтэрактыўны]. 2000. №14. [прагледжана 27 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/bzh/14/spis14.htm>.

92. ВАШКЕВІЧ, А., НАРЭЛЬ, Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант. У: *ARCHE*. 2005. №5 (39). С. 176 – 231.

93. ГАМУЛКА, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918 – 1922). Пераклад з польскай мовы С. Кузняцова і А. Шоты. Вільня., 2008. 256 с.

94. ДАНИЛЕВСКИЙ, И. Н. и др. *Источниковедение : Теория. История. Метод. Источники Российской истории*: Учебное пособие для студентов вузов. М.: РГГУ, 2004. 702 с.

95. Дуж-Душэўскі Клаўдзій Сцяпанавіч. У: *Беларуская энцыклапедыя*: У 18 т. Т. 6. Рэд.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. Мн., 1998. С. 269 – 270.

96. ЖДАНОВІЧ, В. Гісторыя аднаго кахання. У: *Бярозка*. 1992. №7/8.

97. КАРАМАН, В. Н. Исторические источники по истории политических репрессий в СССР (на примере Дальнего Востока). У: *Ойкумена. Регионоведческие исследования*. 2006. №1. С. 99 - 105.

98. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. У: *ARCHE*. 2007. №11. С. 104 - 421.

99. КЛАДОВА, Н. В. Следственные дела репрессированых: соотношение информации и смысла в историческом источнике. У: *Актуальные вопросы истории Сибири*. [інтэрактыўны]. [прагледжана 11 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://new.hist.asu.ru/biblio/borod3/74-79.html>.

100. КОВАЛЬЧЕНКО, И. Д. и др. *Источниковедение истории СССР*: Учебник. Под ред. И. Д. Ковальченко. 2-е изд. М: Высшая школа, 1981. 496 с.

101. ЛАТЫШОНАК, А. Дзяржаўная сымболіка Беларускай Народнай Рэспублікі. У: *ARCHE*. [інтэрактыўны]. [прагледжана 15 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://arche.by/by/10/30/360/>.

102. ЛИТВИН А. Л. Следственные дела как исторический источник. У: *Эхо веков*. Казань, 1995. № 1. С. 170 - 176.

103. ЛУЦКЕВІЧ, Л. Барацьбіт і будаўнік. У: *Літаратура і мастацтва*. 1991. 3 мая. С. 13.

104. ЛУЦКЕВІЧ, Л. Заслужыў пашану нашчадкаў. У: *Голас Радзімы*. 1991. 2 мая. №18. С. 4 – 5.

105. МАРАКОЎ, Л. У. *Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадския і культурныя дзеячы Беларуси, 1794 – 1991*. Энц. даведник. У 10 т. Т. 1. Мн., 2003.

106. ПРОНШТЕЙН, А. П., ЗАДЕРА А. Г. *Методика работы над историческими источниками*: Учебн.-метод. пособие. М., 2007.

107. ПУШКАРЁВ, Л. Н. *Классификация русских письменных источников по отечественной истории*. М., 1975. 281 с.

108. РУДОВІЧ, С. Белы, чырвоны, белы... У: *Звязда*. 1992. 25 сак.

109. РУДОВІЧ, С. Душэўскі. У: *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*. Т.3. Мн., Беларуская Энцыклапедыя, 1996.

110. РУДОВІЧ, С. Палітык, асветнік, дойлід. У: *Памяць*: *гісторыка-дакументальная хроніка Глыбоцкага раёна*. Пад рэд. Сачанка Б. І. Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1995. С. 126 – 130.

111. СИДОРЕНКО, О. В. *Источниковедение отечественной истории*: Учебное пособие. Владивосток: ТИДОТ ДВГУ, 2005. 52 с.

112. ХАРЭЎСКІ, С. Клаўдзі Дуж-Душэўскі. Сьцяг. У: *Наша Ніва*. 1998. № 6. С. 15.

113. ХОДИН, С. Н, ГРИЦКЕВИЧ, В. П., КАУН, С. Б., *История и теория источниковедения*: Учеб. Пособие. Мн.: БДУ, 2008. 254 с.

114. ХОДЗІН, С. М. *Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны*. Вып. 5. Мн.: БДУ, 2009. 187 с.

115. ХОДЗІН, С. М. *Крыніцы па гісторыі Беларусі. Гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне*. Вучэбны дапаможнік. Мн.: БДУ, 1999. 193 с.

116. ШМИДТ, С. О. *Путь историка*: Избранные труды по источниковедению и историографии. М., 2005.

117. ЯМКОВА, В. Ліставаньне Кляўдуша Дуж-Душэўскага зь Мікітам Шапавалам за 1923 – 1924 гг. У: СПАДЧЫНА. 2002. № 5 – 6. [інтэрактыўны]. [прагледжана 27 красавіка 2010]. Доступ праз Інтэрнэт: <http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/spadczyna/2002-5-6/11.htm>.

**ДАДАТАК 1.**

**Аўтабіяграфія К. Дуж-Душэўскага**

Нарадзіўся ў 1891 годзе 27 сакавіка ў м. Глыбокае ў Дзісненскім уездзе былой Віленскай губерні, але прапісаны да г. Тракай. У 1912 г. скончыў Віленскую рэальную школу, сдаў конкурсныя іспыты і паступіў Петраградскі горны інстытут, дзе вучыўся да студзеня 1919 г. Дыплома і нават пасведчання аб сканчэнні інстытута не атрымаў і таму вырашыў паступіць у літоўскі універсітэт, каб легалізаваць свой цэнз. У 1927 скончыў будаўнічае аддзяленне тэхнічнага факультэта ў літоўскім універсітэце і атрымаў дыплом інжынера па будаўніцтву.

**Служба і стаж**

Мой дзядзя і бацька былі будаўнікамі. З юных год я ўдзельнічаў у будаўніцтве, дапамагаў масцерам, чарціў, састаўляў сметы дамоў, касцёла, будаўніцтва шасэ і невялікіх мастоў. З'яўляючыся вучнем старэйшых класаў, я ўжо кіраваў невялікімі будаўнічымі працамі і па нагадам бацькі састаўляў праекты.

Будучы студэнтам, я працаваў ў розных галінах, як практыкант на заводах, у шахтах і г. д. У Сібіры самастойна працаваў на гідратэхнічных працах, спачатку як майстра, пазней як гідратэхнік. У Жыгулёве на Волге працаваў на цэментнам заводзе пры правядзенні геалагічных працаў.

Яшчэ будучы студэнтам, у сакавіку 1917 г. паступіў на службу ў Міністэрства харчовай прамысловасці, дзе пасля двух месяцаў працы мяне прызначылі начальнікам аддзела. Гэтыя абавязкі я выконваў да 25 кастрычніка 1917, г. зн. да бальшавістскага пераварота.

Некаторы час нідзе не служыў, але летам мяне прызвалі на службу ў камісію па эвакуацыі Петраграда, як "старшага спецыяліста". Тут я праслужыў да восені 1918 г.

У жніўні 1918 г. мне ўдалося пабываць у Вільні і Берліне, дзе я ўдзельнічаў у дэлегацыі к Эрсбергу. Пасля вяртання ў Петраград і ўрэгулявання спраў у горным інстытуце, г. зн. сдачы застаўшыхся залікаў, у студзені 1919 г. паступіў у сельскагаспадарчы камісарыят г. Мінска, дзе атрымаў месца губернскага геолага. У гэтым жа годзе 15 красавіка быў камандзіраваны ў г. Вільню для закупкі абарудавання і забяспечаны авансам у суме некалькі тысяч рублёў. 19 красавіка Вільня была занята польскімі войскамі, аванс я вярнуў толькі ў 1920 г., тымі жа грошамі, якія я атрымаў тады, калі савецкія войскі былі ў Вільні і я мог паехаць у Мінск і разлічыцца з грошамі.

Пад час першай польскай акупацыі Вільні я працаваў як беларускі грамадскі дзеяч, выкладаў у гімназіі і на курсах выкладчыкаў, працаваў у каапераціі, выдаваў газету.

Калі ў 1920 г. Вільня была занята Літоўскімі савецкімі войскамі, мяне мабілізавалі і прызначылі заведуючым "Губтопа". 9 верасня 1920 г. я разам з апошнімі літоўскімі войскамі з'ехаў у Літву, таму што не хацеў яшчэ раз застацца на тэрыторыі, акупаванай палякамі. З гэтага часу я жыву ў Коўна.

5 красавіка 1923 г. міністр замежных спраў Галванаўскас Е. прадставіў мне зверхштацкую пасаду 13 катэгорыі, на якой я прабыў да 1930 г. У 1930, з'яўляючыся служачым МЗС, быў запрошаны ў акцыянернае таварыства "Майстас" на пасаду тэхнічнага дырэктара і будаўніка халадзільнікаў. Працуючы на гэтай пасадзе, пабудаваў беконную фабрыку ў Панявежысе і Коўна, масляны халадзільнік у Клайпедзе, спраектаваў і пабудаваў у Коўна фабрыку па апрацоўке кішак і свінарнік на 1000 галоў свіней, спраектаваў разам з фірмай "Франц Крул" новую беконную фабрыку ў Таўраге і Шаўляе. Праца была складанай таму, што трэба было выпрацаваць тыпы і норма ўсіх пабудоў. У вынікуператамлення я моцна захварэў, акрамя гэтага праца па будаўніцтву бойні мне не вельмі падабалася і я быў вымушаны звольніцца.

У 1930 г. я паступіў у Міністэрства шляхоў зносін, дзе і працую па цяперашні час рэферэнтам па будаўніцтву паштовага кіравання.

**ДАДАТАК 2.**

**Грамадская і палітычная дзейнасць К. Дуж-Душэўскага**

Дзед маёй маці Урублеўскі па паходжанню быў баярын і дваранін Полацкага ўезда. Загінуў у 1831 г. падчас паўстання палякаў. Бацька маёй маці Высоцкі загінуў падчас польскага паўстання ў 1863 г. Мая маці першыя гады свайго жыцця правяла ў Антокальскай турме г. Вільні.

Мае бацькі лічылі сябе беларусамі польскай культуры. Само сабой разумеецца, што я, з'яўляючыся вучнем малодшых класаў, быў уцягнуты ў польскія кансператыўныя гурткі. Тут я пазнаёміўся з Недвалькоўскім, Арцішэўскім, Касцялоўскім і іншымі сучаснымі польскімі дыпламатамі і грамадскімі дзеячамі, але сутыкнуўшыся прыблізна ў 1910 г. з беларускімі дзеячамі – прафесарам Іваноўскім, Ластоўскім В., Луцкевічам А. – я хутка зразумеў, што я не паляк і адразу далучыўся да руху беларускага адраджэння. Ужо пачаў чытаць лекцыі на беларускія тэмы ў польскіх гуртках, дзе мяне лічылі беларусам.

У той жа час я пазнаёміўся і з літоўскімім нацыянальным адраджэннем. Удзельнічаў у агульных сходах з Жмуйдзінавічам, Янулайцісам, інжынерам Кайріс і іншымі. Добра ведаў аб Антонасе Смятоне, ксяндзе Тумасе, Басанавічусе, Біржышке, Жамайцісе і інш.

У 1912 г. я скончыў рэальную школу і паступіў у Петраградскі горны інстытут, дзе ўвесь вольны час ад вучобы прысвячаў беларускаму адраджэнню і на працягу сямі год фактычна кіраваў беларускім рухам ў Петраградзе. Быў старшынёй Саюза беларускіх студэнтаў і ў беларускім класе ўзаемнай дапамогі, удзельнічаў у арганізацыі беларускага хора, рэгенамі якога былі літоўцы Шымкус і Талат-Кепша.

У 1913 г. удзельнічаў у тайнай літоўска-польска-украінскай канферэнцыі. Ад беларусаў быў я і Тарашкевіч, ад літоўцаў адвакат Сугінтас, прозвішча іншага не памятаю, ад украінцаў Кушнір і яшчэ хтосьці, ад палякаў Ратман. Пратаколы гэтай канферэнцыі ў мяне не захаваліся, аб чым я шкадую.

У гэты ж час я выпускаў беларускі часопіс “Раніца”, па-рускі “Утро” і пад кіраўніцтвам прафесара літоўца Вальтэріса ўдзельнічаў у працах і выданнях петраградскага універсітэта, дзе змяшчаліся мае і прафесара Вальтэріса артыкулы.

Прыблізна ў гэты час я з іншымі беларусамі рэдагаваў і выдаваў беларускія газеты “Дзенніца” і “Светач” у Петраградзе. У гэты час інтэлігенцыя была вельмі малалікая і нам даводзілася шмат працаваць па ўсім лініям.

У пачатку вайны і рэвалюцыі я працаваў у камітэце па забеспячэнню бежанцаў. У гэты час я пазнаёміўся з ксяндзом Тумасам, сябрамі дзяржаўнай думы Янушкавічусам Н., Балісам і іншымі літоўцамі, з якімі прыйшлося ўдзельнічаць у канферэнцыях, нарадах, у савеце рабочых дэпутатаў, Маскоўскай дзяржаўнай нарадзе, усеагульнай расійска Дэмакратычнай нарадзе, камісіі па выпрацоўке правілаў аб выбарах ва ўстаноўчы сход і г. д.

Цікава адзначыць, што беларусы лічылі сваім дзяржаўным сцягам такой жа сцяг, як і літоўцы, г. зн. белы вершнік на чырвоным фоне, але нацыянальнага сцяга тады яшчэ не было і мне давялося зрабіць некалькі праектаў нацыянальнага сцяга, адзін з якіх быў прыняты, а менавіта белая, чырвоная і белая паласы. З гэтага часу гэты сцяг і з’яўляецца беларускім нацыянальным сцягам.

У 1918 г. удзельнічаў пры ўтварэнні Беларускай народнай рэспублікі. У 1918 г. мне давялося ў складзе дэлегацыі ездзіць у Берлін і размаўляць з Эрцбергам. Пасля вяртання з Берліна я ўдзельнічаў на нарадзе па пытанню літоўска-беларускіх адносін, дзе была выстаўлена мая кандыдатура на пост Міністра па справам беларусаў у Літве, але я жадая скончыць горны інстытут, адмовіўся і прапанаваў /аб чым шкадую/ выставіць кандыдатуру Варонка І.

У 1919 г. падчас польскай акупацыі 8 чэрвеня на з’ездзе дэлегатаў Віленскага і Гарадзенскага Краёў быў абраны Віленскі і Гарадзенскі беларускі камітэт. На сходзе змагаліся беларуска-літоўскі і беларуска-польскі накірункі. Адвакат Алексюк кіраваў беларуска-польскім накірункам. Беларуска-літоўскі накірунак перамог і мяне, як прыхільніка літоўскае арыентацыі, абралі старшынёй камітэта. Была прынята таксама мая прапанова даслаць вітальную тэлеграму ураду Літвы ў Коўна. Гэтым апошнім крокам былі вельмі напалоханы польскія ўлады і палкоўнік Славек хацеў угаварыць мяне зняць з парадку дня пытанне аб пасылке тэлеграмы ў Коўна, тым болей, што з’езд не збіраўся дасылаць ніякай тэлеграмы ураду Польшы. Тэлеграму літоўскаму ўраду з’езд усё ж прыняў. Я дакладна не ведаю ці атрымалі тэлеграму ў Коўна, але ў пратаколах з’езда пра гэта ўказана.

Пазней палякі мне ўсё ж адпомсцілі, напісалі ў некаторых газетах, што я быццам бы начале дэлегацыі да ўрада Польшчы заявіў, што беларускі народ хоча быць залежным ад Польшчы, хоць сярод беларусаў такое пытанне не падымалася. Мне прыйшлося пісаць у газеты аспрэчанні. Ксёндз Тумас таксама адгукнуўся на гэтую вестку і напісаў артыкул у “Вольнай Літве”, дзе не праверыўшы польскіх крыніц, паспяшыў выразіць сваё адмоўнае меркаванне ў адносінах да гэтага фіктыўнага факта і на некаторы час сапсаваў беларуска-

літоўскія адносіны ў такі напружаны час, калі беларусы ўсімі сіламі шукалі збліжэння з Літвой.

**Мое адносіны з палякамі**

У Польшчы я маю шмат таварышчаў па вучобе і ўвогуле добрых знаёмых сярод польскіх палітычных кіраўнікоў. Я добра ведаю палкоўніка Славенка, Янджэвіча, Касцялкоўскага, Абрамовіча, Скірмунта, Арцішэўскага, знаёмы з Іосіфам і Янам Пілсудскімі і г. д., але я ўсім шчыра казаў, што я супраць аб’яднання беларускіх земляў з польскай дзяржавай і ўвогуле супраць збліжэння беларусаў з палякамі. Я ім падкрэсліваў, што я толькі тады буду сяброўскі ставіцца да палякаў, калі яны пакінуць нашыя землі і сыдуць за Буг і Нараў. З боку палякаў былі спробы перадаць у мае рукі крупную суму грошай для “беларускага адраджэння”. Ад гэтага я адмовіўся і ўказаў адрэсы культурных і дабрачынных установ, якія маюць патрэбу ў грашах і могуць сумленна гэтыя грошы спажыць.

Я не хаваю, што я з’яўляюся рамантыкам беларуска-літоўскага збліжэння.

Нарэшце палякі мяне арыштавалі і пратрымалі тры тыдні ў турме Лукішкі. Потым адпусцілі і я з’ехаў у Літву.

Пазней у газетах Варшавы Янджэвіч пісаў, што палякі зрабілі памылку, не сумеўшы з Душэўскага зрабіць свайго прыхільніка. Я некалькі разоў на працягу апошніх год быў у Вільні і кожны раз палякі мне рабілі прапановы пераехаць у Польшчу, але я кожны раз падкрэсліваў свае адмоўныя погляды ў стаўленні да Польшы, хоць трэба прызнаць праўду, што шмат з палітыкаў Польшы з’яўляюцца асабіста таленавітымі і сімпатычнымі людзьмі, а таксама джэнтлеменамі, але гэта не можа змяніць маіх поглядаў у стаўленні да польскай дзяржавы.

**Мае погляды ў адносінах да незалежнасці Літвы**

Пакуль Літва з’яўляецца незалежнай, беларусы могуць спадзявацца ўстанавіць незалежнасць Беларусі. Літва з’яўляецца адной з частак былога Літоўска-беларускага і Жамойтскага вялікага княства. Гэтая частка зноўку атрымала незалежнасць. Гэту незалежнасць трэба ўмацаваць справамі саміх беларусаў, г. зн. іншай часткі былога Вялікага княства.

Для беларусаў Літва з’ўлялася фарпостам супраць нямецкага “Дранг нах Остэн”. Слабая Літва не магла б устаяць супраць немцаў, а моцная Літва магла б абараніць сябе і Беларусь ад Нямеччыны. Беларусь не мае выхада да мора, а Літва мае макі выхад і свій порт Клайпеду. У будучым Беларусь магла б па дамове з Літвой сумесна карыстацца портам.

З усяго гэтага выцякае, што Беларусь не толькі павінна быць зацікаўлена ў незалежнасці Літвы, але і ў роўнай ступені і яе магутнасці і моцы, тыб болей што гісторыя не ведае факта вайны паміж літоўцамі і беларусамі.

**Урад Беларускай народнай рэспублікі**

У канцы 1919 г. я быў пасланы на Прыбалтыйскую канферэнцыю у г. Тарту і прызначаны прадстаўніком беларускага ўраду ў Прыбалтыцы. У Тарту я шукаў збліжэння з прадстаўніком Літвы доктарам Шлюпасам, але, на жаль, прыйшлося пераканацца, што ён быў настолькі дрэнна праінструктаваны і мабыць ад Міністра Вальдэмараса атрымаў такія інструкцыі, што з ім было цяжка дамовіцца. Шкада, але можна было б пазбегнуць у той час шматлікіх памылак, калі б было больш даверу і добрай волі.

У Прыбалтыцы мне давялося атрымаць з боку Фінляндыі і Эстоніі прызнанне “дэ факта” Беларускай народнай рэспублікі. Гэтым былі вельмі занепакоены палякі. У Талін нават прыехаў Славек і сустрэўшы мяне, выразіў шкадаванне, што палітыка Беларусі ідзе ў суперак з палітыкай Польшчы.

У той час у Менску на з’езде Рады дэмакратычнай Беларусі, пры ўтварэнні Кабінета Міністраў начале з Ластоўскім, мяне ўключылі ў спіс міністраў. Ластоўскаму і ўсім міністрам давялося бегчы ў Літву, дзе ўвесь урад быш прыняты, як пажаданы госць. Але доўга знаходзіцца ў эміграцыі ўрад ня можа. Пачаліся даследаванні і сапсаваліся адносіны. Першым сышоў з кабінета я, а потым і Ластоўскі. Мы абодва патрабавалі самых лепшых адносінаў з Літвой, іншыя прытрымліваліся іншага меркавання, я прыняў нават літоўскае грамадзянства. Мы ўтварылі “Цэнтр беларускага дзеяння ў Літве” і пачалі праводзіць працу беларускай культуры. Іншыя з’ехалі з Літвы.

**Беларуская культурніцкая праца ў Літве**

Я пачаў выдаваць беларускі часопіс “Сцяг беларускі”, пазней “Крывіча”, напісаў і выпусціў на беларускай мове шмат кніг навуковага зместу з гісторыі, матэматыцы і прыродазнаўства, кіраваў некалькімі часовымі беларускімі курсамі, чытаў лекцыі па радыё.

Як ужо згадаў, спадар Гальванаўскас запрасіў мяне працаваць у Міністэрства замежных спраў. Паступіў у Літоўскі ўніверсітэт, вывучыў літоўскую мову. Удзельнічаў у дзейнасці саюза інжынераў Літвы. Быў адным з першых ініцыятараў і рэдактараў часопіса “Тэхніка і гаспадарка”, г. зн. не кідаючы беларускай працы і застаючыся беларусам, я літвінізіраваўся і імкнуўся быць добрым грамадзянінам сваёй радзімы Літвы.

Я стаўлюся да Літвы як да сваёй радзімы і хачу быць карысным і добрым грамадзянінам, ва ўнутраныя справы Літвы я ніколі не ўмешваўся, бо хачу быць

карэктным у адносінах края, які мяне прыняў. Зараз я з’яўляюся старшынёй “Цэнтра беларускага дзеяння ў Літве”. Выпускаю і рэадагую беларускі часопіс “Беларускі цэнтр”. Стала ўдзельнічаю ў працы дзяржаўнага радыёкамітэта.

Акрамя кніг на беларускай мове я напісаў і на літоўскай мове:

1. Удзельнічаў у перыядычных выданнях “Наш Вільнюс” і іншых газетах і часопісах.

2. Напісаў некалькі артыкулаў тэхнічнага зместу ў часопіс “Тэхніка і гаспадарка”.

3. Выпрацаваў нормы для цэглы. Гэтыя нормы з некаторымі зменамі прыняты “Літоўскім “домам гандлю”.

4. Напісаў брашуру “Беларусы і Вільня”

5. Напісаў і выпусціў кнігу “Падручнік будаўнічых прац”

6. Падрыхтаваў для друку брашуру аб паліве, дзе саставіў усе новыя табліцы “Эквівалентаў паліва”.

7. Выпрацаваў і падрыхтаваў да друку кнігу “будаўнічыя дэталі”

**Мае найбольш важныя працы па будаўніцтву**

1. Кінатэатр “Метрапалітай” і дом па вуліцы Ласвес ал., 41.
2. Дом доктара Пурыцкага па вул. Вайжганто.
3. Дом сп. Аўкштуоліса, Аўшрос такас, 1.
4. Дом сп. Антуліса, вул. Прашпект Вітаўтаса, на рагу вул. Шаўлю.
5. Дом адваката Пажэласа, плошча Венібес, 10.
6. Дом інжынера Реклайціса, плошча Венібес.
7. Беконная фабрыка ў Каўнасе.
8. Беконная фабрыка ў Паневежысе.
9. Масляный халадзільнік у Клайпедзе.
10. Фабрыка па апрацоўцы кішак у Каўнасе.
11. Свінарнік для 1000 шт. у Каўнасе.
12. Будынак пошты ў Расейняй.
13. Дама Жакевіченеса і Гарунгшціса, ул. Траку 15.
14. Будынак пошты і будынак аўтаномнай тэлеграфнай станцыі ў Шанчай.

1934 г. VIII - 31.

Інжынер К. Дуж-Душэўскі

**ДАДАТАК 3.**

**Абвінаваўчае заключэнне (па следчай справе №19097). 12.04.1952 г.**

“ЗАЦВЯРДЖАЮ”
НАМ. МІНІСТРА ДЗЯРЖБЯСПЕКІ ЛССР
ПАЛКОЎНІК: (ГАЎРЫЛАЎ)
“14” красавіка 1952 г.

АБВІНАВАЎЧАЕ ЗАКЛЮЧЭННЕ
(Па следчай справе №19097).

ПА АБВІНАВАЧВАННЮ:
ДУШАЎСКАСА-ДУЖ Клаўдзіюса сына Стэпо
у здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных
арт. арт. 58 - п.13 і 58 – 10 частка II УК РСФСР

18 лютага 1952 года Міністэрствам Дзяржаўнай Бяспекі Літоўскай ССР, як актыўны беларускі нацыяналіст арыштаваны ДУШАЎСКАС-ДУЖ Клаўдзіюс сын Стэпо.

Следствам па справе УСТАНОЎЛЕНА:

ДУШАЎСКАС-ДУЖ у 1910 годзе у горадзе Вільне прымкнуў да нацыяналістычнай беларускай арганізацыі, так называемай “Рух беларускага абуджэння”, якой кіравалі беларускія нацыяналісты ЛАСТОЎСКІ і іншыя (асуджаныя).

(а.с. 34, 35, 266, 269, 270, 274, 278).

Будучы студэнтам Пецярбургскага Горнага інстытута, ДУШАЎСКАС-ДУЖ у 1912 – 1918 гадах з’яўляўся адным з арганізатараў і кіраўнікоў беларускага нацыяналістычнага руху сярод студэнцтва Пецярбурга. Яго дзейнасць у той перыяд выражалася ў арганізацыі нацыяналістычных гурткоў са студэнтаў-беларусаў, рэдагаванні нацыяналістычных часопісаў “Раніца”, “Светач”, “Дзянніца” і правядзенні сярод студэнства беларускай нацыянальнай прапаганды.

(а.с. 34 – 36, 116 – 117, 197, 339).

Пражывая ў 1919 г. у г. Вільня, акупаваным у той час палякамі, Душаўскі-Душ актыўна удзельнічаў у беларускім нацыянальным руху. У траўні гэтага ж году разам з

іншымі беларускімі нацыяналістамі з'яўляўся арганізатарам сходу беларусаў Вілленшчыны і Гарадзеншчыны, на якім увайшоў у склад антысаваецкага нацыяналістычнага цэнтра "Беларускі нацыянальны камітэт" і займаў пост старшыні гэтага камітэта. Па ініцыятыве ДУШАЎСКАС-ДУЖ і іншых нацыяналістаў на сходзе был апрынята рэзалюцыя, у якой гаварылася аб неабходнасці стварэння беларускай нацыянальнай арміі, якая, як гаварылася ў гэтай рэзалюцыі, "…у першую чаргу будзе весці барацбу супраць бальшавікоў разам з усім цывілізаваным светам".

(а.с. 39, 41, 42, 43 – 45, 153 – 156, 204 – 208, 328 - 335).

Узначалівая "беларускі нацыянальны камітэт", ДУШАЎСКАС-ДУЖ праводзіў актыўную дзейнасць, накіраваную на адрыў Беларусі ад Савецкай Расіі і ўтварэнне на яе тэрыторыі "незалежнай" буржуазнай дзяржавы.

(а.с. 45 – 50, 51 – 58, 153 – 156, 204 –, 205, 206, 207, 208, 209, 210, – 214, 328 – 335).

У гэтых мэтах ДУШАЎСКАС-ДУЖ летам 1919 г. дамогся прыёма ў главы польскага буржуазнага ўраду Пілсудскага, якога праінфармаваў аб стварэнні антысавецкага "Беларускага нацыянальнага камітэта", аб мэтах і задачах "камітэта" і прасіў у садзейнічанні польскага ўрада гэтаму "камітэту" у яго барацбе за "незалежную" буржуазна-нацыяналістычную Беларусь.

У той жа перыяд, як старшыня "Беларускага нацыянальнага камітэта", Душэўскі-Дуж наведаў главу місіі ЗША ў Польшчы міністра Маргентаў, якога таксама праінфармаваў аб "Беларускім нацыянальным камітэце" і ўручыў яму ліст, у якім прасіў урад ЗША і прэзідэнта Вільсана аб аказанні дапамогі ў стварэнні буларускай буржуазна-нацыяналістычнай рэспублікі.

(а.с. 47 – 48, 51 – 210, 211 – 213).

Восенню 1919 г. ДУШАЎСКАС-ДУЖ меў сустрэчу ў г. Варшава з главой беларускага эмігрантскага антысавецкага ўрада ЛУЦКЕВІЧАМ, які упаўнаважыў яго, як прадстаўніка гэтага ўрада, прыняць удзел у канферэнцыі прыбалтыйскіх краін у г. Тарту (Эстонія).

У г. Тарту ДУШАЎСКАС-ДУЖ вёў перамовы з прадстаўнікамі прыбалтыйскіх дзяржаў аб прызнанні эмігрантскага ўрада ЛУЦКЕВІЧА і дамогся такога прызнання з бокупрадстаўнікоў Фінляндыі і Эстоніі.

(а.с. 79, 93 – 94, 149 – 152, 233 – 234).

Прыбывая ў г. Тарту ДУШАЎСКАС-ДУЖ ўстанавіў злачынную сувязь з беларускімі нацыяналістам, пасля ваенным міністрам беларускага эмігрантскага ўрада ЕЗАВІТАВЫМ (арыштаваны), разам з якім яны звязаліся з белагвардзейскім генералам

БУЛАК-БУЛАХОВІЧАМ і дамовіліся з ім пра пераход атрада БУЛАК-БУЛАХОВІЧА з белай арміі Юдзеніча на службу антысавецкаму белаэмігрантскаму "ўраду" Луцкевіча.

Для ўтрымання белагвардзейскага атрада БУЛАК-БУЛАХОВІЧА ДУШАЎСКАС-ДУЖ разам з ЕЗАВІТАВЫМ заключылі дамову з Буржуазным Эстонскім урадам аб грашовым і харчовым снабжэнні атрада.

(а.с. 71 – 73, 232 - 240).

У канцы 1919 г. на адбываўшымся сходзе беларускіх нацыяналістаў у акупаваным г. Мінску ДУШАЎСКАС-ДУЖ быў абраны міністрам і статс-сакратаром зноўку сфармаванага беларускага буржуазна нацыяналістычнага ўрада, які ўзначаліваў Ластоўскі (асуджаны).

Пасля выгнання полскіх акупантаў з Беларусі "урад" ЛАСТОЎСКАГА бег у буржуазную Літву і абраў сваім месцам прыбывання г. Каўнас, дзе праіснаваў да 1923 г. ДУШАЎСКАС-ДУЖ, як сябра гэтага ўрада, неаднаразова ўдзельнічаў на яго паседжаннях, дзе абмяркоўваліся пытанні барацьбы супраць Савецкай улады і "адраджэнні" буржуазна-нацыяналістычнай Беларусі.

(а.с. 39 – 42, 69, 70, 86 – 88, 94, 111, 112 – 115, 221).

У канцы 1920 г. пасля падпісання мірнай дамовы паміж Польшчай і Савецкай Расіяй, ДУШАЎСКА-ДУЖ ад імя ўрада Ластоўскага выступіў з дакладам, накіраваным супраць падпісання гэтай дамовы, у якім паклёпнічаў на знешнюю палітыку Савецкага ўрада і прызываў да анулявання гэтай дамовы і стварэння "незалежнай" Беларусі начале з буржуазна-нацыяналістычным урадам; тады ж ДУШАЎСКАС-ДУЖ падпісаў антысавецкую паклёпніцкую рэзалюцыю, прынятую на канферэнцыі беларускіх нацыяналістаў.

(а.с. 111, 112 – 115, 316 – 325, 326, 327).

У 1923 г., пасля распаду буржуазна-нацыяналістычнага ўрада ЛАСТОЎСКАГА, ДУШАЎСКАС-ДУЖ разам з ЛАСТОЎСКІМ былі запрошаны Міністэрствам замежных спраў буржуазнай Літвы на працу ў так званы беларускі аддзел і ўзначальвалі створаны ім "Беларускі цэнтр дзеяння" у Літве, у якім пад выглядам культурна-асветніцкай працы праводзілі нацыяналістычную працу сярод беларусаў.

(а.с. 95, 96, 109 – 110, 116 – 171, 202).

На працягу 1923 – 1927 гг. ДУШАЎСКАС-ДУЖ разам з ЛАСТОЎСКІМ на субсідыі, якія атрымоўвалі ад Міністэрства замежных спраў буржуазнай Літвы, рэдагавалі і выдавалі нацыяналістычны часопіс "Крывіч", у якім змяшчаліся артыкулы антысавецкага і нацыяналістычнага характара.

(а.с. 109, 110, 146 – 148, 338).

Акрамя таго, ДУШАЎСКАС-ДУЖ, з'яўляючыся варожа настроеным у адносінах да Савецкай улады, у перыяд нямецкай акупацыі і да арышта незаконны захоўваў антысавецкую белаэмігрантскую і нямецка-фашыстскую літаратуру.

(а.с. 31, 32, 33, 194).

ДУШАЎСКАС-ДУЖ ў прад'яўленным яму абвінавачанні вінаватым сябе прызнаў.

(а.с. 64, 65, 66 – 70).

У злачыннай антысавецкай дзейнасці выкрываецца паказаннямі арыштаваных ЕЗАВІТАВА (а.с. 232 – 240), СТАНКЕВІЧА (а.с. 245 – 246), ЗАЙЦА (а.с. 251 - 254), КАРАВАЙЧЫКА (а.с. 266 – 270), РАДЗЕВІЧА (а.с. 274 – 278), ЛАСТОЎСКАГА (а.с. 295 – 303, 306), МЯДЗЕЛКІ (а.с. 307), ГАЎРЫЛІКА (а.с. 308), МУХА-МУХНОЎСКАГА (а.с. 309), КАХАНОВІЧА (а.с. 310), ЦВІКЕВІЧА (а.с. 311), архіўнымі матэрыяламі (а.с. 195 – 222), абзорамі архіўных дакументаў (а.с. 204, 205, 206, 221, 316 – 327, 328 – 335), даведкай цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літоўскай ССР (а.с. 338) і рэчыўнымі доказамі (а.с. 21, 194).

На аснове выкладзенага АБВІНАВАЧВАЕЦЦА:

ДУШАЎСКАС-ДУЖ Клаўдзіюс сын Стэпо, 1981 г. нараджэння, выхадзец г. Глыбокае, Полацкай вобласці, БССР, беларус, з сялян-сярэднякоў, службоўца, з вышэйшай адукацыяй, па спецыяльнасці інжынер-будаўнік, грамадзянін СССР, беспартыйны, жанаты, не асуджаны, да арышту працаваў галоўным іжынерам інстытута праектавання ў г. Каўнусе, пражываў у г. Каўнасе, па вул. Аўшрос, 47, кв. 4.

у тым, што:

З 1910 г. з'яўляючыся актыўным беларускім нацыяналістам, у 1919 г. узначаліў у г. Вільні беларускі нацыянальны рух. З'яўляючыся старшынёй антысавецкага нацыяналістычнага цэнта "Беларускі нацыянальны камітэт", праводзіў актыўную антысавецкую барацбу, накіраваную на адрыў Беларусі ад Савецкай Расіі і стварэнне так званай "незалежнай" буржуазна-нацыяналістычнай дзяржавы, аб чым вёў перамовы і прасіў паддтрымку ў главы польскага ўрада Пілсудскага і главы місіі ЗША ў Польшчы – МАРГЕНТАЎ.

У тым жа 1919 г. як упаўнаважаны прадстаўнік антысавецкага беларускага-эмігрантскага "ўрада" ЛУЦКЕВІЧА, выязжаў на канферэнцыю прыбалтыйскіх дзяржаў у г. Тарту, дзе ад удзельнікаў гэтай канферэнцыі дамагаўся прызнання "ўрада" ЛУЦКЕВІЧА і тады ж разам з беларускім нацыяналістам ЕЗАВІТАВЫМ прыняў на службу беларускага

эмігрантскага “ўрада” белагвардзейскага генерала БУЛАК-БУЛАХОВІЧА і яго бандыцкі атрад і падпісаў дамову з эстонскім урадам на ўтрыманне гэтага атрада.

У канцы 1919 г. увайшоў у зноўку сфармаваны антысавецкі буржуазна-нацыяналістычны”ўрад” ЛАСТОЎСКАГА на пасадзе міністра і статс-сакратара і да 1923 г. прымаў актыўны ўдзел у яго нацыяналістычнай дзейнасці.

З 1923 па 1927 г. разам з былым главой буржуазнага “ўрада” ЛАСТОЎСКІМ узначаліваў нацыяналістычную арганізацыю “Беларускі цэнтр дзеяння ў Літве” і выдаваў антысавецкі нацыяналістычны часопіс “Крывіч”.

У перыяд Айчыннай вайны і да арышту захоўваў антысавецкую літаратуру,

г. зн. у здзяйсненні злачынстваў, прадугледжанных арт. 58 п. 13 і 58-10 частка ІІ-я УК РСФСР.

Кіруючыся арт. 208 УПК РСФСР, следчая справа №19097 па абвінавачанню ДУШАЎСКАСА-ДУЖ Клаўдзіюса сына Стэпо праз Пракурора Літоўскай ССР накіраваць па падсуднасці.

Абвінаваўчае заключэнне складзена “12” красавіка 1952 г. у г. Вільня.

НАЧ. АДЗ. СЛЕДЧАСЦІ МДБ ЛССР
МАЁР (КАПЛАН)
“ЗГОДНЫ”:
ПАМ. НАЧ. СЛЕДЧАСЦІ МДБ ЛССР
МАЁР (ЦЫБАНАЎ)
НАЧ. СЛЕДЧАСЦІ МДБ ЛССР
ПАДПАЛКОЎНІК (МАРАКУЖАЎ)

<u>ДАВЕДКА:</u>

1. ДУШАЎСКАС-ДУЖ Клаўдзіюс сын Стэпо арыштаваны 28 лютага 1952 года і ўтрымоўваецца ва ўнутранай турме МДБ Літоўскай ССР.

2. Рэчавыя доказы прыцягнуты да справы.

3. Асабістыя дакументы ДУШАЎСКАСА-ДУЖ захоўваюцца ў пакеце пры справе.

НАЧ. АДЗ. СЛЕДЧАСЦІ МДБ
МАЁР (КАПЛАН)

“<u>12</u>” красавіка 1952 г.

**ДАДАТАК 4.**

**Фота К. Дуж-Душэўскага і К. Езавітава. г. Рыга. 25.12.1919 г.**



**ДАДАТАК 5.**

**Беларускія адрасы ў Коўна**

Адрас Дуж-Душэўскага К. – вул. Аўшрос, 47 – 4.

Адрас Ластоўскага В. – вул. Вітаўта, 30.

Адрас Рады БНР – вул. Вітаўта, 30.

Адрас Беларускага Культурна-Прасветнага Таварыства – Лайсвес алея, 26.

Адрас клуба “Беларуская хатка” – вул. Крашэўскага, 34.

pawet.net

## THE INVESTIGATIVE CASE OF K. DUZH-DUSHEUSKI (1940 – 1952) IN THE SPECIAL LITHUANIAN ARCHIVE AS A HISTORICAL SOURCE
## (summary)


The relevance of the research work lies in the lack of studies on Duzh-Dusheuski, as well as limited access to archives of investigative cases in Belarus. For this reason, given sources appear in the Belarusian historiography occasionally. The research object is the history of the Belarusian national movement. *The goal* is to evaluate archive materials of the K. Duzh-Dushevskaga's investigative case as a source of the Belarusian national movement history of the first half of the twentieth century.

To reach the goal the author has set itself three objectives: to characterize the phenomenon of a historical source, indicating peculiarities of archives of investigative cases, to identify opportunities of archives of the investigative case as sources for the study of life and work of K. Duzh-Dusheuski; to identify opportunities of archives of the investigative case as a source on the history of the Belarusian national movement during the interwar period. Through the use of methods of analysis, the comparative method, the critical method, as well as the methodological approach of Mark Block, it has been concluded that the archives of the K. Duzh-Dushevuski investigative case is a valuable source for studying the history of the Belarusian national movement of the first half of the twentieth century. The review of archive materials of the K. Duzh-Dusheuski investigative case has showed that this source contains a large amount of materials for study. Review and analysis of Klaudzij Duzh-Dusheuski's biographical information allowed showing that the archives of the investigative case contain sufficient information about his life and work. Materials of the case allow us not only to confirm the well-known information from the biography of Duzh-Dusheuski, but also to get acquainted with new, before unknown facts of his life. The description and assessment of information on the history of the Belarusian national movement in Lithuania, which materials of archives of the investigative case contain, also let us speak about its value. Together with the data that confirms the information about BNR Rada and Belarusian organizations in Lithuania, which was well known before in scholarship, we can learn several new details and facts.

The facts given in the materials of the case are new in the Belarusian historiography and pose many questions for further studies. With all criticism of archives of the K. Duzh-Dusheuski investigative case it still stands out as a relevant and unique source for a historical study of the Belarusian national movement of the first half of the twentieth century. Presented undergraduate thesis may be useful to students and to anyone, who is interested in studying this problem.